ЧАСОПІС ДЛЯ ВАС

№5 (1004), МАЙ, 2017
Беларусь. Belarus

# БЕЛАРУСЬ

Палітыка, эканоміка, культура

ISSN 0320-7544




# ПАМЯЦЬ НАЗАЎЖДЫ

INTERNATIONAL
The Minsk Times
Socio-political Weekly

Пра падзеі ў Беларусі і свеце

Штотыднёвік, які чытаюць у арыгінале

Не спазніцеся аформіць падпіску
Індэксы: ведамасны — 637302, індывідуальны — 63730

# ЗМЕСТ





**6** **Разам можна зрабіць больш** Прэзідэнты Беларусі і Украіны прынялі ўдзел у мерапрыемствах, прымеркаваных да чарговых угодкаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС

**9** **“Зялёныя” праекты ПРААН**

**10** **Пасланне Прэзідэнта**






**12** **Сяброўства з гадамі толькі мацнее** У першыя дні мая праходзіў першы ў гісторыі беларуска-кітайскіх адносін прэс-тур прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі КНР

**20** **Лекі “друкуе” 3D-прынтар**

**26** **Унушальная вага даходлівага слова** Новыя фарматы, тэхналогіі будучыні ды шырокая геаграфія ўдзельнікаў — гэтым і не толькі здзіўляла XXI Міжнародная выстава “СМІ ў Беларусі”

**28** **Пісьмы далёкай пары** Мы адзначылі 72-ю гадавіну Вялікай Перамогі...

**30** **Мір на зямлі — найвялікшая каштоўнасць**

**34** **Вандроўка пакідае ўражанне** У Гродне турфірмы актыўна пераключаюцца на ўязны турызм

**36** **Годныя сусветнага прызнання** Беларускія помнікі архітэктуры могуць папоўніць спіс ЮНЕСКА

**42** **Аксана Кірылюк: “Жадаеце свежасці — я выкую вам вецер...”**

**48** **І радуюць, і натхняюць...** Апошнія прэм’еры — два оперныя спектаклі “Чароўная флейта” Вольфганга Амадэя Моцарта і “Сельскі гонар” П’етра Масканьі занялі годнае месца ў рэпертуары Вялікага тэатра Беларусі






**Беларусь. Belarus**

Штомесячны часопіс

**№ 5 (1004), май, 2017**
Выдаецца з 1930 года.

**Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 8.**
Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:**
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “Рэдакцыя газеты “Советская Белоруссия”, ААТ “Белзнешэканамбанк”

**Рэдактар**
Віктар Харкоў

**Адказны сакратар**
Валянціна Ждановіч

**Дызайн і вёрстка:**
Вадзім Кандрашоў
Надзея Панкратава

**“Беларусь.Belarus”** выходзіць на беларускай, англійскай, іспанскай, кітайскай і польскай мовах.

Часопіс распаўсюджваецца ў 50 краінах свету.

За дакладнасць фактаў, іх інтэрпрэтацыю адказнасць нясуць аўтары публікацый. Пры выкарыстанні матэрыялаў часопіса спасылка на **“Беларусь. Belarus”** абавязковая. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных паведамленняў.

**Выдавец:**
Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “Рэдакцыя газеты “Советская Белоруссия”.
Вул. Б. Хмяльніцкага, 10ª,
220013, Мінск.

Часопіс надрукаваны ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве “Выдавецтва “Беларускі Дом друку”. Паліграфічная ліцэнзія №02330/106 ад 30.04.2004.
Пр-т Незалежнасці, 79,
г. Мінск, Беларусь, 220013

Падпісана ў друк 23.05.17 г.
Выпуск у свет 30.05.17 г.

Афсетны друк. Папера крэйдаваная. Фармат 60x90 1/8.
Друкаваных аркушаў 7.
Гарнітура Міньён.

**Заказ № 1274**
**Агульны тыраж** — 2341 экз.
(на беларускай мове — 184)

**Адрас рэдакцыі:**
вул. Кісялёва, 11, г. Мінск, Беларусь, 220029.
Тэл.: +375 (17) 290-62-24,
+375 (17) 290-66-45.
Тэл./факс: +375 (17) 290-68-31.

**E-mail:** belmag@sb.by
**Падпісны індэкс** — 74820.

**Цана дамоўная.**


© **“Беларусь. Belarus”**, 2017

# Быў месяц май…

Семдзясят два гады — многа гэта ці мала? Як паглядзець. Між іншым, гэта цэлае жыццё. Але нават сямідзесяцігадовыя, што вельмі радуе, не зведалі жахаў той страшэннай вайны, якую мы ўзгадваем, калі святкуем Вялікую Перамогу.

Так, ёсць падзеі, якія не абясцэньвае час. Да такіх, без сумнення, належыць Дзень Перамогі 9 Мая. Што б ні адбылося ў сучасным свеце, значнасць гэтай даты не падлягае ніякай дэвальвацыі. Памяць пра подзвіг савецкага салдата па-ранейшаму ўстойлівая і моцная.

Цяжкім катком пракацілася Вялікая Айчынная па беларускай зямлі. Тут загінула каля трох мільёнаў чалавек, былі разбураны дзясяткі гарадоў, гарадскіх пасёлкаў і райцэнтраў, тысячы сёл і вёсак. Амаль паўмільёна беларусаў былі сагнаныя ў рабства ў Германію. За гады акупацыі на тэрыторыі Беларусі нацысты стварылі дзясяткі лагераў смерці, сотні турмаў і гета, дзе загінула некалькі сотняў тысяч старых, жанчын і дзяцей. Такое не забываецца.

Не дзіўна, што менавіта тут разгарнуўся небывалы ў сусветнай гісторыі рух супраціўлення. Народныя мсціўцы не давалі ворагу спакою ні днём, ні ноччу. Больш за паўтара мільёна ўраджэнцаў Беларусі ваявала на франтах Вялікай Айчыннай. Беларусы стаялі насмерць пад Масквой, Ленінградам, Сталінградам і Кіевам, удзельнічалі ў вызваленні вёсак і гарадоў сваёй Радзімы, а таксама дзяржаў Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. Каля чатырохсот выхадцаў з Беларусі сталі генераламі і адміраламі, камандавалі падчас вайны злучэннямі арміі і флоту. За праяўлены гераізм і доблесць пры абароне Айчыны ў гады вайны 448 беларусаў удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза, чацвёра з іх — двойчы.

У гады вайны краіна страціла кожнага трэцяга свайго жыхара. Такая цана свабоды. Мы пра гэта памятаем. Але няхай ведаюць і іншыя.



Дарэчы, пасля Другой сусветнай вайны Беларусь стала адной з заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Далёка не кожная дзяржава атрымлівае такое права. На карысць Беларусі — тады адной з рэспублік Савецкага Саюза — такі выбар быў зроблены якраз за вялікі ўклад у разгром фашызму. Аб'ектыўна і па заслугах.

Так, май — асаблівы месяц. Гэта месяц перамогі над нацызмам у Другой сусветнай вайне. У Беларусі подзвіг салдата трапятліва шануецца. У краіне ўсё яшчэ пражывае каля адзінаццаці тысяч ветэранаў Вялікай Айчыннай. Так, з кожным годам іх становіцца ўсё менш. Але ветэраны па-ранейшаму акружаныя ўвагай дзяржавы. Пра гэта неабходна абавязкова сказаць на фоне зняважэння пераможных сімвалаў у асобных краінах. У нас свята Перамогі — свяшчэннае, таму што фактычна ў кожнай сям'і, праз блізкіх, Вялікая Айчынная вайна пакінула свой след.

Уласна, ці многія сучасныя падлеткі заспелі ў жывых герояў той вайны? Што яны думаюць пра яе? Можна было б прывесці нямала прыкладаў, калі зусім юныя хлопцы і дзяўчаты самазабыўна вялі пошук загінулых у вайну салдат, аднаўлялі імёны невядомых, бралі шэфства над ветэранамі. Яны памятаюць і ведаюць пра вайну. Яны паважаюць пераможцаў.

Час ідзе, і свет, або яго канфігурацыя, як гавораць палітыкі, змяняецца. Але сапраўдныя каштоўнасці не падлягаюць перагляду. Беларусь будуе свае ўзаемаадносіны з іншымі краінамі на прынцыпах добрасуседства. Гэта і ёсць яе сучаснае палітычнае крэда.

Сёння трэба больш партнёрства: паміж людзьмі, паміж краінамі. У гэтым — стратэгічная сутнасць міжнароднага супрацоўніцтва: адзіна правільная і актуальная. На яе арыентуецца і Беларусь у сваёй знешняй палітыцы. У цэлым жа яе палітычныя прыярытэты раскрыты ў штогадовым пасланні Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу. Публікацыя вытрымак з паслання дасць магчымасць чытачу лепш зразумець пазіцыю краіны, якая імкнецца да паўнапраўнага ўзаемадзеяння ў свеце і адкрытая для самых шырокіх кантактаў.

**ВІКТАР ХАРКОЎ**




БЕЛТА

# Ніхто не здолее адабраць ВЯЛІКУЮ ПЕРАМОГУ!

Раніца 9 мая выдалася прахалоднай. Але настрой свята ўзяў верх, і прырода быццам падпарадкавалася яму. Падчас цырымоніі ўскладання вянкоў над плошчай Перамогі ў Мінску неба праяснілася. Выглянула сонца...

Да прыбыцця на месца ўрачыстасцяў Прэзідэнта я размаўляў з ветэранамі, якія сабраліся тут:

— Не зябка?

— Зябка ў сырых акопах чакаць загаду аб наступленні...

Яны дачакаліся гэтага загаду. Выступілі і перамаглі... Інакш не было б гэтага свята. Не было б нічога з таго, што кожны з нас сёння мае. А хутчэй за ўсё, не было б і нас саміх...

Прэзідэнт усклаў вянок да манумента Перамогі. Метраном метадычна адлічыў мінуту маўчання.

Мы памятаем...

Падчас мерапрыемства Аляксандр Лукашэнка як заўсёды пагутарыў з замежнымі дыпламатамі. Падзялюся назіраннем. Глабальныя лініі геапалітыкі часам мудрагелістыя, а вось у простых зносінах паслы і аташэ нібы адкрываюць душу. Яны шчыра віншавалі беларусаў з нашым вялікім святам.

Дзякуй, што нашу радасць падзяляюць партнёры з многіх, самых розных краін.

Святочныя мерапрыемствы прадоўжыліся ў Мінску да позняга вечара, калі манумент Перамогі літаральна патануў у кветках. Фінальным пунктам стаў маляўнічы канцэрт тэлепраекта “Плошча Перамогі-2017” і традыцыйны святочны салют. З Вялікай Перамогай!

**Падчас урачыстых мерапрыемстваў на плошчы Перамогі Прэзідэнт таксама пагутарыў з журналістамі. Вось пра што ён, у прыватнасці, сказаў:**

## Пра ўрокі гісторыі

— Хоць гэта і нясціпла прагучыць, але мы нядрэнныя вучні. Мы памятаем, што было ў нашай гісторыі. Мы ведаем прычыны тых няўдач, якія складваліся на першых этапах вайны. Мы гэтую чашу выпілі спаўна. Мы вывучылі гэтыя ўрокі і разумеем, што порах трэба трымаць сухім. Але ў мірны час гарматы павінны быць зачахлёныя. Расчахляць іх можна толькі на вучэннях. Што мы, дарэчы, і робім...

Самае галоўнае для нас, якія б падзеі ні адбываліся, — гэта эканоміка. Будзе нармальна развівацца краіна — мы забяспечым і мір, і бяспеку, і ўнутраную стабільнасць. Наш народ можа за гэта абсалютна не перажываць. У нас ёсць сёння ўсё, каб абараніць наш кавалак зямлі, на якім жывуць нашы людзі...

Мы ўжо ў трэці раз літаральна за два дзесяцігоддзі рэфармуем, перабудоўваем, удасканальваем нашы Узброеныя Сілы. Прыстасоўваем іх да магчымых негатыўных падзей. Высновы робім, атрымліваем урокі з таго, што адбываецца ў свеце. А свет вельмі неспакойны. Ідуць войны. Мы ўважліва назіраем за тым, што адбываецца, робім высновы і ў сувязі з гэтым прыстасоўваем свае Узброеныя Сілы для абароны нашай Айчыны...

Галоўнае, каб у нас заўсёды было адзінства ўнутры краіны. Будзе яно — справімся з любымі пагрозамі.

## Пра развіццё

— Маленькіх, сярэдненькіх гарадкоў у нашай краіне безліч. Мы прывялі ў парадак Мінск, абласныя, раённыя цэнтры, аграгарадкі. Цяпер рухаемся на ўскраіны. Засталіся невялікія вёсачкі, якія раней былі цэнтрамі калгасаў і саўгасаў. Можа, некаторыя і неперспектыўныя. Але іх трэба прыводзіць у парадак. Калі людзі будуць там жыць, мы абавязкова адрамантуем, мадэрнізуем інфраструктуру пад іх...

Так будзем рабіць па ўсёй краіне... Трэба зрабіць усё, каб нармальна жылі сем'і, у якіх ёсць дзеці. Трэба падвезці іх у школу — мы будзем гэта рабіць. Тым больш што праграму "Школьны аўтобус" ужо вырашылі. Трэба падвесці дарогі да тых вёсак, дзе жывуць людзі. На гэта нацэлена і праграма па развіцці сеткі мясцовых дарог. З гэтага года мы вельмі шмат увагі будзем надаваць гэтым дарогам, і, думаю, за тры-чатыры гады мы вырашым гэтую праблему.



## Выступленне Прэзідэнта Беларусі на цырымоніі ўскладання вянкоў да манумента Перамогі з нагоды 72-й гадавіны Вялікай Перамогі

Дарагія ветэраны!

Паважаныя суайчыннікі і замежныя госці!

У нашай гісторыі нямала лёсавызначальных дат. Але 9 мая 1945 года асаблівы дзень — Дзень Вялікай Перамогі. Яна заваявана савецкім народам у самай страшнай вайне, бязлітаснай вайне з фашызмам. Свет быў выратаваны ад карычневай чумы велізарнай цаной. За гады вайны Беларусь страціла трэць свайго насельніцтва. У адным толькі лагеры смерці "Трасцянец" пад Мінскам фашысты знішчылі звыш двухсот тысяч чалавек. А колькі людзей загінула ў спаленых карнікамі вёсках і разбураных гарадах?!

Нашай краіне быў нанесены незаменны матэрыяльны ўрон: знішчаны тысячы прадпрыемстваў, школ, музеяў, бібліятэк, храмаў. Мы страцілі больш за палову свайго нацыянальнага здабытку.




Злачынствы нямецка-фашысцкіх захопнікаў з памяці людзей не выкрасліць. Гэта павінны ведаць у тым ліку і тыя, хто сёння робіць спробы перапісаць гісторыю, адабраць у нашага народа Вялікую Перамогу. Дапусціць гэтага мы не можам. І ніколі не перастанем схіляцца перад мужнасцю сваіх землякоў, якія прайшлі праз страшэнны агонь вайны. Яны не сталі на калені перад захопнікамі. Супраць прыгнятальнікаў падняліся і стары і малы. Сотні тысяч партызан і падпольшчыкаў грамілі ворага на кожным кавалачку беларускай зямлі. Такое моцнае супраціўленне акупантам стала рэальным укладам у разгром фашызму і вызваленне Беларусі. З першых дзён вайны сыны і дочкі Беларусі гераічна змагаліся на франтах. Славутыя старонкі ў ваенны летапіс упісалі байцы пагранічных застаў, бессмяротны гарнізон Брэсцкай крэпасці, абаронцы Магілёва, падпольшчыкі Мінска, Оршы, іншых гарадоў, удзельнікі легендарнай аперацыі "Баграціён" ды іншых важнейшых бітваў Вялікай Айчыннай. Тут, у самым сэрцы горада-героя Мінска, на плошчы Перамогі знаходзяцца капсулы з зямлёй гарадоў-герояў: Масквы, Ленінграда, Смаленска, Тулы, Сталінграда, Кіева, Севастопаля, Керчы, Адэсы, Мурманска, Новарасійска. У кожным з іх пралівалі кроў нашы землякі. Мужнасць і адвагу яны праявілі ў бязлітасных баях за вызваленне Варшавы, Будапешта, Прагі, Бухарэста, Вены і Берліна.

Радзіма высока ацаніла ўклад беларусаў у агульную перамогу. Вышэйшай узнагароды — звання Героя Савецкага Саюза — удастоіліся больш як чатырыста сорак нашых землякоў, а ордэнаў і медалёў — звыш трохсот тысяч. Многія, на жаль, пасмяротна.

Вечная слава героям! Вечная памяць тым, хто аддаў жыццё за свабоду Айчыны! Давайце ж разам з вамі ў гэтыя ўрачыста-трагічныя хвіліны ўшануем іх памяць мінутай маўчання.

Нацысты ператварылі наш квітнеючы край у руіны. Каб адрадзіць Беларусь з попелу, спатрэбілася яшчэ адна цяжкая бітва. Цяпер ужо з разрухай і голадам. Самаадданасць, гераізм людзей, з'яднанасць і братэрская дапамога саюзных рэспублік зрабілі, здавалася б, немагчымае. За кароткі тэрмін мы аднавілі заводы і фабрыкі, узвялі новыя, арганізавалі сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, пабудавалі школы, ВНУ, бібліятэкі, тэатры і музеі. Пакаленне пераможцаў стварыла магутны эканамічны і культурны патэнцыял. Гэта стала асновай далейшага развіцця нашай краіны.

Мы шчаслівыя, што нашы дарагія ветэраны вайны і працы сёння знаходзяцца сярод нас. Усё, што вы зрабілі для Радзімы, ніколі не будзе забыта. Вашы здзяйсненні назаўсёды занялі самае пачэснае месца ў айчыннай гісторыі. На вашым прыкладзе вучацца і будуць вучыцца ўсе пакаленні беларусаў. Паколькі не можа быць нічога больш дастойнага, чым ахвярны подзвіг у імя свабоды і незалежнасці.

З цягам часу мы разумеем гэта ўсё вастрэй. Асабліва сёння, калі вас, дарагія ветэраны, становіцца ўсё менш і менш і калі ўзрастае міжнародная напружанасць, адраджаюцца ідэі сусветнага панавання. У розных рэгіёнах планеты палаюць узброеныя канфлікты.

Чалавецтва аказалася ля небяспечнай мяжы новай вялікай вайны. Пагрозы зведвае і наша Беларусь. Каля нашых граніц накопліваюцца ваенныя арсеналы. Літаральна па суседстве — у былых савецкіх рэспубліках — размяшчаюцца ваенныя базы, праводзяцца баявыя вучэнні і манеўры. З дапамогай нашай унутранай "пятай калоны" робяцца спробы дэстабілізаваць абстаноўку ўнутры краіны. Таму асаблівую значнасць набываюць пільнасць і забеспячэнне бяспекі дзяржавы. Як зрэнку вока неабходна берагчы мір і згоду ў нашым родным доме. Мы павінны быць такія ж адзіныя і цвёрдыя, як нашы бацькі, дзяды і прадзеды ў час суровых выпрабаванняў. Тады ніхто не асмеліцца праверыць нас на трываласць. Мы проста ў імя памяці тых соцень тысяч загінулых на франтах, той трэці насельніцтва нашай краіны, якую мы страцілі, павінны берагчы мір і спакой на нашай зямлі. Гэта будзе найвялікшы падарунак не толькі жывым ветэранам, але і — самае важнае — тым, хто аддаў жыццё за ўсё тое, чым мы сёння карыстаемся.

З нашай зямлі ніколі не ішла і не будзе ісці агрэсія. Мы даказалі ўсім, што Беларусь — мірная і дружалюбная краіна. Але гэта не значыць, што яна не можа за сябе пастаяць. Так, чужога нам не трэба, але і свайго мы не аддадзім! Так навучылі нас нашы гераічныя продкі. І мы будзем верныя іх святому запавету. Шчасця і міру вам, дарагія сябры, дарагія суайчыннікі і госці нашай Беларусі! Са святам Вялікай Перамогі!

**9 мая 2017 года**



РЭЙТЭР

Пётр Парашэнка і Аляксандр Лукашэнка падчас візіту на Чарнобыльскую АЭС

# Разам можна зрабіць больш

## Прэзідэнты Беларусі і Украіны прынялі ўдзел у мерапрыемствах, прымеркаваных да чарговых угодкаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС

Жалобная дата 26 красавіка назаўжды ўвайшла ў наш каляндар як сінонім трагедыі і чалавечага гора, але адначасова і сімвал вялікай мужнасці. Трыццаць адзін год назад Беларусь накрыла радыеактыўнае воблака Чарнобыля. Мала хто верыў тады, што беларусы справяцца з выпрабаваннем, якое навалілася на іх. Але яшчэ ў 1990-я гады Аляксандр Лукашэнка прыняў цвёрдае рашэнне: пацярпелыя землі трэба адрадзіць. Кожны год у гэтыя красавіцкія дні Прэзідэнт асабіста ацэньвае, як выконваюцца яго даручэнні. Дэзактывацыя глебы, стварэнне новых вытворчасцяў, газіфікацыя, будаўніцтва дарог, жылля, школ, бальніц, спартыўных цэнтраў — усё гэта робіцца для таго, каб людзі ў пацярпелых раёнах маглі жыць звычайным жыццём. Сеяць хлеб, будаваць дамы, нараджаць дзяцей.

26 красавіка — драматычная дата не толькі ў гісторыі Беларусі. Аварыя — бяда і для Украіны. Радыенукліды не

ведаюць межаў. Сёння абедзве дзяржавы імкнуцца разам пераадольваць наступствы катастрофы на ЧАЭС. Таму наведванне прэзідэнтамі дзвюх краін Чарнобыльскай станцыі і размешчаных побач з ёй аб'ектаў было заканамерным і сімвалічным.

Станцыя знаходзіцца ўсяго за 11 кіламетраў ад беларускай мяжы. Ад гэтых думак нават крыху не па сабе. Але калі бачыш новае ўкрыцце над разбураным чацвёртым энергаблокам, ад сэрца адлягае.

— Ды вы не турбуйцеся, узровень радыяцыі тут не вышэйшы, чым у Мінску, — супакойвалі супрацоўнікі станцыі.

І гэта сапраўды так. Перакрыцці і сцены пабудаванага ў спешцы адразу пасля аварыі ўкрыцця аварыйнага рэактара з часам пачалі разбурацца. Таму ў Кіеве вырашылі пабудаваць больш дасканалую ахоўную сістэму. Так з'явіўся новы аб'ект — "Укрыцце-2", які агледзелі прэзідэнты. Аляксандр Лукашэнка ўзвядзенне саркафага назваў доўгачаканай падзеяй для беларусаў, украінцаў і ўсёй Еўропы:

— Гэта ўнікальнае збудаванне, якому на сёння няма роўных. Больш за тое, будаўніцтва аб'екта пры падтрымцы 40 краін — важны сімвал міжнароднай салідарнасці.

Тэрмін службы новага саркафага разлічаны на сто гадоў. Па мерках чалавечага жыцця, не так ужо мала. Але месэдж Аляксандра Лукашэнкі надзвычай просты і канкрэтны: мы павінны думаць пра будучыя пакаленні. Для гэтага трэба не шкадаваць інвестыцый у чалавечыя рэсурсы, сучасную вытворчасць і тэхналогіі. Украіна цяпер распрацоўвае новую стратэгію пераадолення наступстваў чарнобыльскай катастрофы. Наша краіна ўжо прайшла вялікі шлях у гэтым напрамку і гатовая дзяліцца досведам і ведамі.

— Намі рэалізаваны шэраг сумесных мерапрыемстваў у галіне радыеэкалагічнага маніторынгу, сельскай і лясной гаспадаркі. Аднак патэнцыял супрацоўніцтва Беларусі і Украіны выкарыстоўваецца далёка не ў поўным аб'ёме. Нашы навукоўцы, медыкі, эколагі могуць і павінны зрабіць значна больш, — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Сёння Украіна перажывае няпростыя часы. Пётр Парашэнка шмат гаварыў пра набалелае. Пра тое, што мінскія пагадненні павінны выконвацца, а мяжа паміж Украінай і Беларуссю павінна заставацца мяжой міру і дружбы. Зрэшты, у Кіева няма ніякіх падстаў у тым сумнявацца. Аляксандр Лукашэнка сказаў пра гэта прама:

— Украінцы ніколі не былі для беларусаў чужымі. Падабаецца гэта камусьці ці не, але мы родныя людзі, і ніхто нас не зможа раздзяліць. У нас цудоўная залатая зямля, і мы заўсёды будзем жыць як добрыя суседзі.

Прэзідэнты наведалі таксама памятны мемарыял "Сцяна памяці". Кожны год 26 красавіка тут гучыць памінальны набат. Аляксандр Лукашэнка і Пётр Парашэнка ўсклалі кветкі да мемарыяла і ўшанавалі хвілінай маўчання памяць ліквідатараў аварыі на ЧАЭС. Затым прэзідэнты працягнулі дружалюбныя зносіны, але ўжо на беларускай зямлі.

Аграгарадок Ляскавічы добра вядомы ўкраінцам. Менавіта тут у сакавіку 2014 года праходзіла сустрэча Прэзідэнта Беларусі з выконваючым абавязкі Прэзідэнта Украіны, старшынёй Вярхоўнай Рады Аляксандрам Турчынавым. Гэтым разам кіраўнікі дзвюх дзяржаў наведалі ляскавіцкі храм Святога Архангела Міхаіла, дзе прынялі ўдзел у чарнобыльскай малітве. Пасля выйшлі да мясцовых жыхароў, якія чакалі прэзідэнтаў, нягледзячы на надвор'е, якое рэзка сапсавалася.

— Сёння для нашых народаў вельмі цяжкі, але памятны дзень, дзень з вялікім сэнсам, — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да прысутных. — Мы з Пятром Аляксеевічам пабывалі на чарнобыльскай станцыі, паглядзелі тую грандыёзную работу, якая была ажыццёўлена ўкраінскай дзяржавай разам з яе партнёрамі. Яны зрабілі ўсё для таго, каб мінімізаваць страшныя наступствы чарнобыльскай катастрофы.

Прэзідэнт сказаў пра галоўную задачу:

— Мы заклапочаныя адным — як захаваць жыццё ў гэтых раёнах. Каб жыццё там было такім жа камфортным і бяспечным, як у гэтым выдатным месцы — Ляскавічах. А калі я ўпершыню сюды прыехаў, тут былі пяскі. І самае страшнае — людзі прасілі хлеба! І я даручыў ваенным, каб яны неадкладна перакінулі на Палессе армейскія кухні. Праз два гады праблем са свежым хлебам у Ляскавічах ужо не было.

Пётр Парашэнка з разуменнем ківаў. І звярнуўся да прысутных са словамі падзякі за гасціннасць, якую ён адчуў на беларускай зямлі:

— Хачу заявіць аб тым, што ўкраінскі і беларускі народы — абсалютна ўнікальныя. І тое пачуццё дружбы, даверу, добрасуседства, якое мы адчуваем на кожным кроку — а Аляксандр Рыгоравіч адчуваў ва Украіне, — паказвае: як

Аляксандр Лукашэнка:

***— З тымі праблемамі, якія ў нас ёсць, мы справімся. Ёсць, вядома, шэраг пытанняў, якія трэба вырашыць. Спецыялісты і члены ўрадаў з намі. Мы гатовы, абмеркаваўшы, прыняць канкрэтныя рашэнні. Хачу запэўніць: усе рашэнні будуць няўхільна выконвацца з беларускага боку. Тут нашы карані. Аб'ядноўвае нас гэтая цудоўная, дзівосная, наравістая рака — Прыпяць...***

Пётр Парашэнка:

***— Мы паглядзелі на сацыяльныя стандарты ў людзей, якія жывуць на Палессі: як павінна быць зроблена дарога, які павінен быць клуб, якія павінны быць магазіны, што павінна быць па спорце, культуры. Гэта мэта нашай работы — працаваць, каб людзям лепш жылося. Мы надзвычай удзячныя вам за жорсткую і цвёрдую пазіцыю па адстойванні адкрытасці беларускага рынку для ўкраінскіх тавараў. Гэта прынцыповая пазіцыя надзейнага саюзніка, партнёра і сябра***

зрэнку вока трэба захоўваць гэты мір і гэтую дружбу. Менавіта ўкраінцы і беларусы з дапамогай нашых партнёраў па ўсім свеце абаранілі тады яшчэ сваю адзіную краіну ад атама. І дазволілі нам праз 31 год прадэманстраваць рашучыя крокі па адраджэнні Палесся.

Пры гэтым украінскі Прэзідэнт сказаў пра агульны клопат кіраўнікоў дзвюх краін: што зрабіць для таго, каб нашым народам жылося лепш? Вялікае пытанне, але адказ на яго часткова быў дадзены тут жа:

— Вельмі важныя крокі мы ўжо прадпрымаем. Тавараабарот за 2 месяцы гэтага года вырас на 40 працэнтаў! Украінцы купляюць беларускія харчовыя тавары, трактары і аўтамабілі, нафтапрадукты, а беларусы купляюць прадукцыю сельскай гаспадаркі, хімічнай прамысловасці, чорнай металургіі Украіны. Мы дамовіліся, што зробім больш простымі і паездкі адзін да аднаго. Мяжа павінна быць сімвалам міру, дружбы, таварыскіх і партнёрскіх адносін паміж нашымі краінамі. І мы з нецярпеннем чакаем у госці кожнага з вас.

Пётр Парашэнка расказаў таксама, што абмяркоўваў з Аляксандрам Лукашэнкам узровень сацыяльных стандартаў у беларускай вёсцы:

— Гэта вельмі важна. Тут ёсць чаму павучыцца і што скапіраваць. Мы дамовіліся, як будзем узаемадзейнічаць у энергетыцы, якім чынам будзем каардынаваць нашы намаганні пры выхадзе на рынкі трэціх краін. І мы зробім усё магчымае для таго, каб рэалізаваць гэты патэнцыял.

Зносіны кіраўнікоў дзяржаў працягнуліся ў фармаце адзін на адзін. Перад тым як адасобіцца для важнай гутаркі з Пятром Парашэнкам, Аляксандр Лукашэнка сціслa сказаў пра яе сутнасць:

— Будзем абмяркоўваць праблемы, каб жыццё было лепшым і для ўкраінцаў, і для беларусаў. Асабліва ў памежжы.

Вядома ж, тэм для давернай размовы кіраўнікоў дзвюх краін нямала. Але сёння ў цэнтры ўвагі пытанні паляпшэння сітуацыі ў пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС раёнах. Так, яна прыкметна палепшылася. Але і праблемныя моманты яшчэ ёсць. Аднак, як паказалі тры дзесяцігоддзі барацьбы з наступствамі чарнобыльскай катастрофы, разам нам пад сілу пераадолець любыя цяжкасці.

**Па выніках перагавораў з Прэзідэнтам Украіны Аляксандр Лукашэнка зрабіў шэраг заяў. У прыватнасці, ён расказаў:**

## Пра гуманітарную дапамогу Украіне:

— У бліжэйшы час пры садзейнічанні Міжнароднага Таварыства Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца Беларусь плануе накіраваць гуманітарную дапамогу насельніцтву Украіны, якое пражывае па абодва бакі лініі размежавання. Падтрымаем самым неабходным — прадуктамі і сродкамі гігіены.

## Пра сумесныя прадпрыемствы:

— Мы дамовіліся па-новаму паглядзець на вытворчую кааперацыю, актывізаваць работу па стварэнні новых сумесных прадпрыемстваў у самых розных галінах эканомікі. Беларусь гатова павялічыць пастаўкі ва Украіну аўтамабільнай і сельскагаспадарчай тэхнікі, угнаенняў і будматэрыялаў. У сваю чаргу мы зацікаўлены ў закупах вырабаў з металу, прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі.

## Пра двухбаковыя кантакты:

Прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка запрасіў Аляксандра Лукашэнку здзейсніць улетку афіцыйны візіт ва Украіну. Прэзідэнт Беларусі рэагаваў:

— Падчас перагавораў дасягнута дамоўленасць актывізаваць работу міжурадавай камісіі. Тут давядзецца вельмі шмат папрацаваць спецыялістам і экспертам, таму што ўлетку мы маем намер у Кіеве правесці чарговую сустрэчу, на якой прымем рашэнне па тых пытаннях, па якіх намечаны планы.

# "Зялёныя" праекты ПРААН



Адкрыццё першага ў Беларусі рэгіянальнага ляснога экалагічнага адукацыйнага цэнтра на тэрыторыі парку "Горні" ў Лідскім раёне Гродзенскай вобласці. Новы цэнтр дапаможа захаваць унікальны дэндрапарк, стварыць умовы для развіцця экатурызму і навучання ўстойліваму лесакарыстанню

**У межах Рэспубліканскага экалагічнага форуму, які праходзіў у Віцебску, Праграма развіцця ААН прадставіла праекты экалагічнай скіраванасці, рэалізуемыя ў Беларусі**

Цэнтральнае месца ў экспазіцыі ПРААН занялі праекты "Кліма-Іст" і "Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да "зялёнай" эканомікі", што фінансуюцца Еўрапейскім саюзам.

На стэндзе праекта "Кліма-Іст" удзельнікам і гасцям форуму былі прадэманстраваны ўзоры сабранай у заказніках "Спораўскі" і "Званец" біямасы, якая можа быць выкарыстана ў якасці экалагічнага паліва, часткова замяшчаючы вуглевадародную сыравіну, а таксама можа прымяняцца ў будаўнічым сектары.

У сваю чаргу праект "Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да "зялёнай" эканомікі" прадставіў пілотную ініцыятыву па стварэнні ўмоў для вытворчасці і замяшчэння экалагічна небяспечных ахаладжальных вадкасцяў на экалагічна бяспечны аналаг айчыннай вытворчасці. Ініцыятыву рэалізуе інфармацыйна-кансультацыйная ўстанова "Садзейнічанне развіццю бізнесу". У рамках гэтага ж праекта Беларускае грамадскае аб'яднанне "Адпачынак у вёсцы" прадставіла ініцыятыву па стварэнні Цэнтра міфалагічнага турызму ў Бярэзінскім біясферным запаведніку.

Акрамя таго, падчас круглага стала, які адбыўся на форуме, быў прэзентаваны спецкурс "Кіраванне "зялёным" развіццём нацыянальнай эканомікі", распрацаваны Аленай Дорынай, доктарам эканамічных навук, загадчыцай кафедры нацыянальнай эканомікі і нацыянальнага кіравання Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. Гэты спецкурс уласна з'яўляецца складовай часткай рэалізацыі праекта "Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да "зялёнай" эканомікі".

На круглым стале таксама адбылася прэзентацыя Міхаіла Максіменкава, навуковага каардынатара праекта "Кліма-Іст", якая была прысвечана патэнцыялу балотных тэрыторый, тэхніцы, неабходнай для высечкі драўнінна-хмызняковай расліннасці, кашэння травы, трыснягу і выкарыстання біямасы ў энергетычных, будаўнічых ды іншых мэтах.

Удзельнікі форуму пазнаёміліся з іншымі дасягненнямі праектаў ПРААН, накіраваных на ўкараненне перадавых экалагічных рашэнняў у такія сферы, як энергетыка, арганічная сельская гаспадарка, біялагічная разнастайнасць, жыллёва-камунальная гаспадарка, кіраванне воднымі рэсурсамі, абыходжанне з адходамі ды інш. Аб'яднаўчымі тэмамі ўсіх гэтых напрамкаў з'яўляецца менавіта "зялёная" эканоміка.

Усяго ў сапраўдны момант у "зялёным партфелі" ПРААН у Беларусі налічваецца восем праектаў, што рэалізуюцца пры фінансавай падтрымцы ЕС, GEF, Coca-cola ды іншых донараў. У іх ліку — такія маштабныя праекты, як "Кліма-Іст", "Тарфянікі-2", "Энергаэфектыўнасць у будынках", "Зялёныя гарады", "Энергаэфектыўнасць у школах", "Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да "зялёнай" эканомікі".

Варта адзначыць, што форум у Віцебску быў арганізаваны дзякуючы праекту міжнароднай тэхнічнай дапамогі "Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да "зялёнай" эканомікі", фінансуемага Еўрапейскім Саюзам і рэалізуемага Праграмай развіцця Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі. Гэты праект садзейнічае таму эканамічнаму росту краіны, які заснаваны менавіта на "зялёных" прынцыпах, уключаючы экалагічна ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў, папулярызацыю экалагічнай вытворчасці і спажывання, стварэнне "зялёных" працоўных месцаў.

Уладзімір **Міхайлаў**

# Пасланне Прэзідэнта

**Традыцыйна вясной Прэзідэнт выступае са штогадовым Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу. Прадстаўляем выбраныя месцы з сёлетняга выступлення Аляксандра Лукашэнкі**

## Пра адносіны з Расіяй

— Дасягнуты ўзровень узаемаразумення паміж дзвюма краінамі, даверныя асабістыя адносіны паміж прэзідэнтамі даюць магчымасць нам адкрыта абмяркоўваць усе важныя праблемы, знаходзіць кампраміс. Менавіта так было і на апошняй сустрэчы, калі мы знайшлі развязкі па ўсіх важных для нашых краін пытаннях. І, галоўнае, у інтарэсах народаў Беларусі і Расіі.

— Не час сёння спрачацца, абвастраць, трэба дамаўляцца, таму што ёсць шмат праблем, якія перад намі і перад Расіяй стаяць. І мы гэтыя праблемы можам і павінны вырашаць толькі разам.

## Пра супрацоўніцтва з Захадам

— Гэта ключ да інвестыцый, сучасных тэхналогій, рэсурсаў, ёмістых рынкаў. Дыялог, які намеціўся, адпавядае не толькі ўзаемавыгадным эканамічным інтарэсам, але і нацэлены на падтрыманне палітычнай стабільнасці ў Еўрапейскім рэгіёне. Паколькі Беларусь як была, так і прадаўжае заставацца надзейным партнёрам у барацьбе з асноўнымі трансгранічнымі пагрозамі. І тут можна дабіцца вялікага поспеху. Галоўнае, пазбавіцца ад прывычкі глядзець адзін на аднаго з прадузятасцю і недаверам, прытрымлівацца двайных стандартаў, павучаць, ставіць папярэднія ўмовы. Гэта для нас непрымальна, як і для любой іншай краіны.

## Пра сітуацыю ва Украіне

— Працягваюць гінуць людзі, у тым ліку ні ў чым не вінаватыя мірныя жыхары. Рэгіён фактычна пагружаны ў сацыяльны і эканамічны хаос. Украіна не проста наш сусед. Гэта братэрская нам краіна, братэрскі народ. Мы прынялі ў сябе больш за 160 тысяч перасяленцаў. Гатовыя і далей садзейнічаць няпростым перагаворам, таму што гэта ўжо непасрэдна адлюстроўваецца на жыцці нашага народа і функцыянаванні нашай дзяржавы.

## Пра беларускія прыярытэты

— Прыярытэт — стварэнне трывалай, канкурэнтаздольнай эканомікі. Эканомікі заўтрашняга дня. Менавіта яна з'яўляецца асновай нашага суверэнітэту. У сувязі з гэтым наперадзе каласальная работа. Але рабіць яе мы будзем ужо не з нуля. За чвэрць стагоддзя незалежнасці вырашаны многія няпростыя праблемы. Патэнцыял, які мы маем, дазваляе краіне дэманстраваць жыццеўстойлівасць нават у самыя неспрыяльныя перыяды. Гэта паказаў і папярэдні год.

— Гледзячы на пакуты іншых народаў, крывавыя міжусобіцы і разруху, мы яшчэ больш цэнім парадак і згоду, якія ўдаецца захоўваць на нашай зямлі. Мы не далі ўцягнуць сябе


БЕЛТА

ў канфлікты. Захавалі добрыя адносіны з усімі суседзямі. І я як кіраўнік дзяржавы з усёй адказнасцю заяўляю: будзе зроблена ўсё, каб ніхто і ніколі не змог падтачыць фундамент нашага дзяржаўнага будынка — свабоду і незалежнасць Рэспублікі Беларусь.

— Аднак гэта магчыма толькі пры адной умове: калі кожны з нас будзе ўносіць пасільны ўклад у агульную справу. Галоўнае цяпер кансалідацыя ўсёй нацыі дзеля агульнай мэты — пабудовы моцнай і бяспечнай дзяржавы.

## Пра праверкі бізнесу

— Трэба сур'ёзна паглядзець на работу кантралюючых органаў. Залішніх праверак, што паралізуюць бізнес, быць не павінна. Прадпрыемствы, якія нармальна працуюць, не трэба пастаянна правяраць. А вось нестабільныя, што трапілі ў гэты рад, павінны знаходзіцца пад пільным кантролем дзяржавы. Яшчэ больш пільным, чым цяпер.

## Пра кантроль за цэнамі

— Важны элемент — кантроль за цэнамі на спажывецкія тавары і паслугі першай неабходнасці. У 2016 годзе мы змаглі не дапусціць іх істотнага росту. Аналагічная сітуацыя складваецца і цяпер. Кантроль будзе працягнуты.

## Пра дэмаграфію

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, важнай задачай з'яўляецца павелічэнне сярэдняй працягласці жыцця ў краіне.

— У бягучым годзе яна павінна набліжацца да 75 гадоў. 74 — жалезна. Але гэта для нас не мяжа.

## Пра сям'ю

— Гатовы разгледзець і падтрымаць прапанову аб заснаванні ордэна сям'і.

## Пра суверэнітэт і бяспеку Беларусі

— Вы павінны разумець, што для мяне і для ўсіх прадстаўнікоў органаў улады, якія сядзяць тут, і пераважнай большасці беларускага народа стабільнасць, бяспека нашай дзяржавы, незалежнасць і суверэнітэт — гэта святое. І калі нехта на гэта замахнецца, мы прыменім усю моц нашай дзяржавы. Мы не паглядзім на тое, як нас потым ацэняць.


БЕЛТА

Кітайскія журналісты — удзельнікі сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі

# Сяброўства з гадамі толькі мацнее

**У першыя дні мая праходзіў першы ў гісторыі беларуска-кітайскіх адносін прэс-тур прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі КНР. Выдатнай магчымасцю пазнаёміцца з нашай краінай, яе людзьмі, убачыць прыроду і прадпрыемствы скарысталіся журналісты з 28 друкаваных і электронных СМІ з зонай ахопу ў 10 правінцый КНР, яе буйнейшых гарадоў. Аўдыторыя — каля мільярда чалавек. У аднаго толькі Цэнтральнага тэлебачання — CGTN — 600 мільёнаў гледачоў, а больш за 100 філіялаў інфармагенцтва Сіньхуа працуюць на трох кантынентах. Ключавая падзея прэс-тура прайшла ў Палацы Незалежнасці — сустрэча яе ўдзельнікаў з Прэзідэнтам Беларусі. Адбылася вялікая і адкрытая размова.**

Аляксандр Лукашэнка шчыра і сардэчна вітаў кітайскіх гасцей. А сустрэчу менавіта ў такім фармаце растлумачыў некалькімі прычынамі:

— Па-першае, сёлета Беларусь і Кітай адзначаюць 25-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін. Напэўна, не знойдзецца ў Еўропе бліжэйшай Кітаю краіны, чым Беларусь. Я хачу працытаваць словы Чжан Дэцзяна, які нядаўна быў у нас. Старшыня Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў назваў Беларусь і Кітай “жалезнымі братамі”. Цяперашні год мы ацэньваем як пераломны ў двухбаковых адносінах. Па-другое, гэты прэс-тур арганізаваны спецыяльна напярэдадні саміту “Адзін пояс і адзін шлях”, у якім прыме ўдзел і Беларусь. Па-трэцяе, ваш прэс-тур яшчэ раз падкрэслівае важнасць супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі Беларусі і Кітая. Менавіта там знаходзяцца асноўныя рэзервы ўзаемадзеяння. Бо кожная ваша вобласць па эканамічным патэнцыяле параўнальная з моцнай сярэднееўрапейскай дзяржавай.

Аляксандр Лукашэнка:

***Сёлета Беларусь і Кітай адзначаюць 25-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін. Напэўна, не знойдзецца ў Еўропе бліжэйшай Кітаю краіны, чым Беларусь***

Журналісты Цэнтральнага тэлебачання Кітая — CGTN — папрасілі Аляксандра Лукашэнку падзяліцца сваім бачаннем чвэрцьвекавых адносін Мінска і Пекіна. Іх дасягненняў і чаканняў. Адказ быў грунтоўным, разгорнутым, з рэтраспектывай у гісторыю. І адназначнае заключэнне:

— Мы вельмі цэнім адносіны з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Сёння гэта краіна, без якой у свеце нельга вырашыць ні адно пытанне — ні рэгіянальнае, ні глабальнае. І я ганаруся, што быў ініцыятарам устанаўлення цёплых адносін з Кітаем яшчэ ў той час, калі гэтая краіна была на стадыі развіцця. Але мы чакаем ад нашых адносін яшчэ большай рэзультатыўнасці. Нам важна рухацца далей, прыцягваць у парк “Вялікі камень” прадпрыемствы з самымі перадавымі тэхналогіямі — заўтрашняга, а можа, і паслязаўтрашняга дня. Калі пралічваліся вынікі “Вялікага каменя”, мы меркавалі, што Беларусь толькі ад экспарту прадукцыі з гэтага парка атрымае прыток валюты каля 50 мільярдаў долараў.

Яшчэ адной тэмай для размовы стаў знакаміты праект КНР — выбудоўванне Эканамічнага пояса Шаўковага шляху. Галоўную яго асаблівасць Аляксандр Лукашэнка бачыць так:

— Кітайская Народная Рэспубліка, пракладваючы гэты эканамічны і лагістычны шлях, нікому не навязвае сваю волю. Бо амаль усе дзяржавы ў падобным выпадку ставяць якія-небудзь палітычныя ўмовы, хоць рэалізуецца толькі эканамічны праект. Але Кітай — наймудрэйшая нацыя. Кітай ідзе — і ў гэтым асаблівасць, ніколі ў свеце такога не было — як дружалюбная краіна, прапаноўваючы крэдыты, інвестыцыі, самыя перадавыя тэхналогіі ў тых краінах, праз якія пройдзе Шаўковы шлях.

Пэўныя бонусы пры гэтым, дарэчы, атрымае і Беларусь. А таксама сам Кітай ад узаемадзеяння з нашай краінай.

— Адкрываецца новае акно магчымасцяў для экспарту нашай прадукцыі ў Кітай. З другога боку, у свой час я яшчэ Ху Цзіньтаа гаварыў: вы ў асобе Беларусі атрымаеце самага надзейнага свайго прадстаўніка ў Еўропе. Акрамя таго, наша краіна ўваходзіць у ЕАЭС — гэта арганізацыя, якая разы ў тры большая за Кітай па тэрыторыі. Гэта прастора вялікіх магчымасцяў для КНР — і ў плане працоўных рэсурсаў, і ў плане прыродных. І яшчэ. Калі Кітай выбудоўвае блізкія адносіны з якой-небудзь дзяржавай, заўсёды глядзіць, ці не парушыць гэта баланс яго адносін з іншымі краінамі. Дык вось, сітуацыя ўнікальная: з-за блізкасці з Беларуссю вы ні з кім у свеце адносін не сапсуеце.

А вось дружба паміж Беларуссю і Кітаем — на ўзроўні і дзяржаў у цэлым, і іх кіраўнікоў — відавочна абяцае толькі ўмацоўвацца. Як вядома, Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у саміце “Адзін пояс і адзін шлях”, які быў намечаны на сярэдзіну мая ў Пекіне. Кітайскія журналісты папрасілі Прэзідэнта расказаць пра маючую адбыцца ў рамках гэтага саміту сустрэчу са Старшынёй КНР. І вось што пачулі ў адказ:

— Мы абмяркуем не толькі актуальныя пытанні міжнароднага парадку дня, але і ў першую чаргу тэмы, важныя для пашырэння нашага двухбаковага ўзаемадзеяння ў гандлёва-эканамічнай, інвестыцыйнай, фінансавай і гуманітарнай сферах. Дарэчы, арганізаваць такі маштабны саміт няпроста, паколькі ў ім прымуць удзел лідары многіх краін. Асаблівая нагрузка ляжа і на Сі Цзіньпіна. Ведаю па сабе: калі праводзіш такія мерапрыемствы, заўсёды цяжка і занятасць вельмі высокая. Тым не менш сярод тых кіраўнікоў дзяржаў, з кім Старшыня КНР знойдзе час сустрэцца, будзе і Прэзідэнт Беларусі. Гэта гаворыць пра нашы адносіны як з вашым Старшынёй, так і паміж Беларуссю і Кітайскай Народнай Рэспублікай.

## Рэзананс

**Прадстаўнікі кітайскіх цэнтральных і рэгіянальных СМІ падзяліліся з беларускімі калегамі сваімі ўражаннямі ад сустрэчы з Прэзідэнтам.**

***Се Чжыцзюань, карэспандэнт газеты "Веснік Ганьсу":***

— Больш за ўсё мяне ўразіла, што спадар Прэзідэнт Беларусі добра ведае нашу краіну. Ён шмат гаварыў пра Кітай, вялікую ўвагу надае рэгіянальнаму супрацоўніцтву з ім. Другім запамінальным момантам сустрэчы сталі яго адказы на нашы пытанні. Атрымаліся вельмі жывыя і цікавыя зносіны. У цэлым жа ад Беларусі галоўнае ўражанне — ад нашага сумеснага праекта "Вялікі камень". Тэмпы ўзвядзення гэтага парка здзіўляюць.

***Юань Баога, карэспандэнт Шаньдунскай тэлерадыёкампаніі:***

— У нас у Кітаі ваш Прэзідэнт успрымаецца як добры сябар, а паміж нашымі краінамі наладжана моцнае супрацоўніцтва. Мяркую, гэта менавіта тое, што мы павінны цаніць, вывучаць і развіваць. Добрыя адносіны паміж краінамі заўсёды вельмі важныя. І мы павінны браць прыклад з Беларусі і яе Прэзідэнта ў тым, як трэба ствараць такія трывалыя дружалюбныя міждзяржаўныя сувязі.

***Жэнь Ці, карэспандэнт газеты "Чайна Дэйлі":***

— Мне спадабалася, што адказы вашага Прэзідэнта былі вельмі шчырымі. Мы вельмі ўдзячныя яму за гэты адкрыты дыялог, які стаў сімвалам нашых партнёрскіх узаемаадносін. Гэтая дружалюбная атмасфера — сведчанне ўзроўню ўзаемаадносін паміж нашымі краінамі. Зрабіла ўражанне і ваша абстаноўка ў краіне — чыстае паветра, прыгажосць вуліц і дружалюбныя адносіны да нас.



БЕЛТА

# У рэчышчы грандыёзных планаў

**Беларусь першай з еўрапейскіх краін актыўна падключылася да мегапраекта Новага Шаўковага шляху**



Тры гады назад Кітай ініцыяваў адраджэнне Вялікага Шаўковага шляху, прапанаваўшы злучыць адзінай транснацыянальнай сеткай Азію з Еўропай і Афрыкай. Так з'явілася канцэпцыя "Адзін пояс і адзін шлях". Грандыёзны мегапраект коштам у дзясяткі мільярдаў долараў накіраваны на стварэнне і ўдасканаленне сухапутных і марскіх гандлёвых шляхоў, транспартных і эканамічных калідораў, якія звяжуць 60 краін. Гэта выкліча развіццё сусветнага гандлю і ў перспектыве дасць магчымасць сфарміраваць прынцыпова новую архітэктуру глабальнай эканомікі. Знаходзячыся на ажыўленым лагістычным скрыжаванні, Беларусь адной з першых падтрымала гэтую глабальную ініцыятыву і актыўна падключылася да яе ўвасаблення. Выгоды для нас бясспрэчныя. Эксперты падлічылі: калі гандлёвы калідор заробіць на поўную магутнасць, праз Беларусь будзе праходзіць як мінімум дзесяць працэнтаў тавараабароту паміж ЕС і КНР, а гэта сотні мільярдаў долараў. Для краіны адкрываецца сапраўдная скарбніца магчымасцяў, не скарыстацца якімі будзе вельмі неабдумана. Канкрэтныя праекты і варыянты глабальнага супрацоўніцтва абмяркоўваліся на буйным міжнародным форуме ў Пекіне, удзел у якім прыняў Аляксандр Лукашэнка.

Месца для форуму гаспадары выбралі вельмі маляўнічае, на беразе возера Яньці. У літаральным перакладзе — "возера рэдкіх птушак". Вакол горы, будыйскі храм, частка Вялікай Кітайскай сцяны. Сам канферэнц-цэнтр нагадвае птушку, якая распасцірае крылы. Па-мойму, вельмі прыдатны вобраз да ідэі будаўніцтва Новага Шаўковага шляху, якая хутка набірае папулярнасць. У КНР саміт краін Шаўковага шляху называюць галоўнай палітычнай падзеяй года. У Пекін у маі з'ехаліся кіраўнікі дзяржаў і ўрадаў з 29 краін. А яшчэ кіраўнікі ААН, МВФ, Сусветнага банка, СГА. Салідная прадстаўніцтва. Вялікі эканамічны калідор, які праходзіць праз увесь кантынент, здольны паўплываць на лёс не толькі еўразійскай прасторы, але і свету.

Аляксандр Лукашэнка расцэньвае глабальную ініцыятыву "Адзін пояс і адзін шлях" не проста як ідэю эканамічнага партнёрства:

— Яна не толькі перакройвае эканамічную карту свету і стварае новыя пункты росту, але і фарміруе міжнародныя адносіны новага тыпу. Гэта інтэграцыя па-над блокамі, закліканая гарманізаваць усе эканамічныя інстытуты і прыбраць бар'еры на шляху свабоднага руху тавараў, інвестыцый і людзей.

Прывабнасць ініцыятывы "Адзін пояс і адзін шлях" яшчэ і ў тым, што Кітай нічога нікому не навязвае, не выстаўляе палітычных умоў. Наадварот, буйнейшая эканоміка свету з трыльённымі даходамі, вялізнымі вытворчасцямі і рынкамі збыту прапаноўвае новыя драйверы росту для

ўсіх краін, размешчаных уздоўж Новага Шаўковага шляху. І не на словах, а на справе. За тры гады Кітай інвеставаў у гэтыя дзяржавы каля 50 мільярдаў долараў. У бліжэйшыя тры гады Сі Цзіньпін паабяцаў вылучыць яшчэ 8,7 мільярда долараў краінам, якія ўдзельнічаюць у будаўніцтве Новага Шаўковага шляху.

На форуме Аляксандр Лукашэнка выказаў свае ідэі па паглыбленні і пашырэнні супрацоўніцтва на Еўразійскім кантыненце. У прыватнасці, Мінск прапаноўвае выкарыстоўваць "Адзін пояс і адзін шлях" не проста як гандлёвыя маршруты, але і як аснову для пашырэння ідэй і сумеснага стварэння інавацый. Узорам для пераймання можа служыць Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк "Вялікі камень", які задуманы і будуецца як горад будучыні — экалагічны, інавацыйны і камфортны для жыцця і работы.

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў таксама ўдзельнікам форуму прадумаць алгарытмы па спалучэнні навуковых патэнцыялаў. Для гэтага трэба фарміраваць на міждзяржаўным узроўні цэнтры даследаванняў і навуковых абменаў. У Пекіне за гэтую ідэю галасуюць абедзвюма рукамі і ўжо аб'явілі аб планах па стварэнні з іншымі краінамі 50 сумесных навуковых цэнтраў.

Усё больш вострай становіцца і праблема лічбавай бяспекі. Кібератакі на буйнейшыя банкаўскія, прамысловыя і нават ваенныя аб'екты яшчэ ўчора фігуравалі толькі ў сюжэтах фантастычных блокбастараў. Сёння яны сталі рэальнасцю. Прэзідэнт Беларусі заклікаў замежных калег скаардынаваць намаганні па абароне стратэгічна важнай інфраструктуры ўрадавых і камерцыйных баз дадзеных. Ад гэтага непасрэдна залежыць захаванне нацыянальнай бяспекі і суверэнітэту для кожнай дзяржавы.

Словам, патэнцыял у Новага Шаўковага шляху вялікі. На фоне трансфармацыі міжнародных адносін і высокай ступені неакрэсленасці свет усё больш усведамляе неабходнасць сумеснага рэагавання на глабальныя выклікі. І хоць ініцыятыва "Адзін пояс і адзін шлях" належыць Кітаю, гэта зусім не азначае, што Пекін будзе працаваць у адзіночку. Тут патрэбна сумесная "сімфонія", ад выканання якой выйграе кожны.

Буйны міжнародны саміт — гэта яшчэ і выдатная магчымасць для двухбаковых сустрэч на вышэйшым узроўні, а таксама з прадстаўнікамі буйнога бізнесу. Аляксандр Лукашэнка правёў перагаворы з прэм'ер-міністрам Пакістана Навазам Шарыфам і запрасіў яго ўлетку наведаць Беларусь разам з сям'ёй.

З Прэзідэнтам Турцыі Рэджэпам Тайіпам Эрдаганам Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў рэалізацыю дасягнутых раней дамоўленасцяў, а таксама перспектывы развіцця супрацоўніцтва ў розных сферах.

Таксама Прэзідэнт Беларусі правёў сустрэчы з кіраўніцтвам шэрага краін Афрыкі, Азіі, Еўропы і Лацінскай Амерыкі.

***Саміт краін Шаўковага шляху называюць галоўнай палітычнай падзеяй года. У Пекін у маі з'ехаліся кіраўнікі дзяржаў і ўрадаў з 29 краін. А яшчэ кіраўнікі ААН, МВФ, Сусветнага банка, СГА. Салідная прадстаўніцтва. Вялікі эканамічны калідор, які праходзіць праз увесь кантынент, здольны паўплываць на лёс не толькі еўразійскай прасторы, але і свету***

Заключным акордам рабочага візіту Прэзідэнта ў Кітай стала сустрэча са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам. Гаварылі, вядома, у большай ступені пра двухбаковае супрацоўніцтва, а яно ахоплівае сёння практычна ўсе сферы. Тым не менш праведзеныя перагаворы сталі лагічным працягам вялікай гутаркі на міжнародным форуме "Адзін пояс і адзін шлях". Двухдзённы палітычны марафон яшчэ раз паказаў гатоўнасць Пекіна ўзяць на сябе ролю лакаматыва глабалізацыі сусветнай эканомікі. Каля 70 дзяржаў падпісалі з Кітаем пагадненні аб супрацоўніцтве па адраджэнні Вялікага Шаўковага шляху на сушы і на моры. Гэта гаворыць аб тым, што такое мерапрыемства даўно наспела, і Аляксандр Лукашэнка шчыра павіншаваў свайго сябра Сі Цзіньпіна з такім поспехам:

— Гэта вельмі магутны крок, які вы змаглі зрабіць, і самае галоўнае — прыцягнуць да гэтага ўвагу больш як ста краін. Мы ганарымся тым, што былі першымі ў Еўропе і аднымі з першых у свеце, хто не проста падтрымаў ідэю "Аднаго пояса і аднаго шляху", а распачаў рэалізацыю гэтага маштабнага праекта на тэрыторыі Беларусі.

Сёння ўжо відавочна, што наша краіна становіцца важнейшым звяном транс'еўразійскай магістралі, а значыць, ёсць добрая падстава абмяркоўваць новыя сумесныя праекты беларуска-кітайскага супрацоўніцтва.

Беларусь нараўне з магутнай Расіяй, Вялікабрытаніяй і Пакістанам уваходзіць у лік бліжэйшых саюзнікаў і партнёраў Пекіна. Гэта сур'ёзны сігнал для патэнцыйных інвестараў. Тым больш што Аляксандр Лукашэнка прыязджаў у Кітай, як гаворыцца, не з пустымі рукамі. Напярэдадні візіту быў падпісаны ўказ аб новых умовах работы Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка "Вялікі камень".

— Гэты ўзорны праект двухбаковага супрацоўніцтва павінен стаць эксперыментальнай пляцоўкай па зняцці гандлёвых бар'ераў у сумесным будаўніцтве Новага Шаўковага шляху, — падзяліўся Прэзідэнт сваімі чаканнямі са Старшынёй КНР.

Уласна кажучы, на гэта і накіраваны новы ўказ, які значна спрашчае адміністрацыйныя працэдуры і ўводзіць мараторый на праверкі інвестараў. Мяркуючы па рэакцыі кітайскіх партнёраў, такая ідэя напэўна прыйшлася



БЕЛТА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Старшыня КНР Сі Цзіньпін

ім даспадобы. Выпадкова ці не, але менавіта ў дні візіту рэзідэнтамі парка сталі яшчэ чатыры кітайскія кампаніі (у дадатак да раней далучаных дзевяці). Тры з іх будуць займацца выпускам святлодыёднай прадукцыі. Чацвёрты праект звязаны з геатэрмальнымі распрацоўкамі. Акрамя таго, беларускі бок прапанаваў кампаніі Huawei адкрыць вытворчасць камплектуючых і кампанентаў для камунікацыйных сістэм.

Прэзідэнты адзіныя ў думцы, што інавацыйнае супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі павінна стаць драйверам росту. Перспектывы тут уражлівыя, але старшыня Дзяржкамітэта па навуцы і тэхналогіях Аляксандр Шумілін разважае даволі прагматычна:

— Акрамя навукова-тэхнічнага патэнцыялу, у нас ёсць сур'ёзныя фундаментальныя даследаванні. Яны не заўсёды запатрабаваныя з прычыны невялікай тэрыторыі Беларусі. Кітай жа ўкладвае вялікія рэсурсы ў фундаментальныя даследаванні. Сі Цзіньпін аб'явіў аб будаўніцтве паўсотні навукова-тэхнічных цэнтраў сумесна з іншымі краінамі, і мы зацікаўлены, каб частка гэтых цэнтраў з'явілася ў Беларусі.

Сучасныя тэхналогіі патрэбныя і рэальнаму сектару эканомікі. Размова, у прыватнасці, ідзе аб завяршэнні мадэрнізацыі нашых нафтаперапрацоўчых заводаў, у якой маглі б прыняць удзел кітайскія інвестары. Неабходная сума складае каля мільярда долараў. Сусветна вядомая карпарацыя CITIC Group плануе рэалізаваць інавацыйны праект па стварэнні высокатэхналагічнай аграпрамысловай вытворчасці поўнага цыкла.

Яшчэ адна кітайская кампанія заявіла аб жаданні ўкласці капітал у будаўніцтва комплексаў па вытворчасці малака ў Віцебскай вобласці. Плануецца, што прадукцыя гэтых прадпрыемстваў будзе перапрацоўвацца на беларускіх заводах і пастаўляцца ў Кітай. Сума праекта ацэньваецца больш як у 200 мільёнаў долараў. Акрамя таго, кітайцы гатовы закупляць у нас ялавічыну.

Кітай таксама працягне аказваць Беларусі дапамогу па будаўніцтве сацыяльнага жылля. Дамоўленасць была замацавана ў міжурадавым пагадненні аб тэхніка-эканамічнай дапамозе. Дакумент быў падпісаны ў прысутнасці лідараў дзвюх краін. Па выніках перагавораў кіраўнікоў дзяржаў таксама было складзена міжурадавае пагадненне аб развіцці міжнародных грузавых перавозак і супрацоўніцтве ў рэалізацыі канцэпцыі будаўніцтва Эканамічнага пояса Шаўковага шляху.

Увогуле, мяркуючы па выніках пергавораў, у бліжэйшы час у нашага пасла ў Пекіне Кірыла Рудага работы дадасца. Зрэшты, ён гэтаму толькі рад і, нават нягледзячы на неверагодную загружанасць, ахвотна згаджаўся гутарыць з журналістамі:

— Цяпер складваюцца спрыяльныя магчымасці для нас у выніку таго, што кітайскі рынак мяняецца, багацее, расце, і кітайскія спажыўцы ўсё больш пачынаюць арыентавацца на імпартныя тавары. У сувязі з гэтым ёсць шанцы змяніць структуру беларускага экспарту. Яго аснову складаюць калійныя ўгнаенні. Нам трэба пастаўляць больш спажывецкіх тавараў і прадуктаў харчавання. Беларускае малако любяць у Кітаі за яго якасць і смак.

Актывізаваць бізнес-кантакты дапаможа і спрашчэнне візавага рэжыму паміж нашымі краінамі. Гэтае пытанне таксама абмяркоўвалася на сустрэчы кіраўнікоў дзвюх краін.

Васіль **Харытонаў**

# Было што паглядзець...

**Беларусь займае першае месца ў СНД па індэксе развіцця сферы інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій — гэты несумненны поспех адзначыў генеральны сакратар Міжнароднага саюза электрасувязі Хаўлінь Чжаа на выставе “ТІБО-2017”**




ПАВЕЛ ЧУЙКО

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт прадэманстраваў студэнцкі нанаспадарожнік

Навінкі мабільнай сувязі, дроны і робаты, кампаненты электроннай дзяржавы, інтэрнэт рэчаў і сэрвісы, якія робяць жыццё лягчэйшым, — гэта толькі частка таго, з чым можна было пазнаёміцца на XXIV Міжнародным форуме па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях. З году ў год ён дэманструе, як высокія тэхналогіі мяняюць наша жыццё.

Узяць такі класічны напрамак, як пошта, якая шмат працуе з банкамі, — бо не ўсе могуць дазволіць сабе мець аддзяленні ў аддаленых раёнах. А сістэма самаабслугоўвання — плацежна-даведачныя тэрміналы — у перспектыве дапаможа атрымаць патрэбную даведку і доступ да любой дакументацыі дзякуючы агульнадзяржаўнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэме, якая ў нас ужо ўкараняецца. На “ТІБО” быў прадстаўлены і паштовы інтэрнэт-магазін беларускіх тавараў shop.belpost.by. Галоўны яго прынцып — работа толькі з айчыннымі вытворцамі — сябе апраўдаў: паступаюць дзясяткі тысяч заказаў.

Мабільны аператар МТС паказаў новы сэрвіс “Штурман”, які паляпшае якасць жыцця невідушчых. У тэставым рэжыме ім пакуль


БЕЛТА

На выставе

карыстаецца 15 інвалідаў па зроку і 35 валанцёраў. Сутнасць у тым, што ў слабавідушчага ёсць смартфон з камерай і дадаткам, якія даюць магчымасць трансляваць анлайн-відэа добраахвотнаму памочніку. Той і становіцца "штурманам", вачамі невідушчага, падказвае, куды ісці, цану тавара ў магазіне або пазіцыі меню ў кафэ. Яшчэ адна інавацыя кампаніі — дадатак мегабук — дапаможа школьнікам карыстацца анлайн электроннымі падручнікамі.

БДУ паказаў студэнцкі нанаспадарожнік. У два кубічныя дэцыметры змясціліся сістэмы навігацыі і руху, прыёму і перадачы інфармацыі, прыборы, якія будуць займацца маніторынгам Зямлі. Верхняя абшыўка — сонечныя батарэі. Запусціць спадарожнік плануецца ўжо сёлета.

А вось эксперыментальны ўзор офіснага суперкамп'ютара "Скіф-Геа Офіс" — стварэнне Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі Акадэміі навук — нідзе, акрамя "ТІБО", не ўбачыш. У свеце ён адзіны ў сваім родзе. Спецыяльнае праграмнае забеспячэнне, 10 незалежных вылічальных вузлоў, якія працуюць паралельна, унікальная сістэма ахаладжэння і хуткадзейнасць — прыкладна 10 трыльёнаў аперацый у секунду. Створаны пад канкрэтнага заказчыка.

— Мы працуем непасрэдна з геолагамі. У іх вельмі вялікія аб'ёмы дадзеных, складаныя вылічэнні. І іх трэба праводзіць у кароткія тэрміны, каб павысіць эфектыўнасць, пазбегнуць бурэння ў непатрэбных месцах, — тлумачыць Сяргей Круглікаў, намеснік гендырэктара інстытута.

Кампанія Huawei гэтым разам выступіла генеральным партнёрам "ТІБО". Паводле слоў дырэктара беларускага офіса Пань Юна, гэта добрая магчымасць унесці свой уклад у развіццё інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій у Беларусі:

— На форуме мы не толькі прадстаўляем флагманскія мадэлі смартфонаў, якія наведвальнікі могуць пратэставаць, але і дэманструем нашу канцэпцыю "смарт хоўм" — разумны дом, разумны горад. Паказваем, як з дапамогай воблачных тэхналогій можна павысіць эфектыўнасць прадпрыемстваў, дзяржструктур, зрабіць паўсядзённае жыццё лепшым.

Упершыню ў форуме прымала ўдзел Беларуская федэрацыя беспілотнай авіяцыі, якая зусім нядаўна з'явілася ў нас. Лятаючыя дроны забаўлялі публіку на "ТІБО", але сам сэнс стварэння федэрацыі ў тым, каб паказаць: беспілотнікі — не цацкі. Старшыня савета федэрацыі Яўген Ярмоленка лічыць, што прыйшоў час устанавіць камфортныя — бяспечныя і не вельмі жорсткія — правілы, каб напрамак развіваўся:

— Беспілотнікі могуць быць задзейнічаны ў бізнес-праектах. У ЗША 8 з 10 фермераў выкарыстоўваюць дроны. У нас таксама можна збіраць інфармацыю пра стан палёў, атрымліваць эканомію на паліве і ўгнаеннях. Прымяняюцца беспілотнікі і для маніторынгу будаўніцтва аб'ектаў — калі ідзе разыходжанне з планам, гэта фіксуецца адразу, эканомяцца тысячы долараў.

Аляксей **Фядосаў**



# Лекі “друкуе” 3D-прынтар

**Таблетка пад канкрэтнага пацыента — гэта не фантастыка, а рэальнасць. У свеце працуюць над стварэннем персаніфікаваных лекавых сродкаў. Першыя даследаванні пачаліся і ў Беларусі. Мы зазірнулі ў Інстытут цепла- і масаабмену імя А.В. Лыкава, дзе актыўна развіваюць напрамак 3D-медыцыны, і даведаліся пра ўсе падрабязнасці.**



## Пілюля ў выглядзе піраміды

Мы прыйдзем да таго, што не толькі ў кожнай медклініцы, але і ў аптэцы будзе стаяць 3D-прынтар. Сяргей Філатаў, загадчык лабараторыі, не фантаст, ён ведае, пра што гаворыць. Укараніўшы 3D-друк на прадпрыемствах і будоўлях, у канструктарскіх майстэрнях і ў “інтэрнэце рэчаў”, інвестары актыўна возьмуцца за ахову здароўя. Гэта сусветная тэндэнцыя. Сяргей Філатаў працягвае невялікі кантэйнер. У ім таблеткі. І кожная “надрукавана” на прынтары, папярэджвае загадчык:

— Імкнёмся прыйсці да таго, каб доза лякарства персанальна вызначалася для кожнага пацыента, а потым патрэбная таблетка будзе стварацца на 3D-прынтары. Зразумела, што колькасць лекавага рэчыва для мужчын вагой 70 кілаграмаў і 100 павінна быць рознай. Таму масу дзеючага рэчыва ў таблетцы будзе вызначаць доктар.

Прычым можна стварыць лякарства, якое будзе растварацца ў арганізме з рознай хуткасцю. Выпіў, дапусцім, чалавек раз таблетку, а яна будзе дзейнічаць гадзіны ці нават суткі. Пілюлю 3D таксама можна паслойна стварыць з розных прэпаратаў. Напрыклад, сёння чалавеку пасля трансплантацыі органа трэба прымаць жменю прэпаратаў. А з дапамогай адытыўных тэхналогій ён зможа выпіць усяго адну таблетку, затое яна будзе лячыць адразу ў некалькіх напрамках.

— Цыліндрычная форма прывычная воку, — Сяргей Філатаў бярэ ў рукі таблетку. — Але ў залежнасці ад дзеяння лякарства можна выбраць і іншую. Напрыклад, пілюля ў выглядзе ўсечанай піраміды будзе растварацца хутчэй.

## У планах — ствараць органы для трансплантацыі

Магчымасці адытыўных тэхналогій у медыцыне падаюцца бязмежнымі. На 3D-прынтарах тут ствараюць аб’ёмныя мадэлі сэрца, сустава, трахеі. Некаторыя з іх становяцца своеасаблівымі навучальнымі дапаможнікамі для медыкаў. Загадчык лабараторыі дастае з шафы раздрукаванае сэрца і працягвае мне:

— Паглядзіце, яно нават навобмацак як сапраўднае. Друкуем мадэлі су-

ставаў. Яны ствараюцца па камп'ютарнай тамаграме пацыента. Таму нават калі разрэзаць такі сустаў, ён унутры будзе якраз як сапраўдны. З дапамогай гэтых рэалістычных мадэляў беларускія ўрачы рыхтуюцца да складаных аперацый.

Але навукоўцы ставяць і больш амбіцыйныя мэты. У планах ствараць органы для трансплантацый. Сяргей Філатаў паказвае мадэль ныркі, раздрукаванай на прынтары:

— Па сутнасці, гэта ўсяго толькі пластыкавы каркас, які потым можна "пакрыць" чалавечымі клеткамі. Так яны будуць расці яшчэ некалькі тыдняў у лабараторыі, перш чым орган зможа нармальна функцыянаваць. Пасля ўстаноўкі органа каркас паступова раствараецца, і застаецца толькі жывая чалавечая тканка, ідэальна сумяшчальная з арганізмам. А можна з дапамогай прынтара ствараць арганэлы. Для разумення прывяду прыклад. У чалавека праблемы са шчытападобнай залозай. Мы вырошчваем тканкі шчытападобнай залозы, але "падшываем" іх неабавязкова ў тым месцы, дзе знаходзіцца залоза ўнутранай сакрэцыі. Пры гэтым яны выконваюць свае функцыі.

## Скуру адправяць на друк

У інстытуце працуюць і над стварэннем прататыпа штучнай скуры. Перад намі дзве кісці рук — таксама "вырашчаныя" з дапамогай прынтара.

Сяргей ФІЛАТАЎ:

***Мы спрабуем вырасціць штучную скуру...***



АЛЯКСАНДР СТАДУБ

Бяру адну з іх. Злёгку аксаміцістая паверхня, сціснеш у руцэ — сціскаецца. Не пластык, але ўсё-такі пакуль яшчэ і не скура. Сяргей Філатаў згаджаецца: "Да штучнай скуры пакуль далёка, затое гэтая кісць у якасці працоўнага органа для робата-маніпулятара — цудоўны варыянт. І для стварэння пратэза таксама падыдзе. А можа, гэтыя кісці стануць крокам да стварэння штучнай мышцы.

Праблема ў наступным: каб ствараць усё, пра што мы гаворым, патрэбныя новыя функцыянальныя матэрыялы для запраўкі 3D-прынтараў. Некаторыя робяць у нас, некаторыя закупляюць за мяжой, а потым ужо нашы навукоўцы мадыфікуюць іх пад свае мэты.

За шклом перада мною кабінет. У яго староннім людзям заходзіць нельга. Гэта так званы чысты пакой. У ім адзін з самых лепшых электронных мікраскопаў у краіне. На ім вывучаюцца ўсе матэрыялы, што выкарыстоўваюцца для 3D-друку. Якасць будучага штучнага органа можна праверыць на вышэйшым узроўні: мікраскоп павялічвае ў дзясяткі тысяч разоў.

Пакуль мы працуем адразу ў некалькіх напрамках, — падводзіць вынікі Сяргей Філатаў. — Гатовыя супрацоўнічаць з медустановамі, прадпрыемствамі, ВНУ, з усімі, хто зацікаўлены ў новых дасягненнях навукі.

Магчыма, недалёкі той час, калі мы будзем прыходзіць у аптэку, працягваць свой генетычны пашпарт або рэцэпт ад доктара, а праз некалькі хвілін у нас у руках будзе ўпакоўка таблетак. І гэта будзе не проста лякарства, а прэпарат, створаны індывідуальна пад нас.

Таісія **Азановіч**

## Каментарый

**Сяргей ЧЫЖЫК, першы намеснік старшыні Прэзідыума НАН:**

— Адытыўныя тэхналогіі, або тэхналогіі 3D-друку, — сёння адзін з напрамкаў лічбавай вытворчасці, які найбольш дынамічна развіваецца. І гэтыя тэхналогіі прымяняюцца ў самых розных галінах: машынабудаванні, прыборабудаванні, медыцыне. Для медыцыны гэта вельмі перспектыўная ніша. Сёння файлы, атрыманыя з дапамогай камп'ютарнай тамаграфіі, можна выкарыстоўваць не толькі для дыягностыкі, але і для візуалізацыі органаў і тканак у 3D-маштабе з наступнай раздрукоўкай іх на прынтары. Гэтая магчымасць, якая яшчэ некалькі гадоў назад падавалася нерэальнай, цяпер дае патэнцыял рухацца адразу ў двух напрамках. Першы — стварэнне прататыпаў для падрыхтоўкі да аперацыі.

Другі напрамак — друк штучнага органа або яго часткі "біячарнілам" на аснове біялагічных клетак. Ужо вядзём перагаворы з РНПЦ трансплантацыі органаў і тканак. Таксама на этапе перагавораў знаходзіцца праект з Паўднёвай Карэяй. Яго сутнасць: стварэнне персанальных лякарстваў з дапамогай 3D-друку. Першыя даследаванні пачаліся, але пакуль мы ў пачатку шляху.

У гэтай тэхналогіі будучыні бязмежныя магчымасці. Але ёсць і праблемы. Цяпер важна працаваць з новымі матэрыяламі для 3D-прынтараў, якія адпавядаюць рашаемай задачы, калі гаворка ідзе пра медыцыну, — біясумяшчальнымі. Немалаважна таксама рыхтаваць кваліфікаваныя кадры. Пакуль такіх спецыялістаў няшмат, але пачата навучанне па адытыўных тэхналогіях у БДУ, БНТУ, БДТУ. Нашы навукоўцы гатовыя дапамагаць медыкам. Але мы не іграем тут першую скрыпку. Важна, каб у агульны працэс актыўней уключаліся ўрачы і навукоўцы біямедыцынскага напрамку.

**Новы праект з лаканічнай назвай “ПаспяховаЯ”, ініцыятарам і арганізатарам якога выступае Белінвестбанк пры падтрымцы Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця, браў свой старт у Мінску з правядзення бізнес-сустрэчы. Яе ўдзельніцы змаглі даведацца аб праграме ЕБРР “Жанчыны ў бізнесе”, аб фінансавых ды іншых магчымасцях, якія для беларускіх жанчын-прадпрымальніц гатовы прадаставіць банк-арганізатар праекта, а таксама атрымаць новыя знаёмствы. І палепшыць свае навыкі, напрыклад, у сферы маркетынгу.**




# Узаемныя пачуцці

## У Беларусі паспяхова рэалізуецца праект па развіцці і падтрымцы жаночага прадпрымальніцтва



Яшчэ з мінулага года Белінвестбанк пачаў сваю партнёрскую дзейнасць у рамках супрацоўніцтва з Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця па міжнароднай праграме “Жанчыны ў бізнесе”. У рамках гэтай работы і быў створаны праект “ПаспяховаЯ”: з мэтай падтрымаць жанчын-прадпрымальніц, расказаць ім пра магчымасці ў рамках праграмы, якімі яны могуць скарыстацца для стварэння альбо ўжо для развіцця свайго бізнесу. Запланавалі серыю бізнес-сустрэч, якія пройдуць на працягу гэтага года не толькі ў Мінску, але і ў абласных цэнтрах.

— *Праект “ПаспяховаЯ” прызначаны для ўласнікаў і кіраўнікоў бізнесу, а таксама для тых жанчын, якія хочуць пачаць сваю справу. У рамках гэтай ініцыятывы Белінвестбанк пры падтрымцы Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця ўзяў на сябе місію падтрымаць жанчын-прадпрымальніц, адкрыць для іх як фінансавыя, так і нефінансавыя магчымасці для прафесійнага развіцця. Наша задача гэтыя магчымасці данесці, каб як мага больш актыўных і зацікаўленых у развіцці свайго бізнесу жанчын змаглі імі скарыстацца,* — расказаў намеснік старшыні Праўлення ААТ “Белінвестбанк” Аляксандр Філіповіч.

Больш за пяцьдзясят удзельніц змаглі ацаніць праграму бізнес-сустрэчы ў Мінску. Уласнікі і кіраўнікі бізнесу пазнаёміліся з Вольгай Кавалёвай, вядучым менеджарам Групы фінансавання і развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ЕБРР. Вольга ў адной са змястоўных частак бізнес-сустрэчы прэзентавала магчымасці праграмы “Жанчыны ў бізнесе”, якая фінансуецца ЕБРР, Еўрапейскім саюзам, Швецыяй і





Фондам падтрымкі краін з пераходнай эканомікай на ранняй стадыі развіцця.

*— Праграма “Жанчыны ў бізнесе” ўключае тры кампаненты. Першы — фінансаванне, якое мы прадастаўляем праз банкі-партнёры. Белінвестбанк стаў такім у 2016 годзе. Другі кампанент — кансультацыі, дзе мы дапамагаем бізнесу наладзіць камунікацыю з лакальнымі фінансавымі кансультантамі. Трэці — гэта павышэнне прадпрымальніцкіх навыкаў праз майстар-класы спецыялістаў-практыкаў розных сфер дзейнасці,* — расказала Вольга Кузняцова. *— Усе гэтыя кампаненты — наша канцэпцыя, якая паспяхова падышла пад стратэгію развіцця Белінвестбанка, у выніку чаго мы і атрымалі праект “ПаспяховаЯ”. Такі праект сапраўды садзейнічае развіццю жаночага прадпрымальніцтва, ён важны і патрэбны. Вялікая колькасць водгукаў удзельніц — таму доказ.*

Паміж тым, фармат бізнес-сустрэчы ў Мінску прадугледжваў як інфармацыйны, так і адукацыйны элемент. Сёння любы паспяховы бізнес складана сабе ўявіць без эфектыўнага маркетынгу. Таму з эфектыўна працуючымі інструментамі ў гэтай галіне з удзельнікамі бізнес-сустрэчы падзялілася эксперт-практык Дар’я Сармонт — заснавальнік і кіраўнік цэнтра ўпраўленчых рашэнняў Sarmont, аднаго з лідараў у галіне маркетынгавых даследаванняў.

*— Майстар-класы ў рамках праекта “ПаспяховаЯ” — гэта магчымасць падзяліцца сваімі ведамі і досведам з удзельніцамі. А для слухачоў такія сустрэчы — спосаб даведацца пра існуючыя падыходы і інструменты, якія сапраўды дазваляюць вывесці бізнес на якасна новы ўзровень. Маркетынг — гэта стратэгічная функцыя кампаніі, якая дае магчымасць быць канкурэнтаздольнымі і паспяховымі. Гэтая функцыя заснавана на некалькіх правілах: вывучаць свайго кліента максімальна падрабязна, разумець яго чаканні, прапаноўваць адпаведны тавар або прадукт, правільна яго прэзентаваць, каб быць пачутымі кліентамі. Сёння мала вырабіць якасны тавар, устанавіць канкурэнтаздольны кошт і чакаць патоку пакупнікоў. Важны эмацыйны складнік прадукту, брэнда, які будзе адпавядаць каштоўнасцям, ладу жыцця пакупніка. Менавіта такі падыход дазваляе будаваць паспяховы бізнес,* — рэзюмуе Дар’я Сармонт.

Зрэшты, удзельніцы сустрэчы змаглі не толькі пагутарыць з кансультантамі. Яны абмяняліся досведам адна з адной, даведаліся, якім чынам і ў рамках якіх дзеючых праграм можна атрымліваць фінансавую падтрымку па найбольш выгадных умовах. Паводле слоў адной з удзельніц праграмы “Жанчыны ў бізнесе” Алены Марозавай, кіраўніка прыватнага прадпрыемства, фінансавыя магчымасці ў рамках праграмы ЕБРР дазволілі на этапе станаўлення ўласнай кампаніі атрымаць магутны штуршок у выглядзе выдзеленых грашовых сродкаў. Дзесяць тысяч долараў ЗША — такую суму атрымала кампанія Алены для ўкаранення ліцэнзійнага праграмнага забеспячэння. *“Менавіта гэта дазволіла больш як на палову павысіць продажы і ў цэлым аптымізаваць работу нашай кампаніі. Пры гэтым магчымасці праграмы “Жанчыны ў бізнесе” дазволілі істотна скараціць фінансавыя інвестыцыі ў мадэрнізацыю прадпрыемства, бо дзякуючы ЕБРР неабходна было папоўніць значна менш сродкаў, чым гэта варта сёння на рынку”,* — адзначыла Алена Марозава.

Першая сустрэча ў рамках праекта “ПаспяховаЯ” прайшла ў вельмі цёплай дзелавой атмасферы, стала вельмі прадуктыўнай як для спікераў, так і ўдзельніц. Прымаючы да ўвагі пазітыўныя водгукі, а таксама вялікую колькасць заявак Белінвестбанк намеціў правядзенне яшчэ пяці такіх сустрэч. Працэс, што называецца, выклікаў узаемную цікавасць і абяцае быць вельмі актыўным.

Уладзімір **Міхайлаў**

# Развітанне з мінулым

**Ва Урада і Нацбанка ёсць план. Лічыцца, што яго рэалізацыя ўмацуе давер грамадзян да роднага рубля, а гэта, у сваю чаргу, запаволіць інфляцыю і дасць магчымасць сітуацыі на валютна-фінансавым рынку заставацца стабільнай. Гаворка ідзе пра дэдаларызацыю эканомікі. Наш карэспандэнт азнаёмілася з дакументам і абмеркавала з экспертамі, як можна выкараніць даларызацыю ў розумах грамадзян.**


ПАВЕЛ ЧУЙКО

Паводле прагнозаў, ужо да канца наступнага года ў краіне павінна быць сур'ёзна скарочана выкарыстанне валюты ў разліках і пры выплаце збораў, пошлін ды іншых плацяжоў, а таксама знізіцца яе значэнне ў якасці эквівалента меры кошту пры фарміраванні тарыфаў, ставак і цэн. У лютым намеснік старшыні Нацбанка Сяргей Калечыц, прадстаўляючы комплекс мер, растлумачыў: спрыяльны фон у краіне для пачатку дэдаларызацыі ўжо існуе. У прыватнасці, запаволілася інфляцыя, даходнасць рублёвых укладаў перавышае валютныя, а сітуацыя на валютным рынку стабільная.

Аднак радавацца раней часу не варта. Не сакрэт, што ў Беларусі захоўваецца самы высокі ўзровень даларызацыі эканомікі, калі параўноўваць з дзяржавамі ЕАЭС і Еўропы. Па стане на 1 студзеня доля валютных дэпазітаў у банках у нас перавышала 76 працэнтаў, а валютны складнік у агульным крэдытным партфелі быў зафіксаваны на ўзроўні 75 працэнтаў. Усё гэта моцна зніжае эфектыўнасць работы працэнтнага канала, дзякуючы якому можна лепш рэгуляваць інфляцыю. Сумесны комплекс мер Урада і Нацбанка па зніжэнні ўзроўню даларызацыі эканомікі, які нам удалося вывучыць, уяўляе з сябе пералік мерапрыемстваў. Некаторыя прапановы ўжо удалося рэалізаваць, астатнія павінны прывесці ў выкананне да канца гэтага года і на працягу наступнага. Цалкам выключыць разлік у валюце ў краіне плануецца ў 2019 годзе.

Што ж уваходзіць у комплекс мер? Напрыклад, ёсць такія прапановы: вызначаць памер плацяжоў на падставе кадастравага кошту ўчасткаў у беларускіх рублях (ужо дзейнічае з 1 студзеня гэтага года); устанавіць у нацыянальнай валюце стаўкі збораў за праезд па аўтамабільных дарогах і плацяжоў, звязаных з перавозкай грузаў; выключыць прывязку да долара паказчыкаў дабаўленай вартасці ў разліку на аднаго сярэдняспісачнага работніка; адмовіцца ад прывязкі да долара цэн, тарыфаў на прыродны газ, электрычную і цеплавую энергію для юрыдычных асоб.

Рэалізаваць некаторыя меры комплексу, паводле ацэнкі экспертаў, можна без асаблівых складанасцяў. Напрыклад, аплачваць арэнду ці праезд па платных аўтадарогах у рублях, выключыць прывязку да валюты пры асобных відах абавязковага страхавання. Але ёсць і некаторыя моманты, якія выклікаюць пэўныя складанасці. Што рабіць з цэнамі на газ і электраэнергію?

— Бо дзяржава так ці інакш закупляе энерганосьбіты за валюту, — разводзіць рукамі старшыня Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі (БНПА) Аляксандр Швец.

Эксперт задае рытарычнае пытанне: з якіх крыніц пакрываць страты, калі ўзнікнуць курсавыя розніцы? Так што ёсць пэўныя рызыкі. Рэалізацыя плана будзе залежаць ад укаранення паўнавартаснай сістэмы ацэнкі рызык ва ўсіх сферах, а таксама магчымасці хэджавання валютных рызык. На жаль, пакуль беларускія кампаніі не могуць у поўнай меры выкарыстаць гэтыя інструменты: вельмі шмат неўрэгуляваных пытанняў у галіне бухгалтэрыі і падаткаабкладання па такіх аперацыях.

Акрамя таго, у краіне склалася практыка дэ-факта аперыраваць валютнымі цэнамі. Задаю пытанне Аляксандру Швецу: калі ўсё так лёгка, чаму нельга, напрыклад, літаральна сёння ўзяць і адвязаць ад еўра растаможку аўтамабіляў? Спецыяліст прыводзіць прыклад па фарміраванні бюджэту, дзе асобныя даходныя артыкулы хоць і выражаны ў рублях, але па факце прывязаны да валюты праз адпаведныя тарыфы. У той жа самы час шэраг расходных артыкулаў у той ці іншай ступені звязаны з закупкай імпарту ці пагашэннем розных абавязацельстваў у валюце. І хоць абодва радкі выражаны ў рублях, але цалкам відавочна, што пры такім падыходзе яны будуць збалансаваныя пры любых курсах. Натуральна, можна зразумець фінансавыя органы, якія мінімізуюць уплыў курсавых рызык на выкананне бюджэту.

Намеснік дырэктара Цэнтра інтэграцыйных даследаванняў Еўразійскага банка развіцця Міхаіл Дземідзенка, а таксама эканамісты ЕАБР Аляксей Кузняцоў і Наталля Мі432ончык у артыкуле "Прычыны і шляхі вырашэння праблем", які быў апублікаваны ў часопісе "Банкаўскі веснік", вылучаюць некалькі груп мер па скарачэнні даларызацыі эканомікі. Першачарговыя меры накіраваныя на змену макраэканамічнага асяроддзя. Другі ўзровень — пасіўныя, арыентаваныя на фарміраванне спрыяльнага фінансавага рыначнага асяроддзя, трэці ўзровень — актыўныя, закліканыя ўздзейнічаць на стымулы распаўсюджвання аперацый канкрэтнага сегмента рынку, а таксама правілы ўстанаўлення цэн на асобныя тавары. Чакаецца, што рэалізацыя ўсяго комплексу мер прывядзе да стабільнай макраэканамічнай сітуацыі.

Галіна **Краўцова**

# Рубель займае належнае месца

**У краіне ў чарговы раз зніжана стаўка рэфінансавання — з 15 да 14% гадавых. Нацбанк тлумачыць сваё рашэнне проста: інфляцыя ніжэйшая, чым прагназавалася.**

Так, у Беларусі ў структуры грашовай масы паступова павялічваецца доля нацыянальнай валюты, на ўнутраным рынку захоўваецца тэндэнцыя чыстай прапановы замежнай валюты.

Беларускі рубель карыстаецца ўзрослым попытам. Дастаткова адзначыць, што партфель інвестыцыйных крэдытаў ААТ "Банк развіцця Рэспублікі Беларусь" вырас за год больш як на 17 працэнтаў і на 1 студзеня 2017 года дасягнуў 3,7 мільярда рублёў. На фінансаванне інвестпраектаў па рэалізацыі дзяржаўных праграм і мерапрыемстваў накіравана больш за 800 мільёнаў рублёў. У выніку доля інфраструктурных праектаў дасягнула 34 працэнтаў партфеля інвестыцыйных крэдытаў банка (самыя значныя з іх адлюстраваныя ў інфаграфіцы). Сёлета Банк развіцця мае намер значна павялічыць аб'ёмы фінансавай падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Дацэнт кафедры міжнародных эканамічных адносінаў БДУ кандыдат эканамічных навук Вольга Кірвель бачыць усе ўмовы для гэтага. Тым больш у святле далейшага паніжэння стаўкі рэфінансавання:

— Паніжэнне працэнтных ставак па крэдытах для рэальнага сектара эканомікі заўсёды плюс: крэдытныя рэсурсы акажуцца таннейшыя, а таму больш даступныя. Што датычыцца насельніцтва — паніжэнне стаўкі рэфінансавання прывядзе да памяншэння і ставак па дэпазітах. Цяпер галоўнае — унутраная раўнавага эканомікі, якая вызначаецца ўзроўнямі інфляцыі, беспрацоўя і эканамічнага росту. Усё гэта павінна быць збалансаваным.

Дарэчы, з улікам ацэнкі далейшай дынамікі інфляцыі і сітуацыі ў эканоміцы Нацбанк дапускае магчымасць далейшага паступальнага паніжэння працэнтных ставак у бягучым годзе.

Максім **Восіпаў**

## Фінансаванне Банкам развіцця найбуйнейшых інвестпраектаў у краіне (млн руб)




| Праект | млн руб |
| --- | --- |
| Папаўненне парку паветраных суднаў "Белавія" | 156,4 |
| Закупка тэхнікі ААТ "Прамагралізінг" | 138,1 |
| Будаўніцтва 3-й лініі Мінскага метро | 124,6 |
| Будаўніцтва 2-й кальцавой аўтадарогі вакол Мінска | 114,2 |
| Рэканструкцыя аўтадарогі Р-23 Мінск-Мікашэвічы | 58,6 |




ПАВЕЛ ЧУЙКО

На XXI Міжнароднай выставе “СМІ ў Беларусі”

# Унушальная вага даходлівага слова

## Новыя фарматы, тэхналогіі будучыні ды шырокая геаграфія ўдзельнікаў — гэтым і не толькі здзіўляла XXI Міжнародная выстава “СМІ ў Беларусі”

Выставачны цэнтр “БелЭкспа” на чатыры дні ў пачатку мая стаў адной вялікай рэдакцыяй, у якую былі адкрыты дзверы ўсім жадаючым. Для чытачоў, слухачоў і гледачоў гэта магчымасць асабіста пагутарыць з журналістамі, за чыімі матэрыяламі яны штодня сочаць на старонках газет і ў тэлерадыёэфірах.

У выставачным павільёне на праспекце Пераможцаў, 14 у Мінску было мнагалюдна з самай раніцы: сёлета каля сотні ўдзельнікаў выказалі жаданне прыняць удзел у медыяфоруме. Гэта інфармацыйныя агенцтвы, рэдакцыі і медыйныя выдавецкія дамы. Шырокая геаграфія на выставе і замежных прадстаўнікоў.

Выставу адкрылі ўрачыста, перарэзаўшы традыцыйную чырвоную стужку. Прывітанне ўдзельнікам медыяфоруму ад Прэзідэнта зачытаў намеснік Прэм’ер-міністра Васіль Жарко. Аляксандр Лукашэнка пераканаўны, што гэтая маштабная падзея мае ў нашай краіне вялікі грамадскі рэзананс: “Штогадовая дэманстрацыя магчымасцяў нацыянальных сродкаў масавай інфармацыі пераканаўча сведчыць пра іх значны патэнцыял”.

Да гасцей і ўдзельнікаў форуму звярнулася Міністр інфармацыі Лілія Ананіч:

— Мы маем паўнавартасную нацыянальную інфармацыйную

прастору. Гэта больш за 1,6 тысячы нацыянальных друкаваных СМІ і звыш 270 тэлерадыёпраграм. Наша медыяпрастора з'яўляецца адкрытай, і гэта пацвярджае шырокая геаграфія ўдзельнікаў выставы.

Акрамя нашай краіны, у выставе прымалі ўдзел прадстаўнікі Расіі, Украіны, Азербайджана, Балгарыі, Літвы, Латвіі, Індыі, Германіі, Турцыі і Грузіі. У якасці спецыяльнага госця — СМІ Кітая. У тыя дні праходзіў прэс-тур прадстаўнікоў рэгіянальных СМІ гэтай краіны, госці наведвалі знакавыя тэхналагічныя, прамысловыя, сельскагаспадарчыя і гістарычна-культурныя аб'екты. Асаблівую ўвагу яны надаюць сумесным беларуска-кітайскім праектам. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітая Цуй Цымін падчас размовы з журналістамі адзначыў, што выстава "СМІ ў Беларусі" карыстаецца папулярнасцю ў кітайскіх медыя, якія актыўна прымаюць у ёй удзел на працягу многіх гадоў.

На самай справе, прачытаць свежы нумар газеты на выставе можна было не толькі на рускай і беларускай, але і на многіх іншых мовах. Госці разам з нашымі журналістамі праводзілі круглыя сталы, семінары і майстар-класы.

Цікавую праграму падрыхтавалі рэгіянальныя выданні. У прыватнасці, Віцебшчына здзіўляла наведвальнікаў незвычайнай выпечкай. І сапраўды, якія відовішчы без хлеба! Адным словам, што ні стэнд, то сваё маленькае шоу.

Адным з цэнтральных мерапрыемстваў выставы стала канферэнцыя "СМІ ў зменлівым свеце: прафесіяналізм і адказнасць".

Удзельнікі вялі размову пра інфармацыйную бяспеку. У прыватнасці, Лілія Ананіч прапанавала ўдзельнікам аб'яднаць намаганні дзеля бяспекі ў інтэрнэце: "Каб інтэрнэт быў бяспечным для дзяцей і грамадства ў цэлым, усе ўдзельнікі інфармацыйнай прасторы павінны аб'ядноўваць свае намаганні. Напрыклад, у фармаце грамадска-дзяржаўных партнёрстваў. Нараўне з творчымі саюзамі, рэдакцыямі СМІ ўдзельнічаць у такіх праектах маглі б правайдары і ўладальнікі інтэрнэт-рэсурсаў".

Прэс акуратна прыцiскае паперу да кубікаў з іерогліфамі. І чарговы наведвальнік выставы "СМІ ў Беларусі" далучыўся да тэхналогіі старажытнага кітайскага кнігадрукавання. Сёлета на стэндзе КНР была асабліва насычаная праграма: Паднябесная — спецыяльны госць выставы. А ўсяго на буйнейшым інфармацыйным форуме было прадстаўлена больш за 400 друкаваных СМІ, тэле- і радыёпраграм і каналаў. Тое, што выстава заваёўвае аўтарытэт, пацвердзіў на адкрыцці Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітая ў Беларусі Цуй Цымін.

А Міністр інфармацыі Лілія Ананіч нагадала, што ў краіне больш за 1,6 тысячы друкаваных СМІ і звыш 270 тэлерадыёпраграм:

— Наша медыйнае поле заўсёды павінна заставацца прафесійным, адказным, ствараць сваю краіну і падтрымліваць мірныя ўзаемаадносіны паміж дзяржавамі.

Калі б здымаць тут фільм, атрымаецца, напэўна, фэнтэзі: на стэндзе "Гомельскай праўды" — дзіўная кампанія: сакратарка ў гімнасцёрцы і чырвонай хустцы за антыкварнай пішучай машынкай, рэвалюцыйны матрос. Газета адзначае векавы юбілей — магчыма, менавіта так і выглядалі першыя яе журналісты. А вось урачыста перасоўваецца робат-трансформер, нагадваючы, што ў краіне — Год навукі. А вось там заводзяць публіку два вялізныя вогнетушыцелі: часопіс "Юный спасатель" прыдумляе новыя формы навучання правілам бяспечнага жыцця.



ПАВЕЛ ЧУЙКО

Намеснік Міністра інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч:

— Прыемна, што актыўны ўдзел у выставах прымаюць рэгіянальныя журналісты. Стэнды паказваюць, што ў кожным кутку нашай краіны ёсць цікавае мясцовае выданне. Мы рады бачыць спецыяльным госцем Кітайскую Народную Рэспубліку, прэс-тур кітайскіх журналістаў пазнаёміў іх з адметнасцямі Беларусі, а сёння яны знаёмяцца з нашымі вядучымі СМІ.

Нейкі наведвальнік усхвалявана распытваў: а дзе гэта пішуць імёны ў выглядзе іерогліфаў? Што ж, завітайце на кітайскі стэнд! Не толькі напішуць — але і дапамогуць асвоіць каліграфію!

Чэнь Вэйвэй, прэс-аташэ, саветнік пасольства КНР у Беларусі:

— У нас трывалае супрацоўніцтва з беларускімі калегамі. Мы шмат пішам пра Беларусь: нядаўна да вас прыязджалі карэспандэнты нашага цэнтральнага тэлебачання, зрабілі сюжэт пра кітайска-беларускія сем'і. Цяпер гэты сюжэт карыстаецца ў Кітаі вялікай папулярнасцю.

Сёлета беларускія дзіцячыя СМІ, а іх больш за два дзясяткі, былі прадстаўлены аб'яднаным стэндам. Тут заўсёды шумна і весела.

Намеснік галоўнага рэдактара часопіса "Вясёлка" Наталля Радзікевіч:

— Сваю прэзентацыю мы звязвалі з тэмай 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. У дзяцей ёсць нават магчымасць паспрабаваць, як працуе стары друкарскі станок.

На стэндзе Індыі наведвальнікі набіралі стосікі яркіх часопісаў.

Ом Паркаш, адміністратар пасольства Індыі ў Беларусі:

— Мы расказваем пра сваю краіну, пра культуру і прыроду розных частак Індыі. Вельмі яркая, прыгожая выстава! Я рад, што знаходжуся тут.

Уладзімір **Веліхаў**




БЕЛТА

# Пісьмы далёкай пары

Час няўмольны: усё менш засталося відавочцаў тых вогненных чатырох гадоў. Тым больш каштоўныя нясцёртыя з памяці ўспаміны. Не трэба шукаць у іх "другое дно" — асноўныя моманты для любога чалавека з цвярозым розумам застаюцца нязменнымі. А каштоўнасць перамогі над фашызмам не пераацаніць у вяках. І ўсё ж любая вайна — для кожнага свая. І нашы чытачы маюць поўнае права памятаць яе такой, якой яны яе бачылі самі.

## Выратаванне

Нашу сям'ю разам з іншымі жыхарамі полацкіх вёсак немцы вывезлі ў Латвію. Аддалі нас да мясцовага фермера. Прозвішча не запомніла, а вось знешнасць вельмі нават: тоўсты, як вяпрук, чырвоны, як рак. Хадзіў і ўвесь час гучна крахтаў. Адразу заявіў маёй 33-гадовай маці Марыі Яфімаўне: "Будзеш даіць маіх дзесяць кароў, займацца прыбіраннем памяшканняў і мыццём бялізны". Працавала яна амаль суткамі, я, як магла, дапамагала ёй. І яшчэ заўважыла, хоць і малая была, што фермер той тарашчыў вочы на маці. Але яна не адказвала гэтаму кабану ўзаемнасцю. За адно мы яму ўдзячныя — карміў ён нас дасыта.

Паміж тым быў жнівень 1944-га, фронт набліжаўся. Немцы спешна згортваліся, прыхопліваючы з сабою і эвакуяваных. Калона была доўгай і неймаверна шумнай: крычалі людзі, страшна раўлі каровы, іржалі коні, жахліва вішчалі свінні. І раптам да нас, тых, хто ішоў у хвасце калоны, падышоў пажылы нямецкі канваір. "Вашы нас могуць патапіць у Даўгаве, — сказаў ён на ламанай рускай мове. — А вы — марш у той пусты хлеў каля дарогі. Чакайце там сваіх". І прагнаў нас з калоны, змахнуўшы слязу. Дагэтуль яго ўспамінаю — калі б не ён, нас магло б не быць у жывых. А раніцай з'явіліся нашы — чалавек пяць коннай разведкі. Яны здалёк разглядалі мясцовасць у бінокль, а маці махала ім нейкай белай анучай. Коннікі, якія пад'ехалі, расказалі нам, што Беларусь вызвалена, але цалкам разбурана. Але якая ж гэта была радасць — бачыць, што Чырвоная Армія гоніць ворага з нашай зямлі. Бо ўсё астатняе — справа нажыўная.

Наталля **Уладысенка,**
Полацк

## Тайнік дзеда Стралка

У адзін з летніх дзён вайны вялікі нямецкі грузавік з салдатамі і паліцаямі ліха ўварваўся, паднімаючы клубы пылу, на наш хутар Бокаў. Раней у гэтую мядзведжую глухамань немец нават носу не паказваў, а тут на табе: амаль цэлы ўзвод прываліў, ды так, што ўвесь невялікі хутарок на дыбкі ўстаў ад нечаканасці і спалоху. Машына з ровам прамчалася міма паўтара дзясятка хат і спынілася ля хаты дзеда Стралка — пчаляра Андрэя Іванавіча Яроміна, які жыў на самым краі. Чаму яго так звалі, не ведаў ніхто, стрэльбы ў дзеда зроду не было. Затое была вялікая пасека.

Няпрошаныя госці адштурхнулі перапуджанага гаспадара і кінуліся да вулляў. Прыкладамі збілі вечкі. Патрывожаныя пчолы роем сыпанулі на візіцёраў, якія ўбачылі толькі адно: мёд выцягнуты. Немцы пару раз пальнулі па вуллях, а пасля падступілі да дзеда: “Дзе мёд?!” “Няма мёду сёлета — засуха”, — тлумачыў той, перапуджаны да смерці. Нямецкі афіцэр, які выйшаў з сябе, ухапіў Стралка за каўнер і прывалок да тоўстай ліпы, што расла каля пасекі. Прыставіў яго да ствала, сам адышоў на пару крокаў — і стрэліў у дзеда. Але той — на здзіўленне перапуджаных хутаран, якія збегліся, пачуўшы стрэлы, — не ўпаў, толькі задрыжалі яго губы і падбародак. Немцы і паліцаі даволі парагаталі і пайшлі ні з чым. А дзед працягваў стаяць каля ліпы, людзі толькіададралі яго ад ствала. Відаць, у злоснага афіцэра забіваць старога намеру не было, хацеў проста прыпужаць. Напэўна, гэта яму ўдалося: некаторы час дзед Стралок не мог не тое што хадзіць — нават гаварыць. А калі адышоў ад перажытага, хутаране засыпалі яго пытаннямі пра галоўнае: дык дзе ж усё-такі мёд? Увесь хутар жа ведаў, што на днях пчаляр выпампаваў яго шмат. “У гноі, — адказаў дзед. — У гнаявой кучы — жалезная бочка, а ў бочцы — мёд”. Выцягнуўшы на свет божы бочку з духмяным мёдам, бокаўскія хутаране балявалі ўсю ноч. Закусвалі хмельную медавуху свежымі яблыкамі — і не стамляліся дзякаваць сардэчнаму для званых гасцей і хітраму для ворагаў гаспадару. Гісторыі і цэлыя легенды пра яго доўга хадзілі па мясцовых вёсках і хутарах і пасля смерці дзеда Стралка.

Міхаіл **Патапаў,**
79 гадоў, былы машыніст помпавых установак наваполацкага завода “Палімір”, Полацк



ВАДЗІМ КАНДРАШОЎ

## Прывітанне з берагоў Нявы

Пасля Вялікай Айчыннай вайны Мінск ляжаў у літаральным сэнсе ў руінах. Мне было 3 гады, калі ў 1946-м месца ваеннай службы майго бацькі змянілі з далёкаўсходняга вострава Сахалін на мінскі ваенны гарадок Уручча. Гэты гарадок быў акружаны да канца яшчэ не размініраваным лесам, у якім хаваліся ацалелыя ўласаўцы. А на тэрыторыі часці ўтрымліваліся нямецкія ваеннапалонныя. Дык вось, у Мінску перш за ўсё аднаўлялі трактарны завод. Працоўных рук не хапала — Беларусь прыняла на сябе самы моцны ўдар вайны. На дапамогу ў аднаўленні завода штодня вазілі салдат з Уручча, якія і служылі, і працавалі. Поспехаў і вам, дарагія беларусы!

Людміла **Чумак,**
Санкт-Пецярбург

## Факты

■ **Раніцай 24 чэрвеня 1941 года пачалася першая масіраваная бамбардзіроўка Мінска, якая працягвалася ўвесь дзень. У выніку фактычна быў знішчаны ўвесь цэнтр горада.**

■ **1 студзеня 1942 года ў Маскве аднавіла работу беларускае радыё. У эфіры прагучалі першыя перадачы, якія пачыналіся словамі: “Слухай нас, беларускі народ!”**

■ **Першым з беларусаў Героем Савецкага Саюза стаў лётчык-знішчальнік Аляксей Касьяновіч Антоненка — ураджэнец вёскі Васьковічы Віцебскага раёна. Геройскае званне прысвоена яму ўжо 14 ліпеня 1941 года.**

■ **На акупаванай беларускай тэрыторыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны было сабрана ў фонд абароны краіны 15 кілаграмаў золата і каля 100 кілаграмаў серабра.**

■ **У 1945 годзе ў народную гаспадарку БССР паступіла 83 737 трафейных коней і тых, што не выкарыстоўваліся Чырвонай Арміяй.**

# Мір на зямлі — найвялікшая каштоўнасць

**Лідзіі Самасюк пайшоў сто першы год. Падчас акупацыі Мінска разам з іншымі падпольшчыцамі яна насіла партызанам ежу, вопратку, лекі. Дзяўчатам даводзілася праходзіць пешшу да 40 кіламетраў у суткі.**

Сто гадоў ёй споўнілася 27 снежня 2016 года. Дзякуючы гэтаму юбілею Лідзія Якаўлеўна стала знакамітасцю. Акрамя сваякоў, з днём нараджэння яе віншавалі журналісты, моладзь і прадстаўнікі дзяржаўнай улады, у прыватнасці Аляксей Сокал, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны. І школьнікі не раз запрашалі юбілярку да сябе на “ўрокі мужнасці”. Яшчэ б! Пагутарыць з чалавекам — носьбітам векавой гісторыі, яе “першакрыніцай” — гэта магчымасць, пагадзіцеся, унікальная. І я вырашыла яе выкарыстаць. Рыхтуючыся да сустрэчы, разважала, як далікатна пабудаваць гутарку, каб цяжкія ўспаміны пра акупацыю не засмуцілі маю будучую візаві, не азмрочылі яе перадсвяточнага настрою. Да прыкладу, мой прадзед, музыкант Міхаіл Чаркашын, ветэран Вялікай Айчыннай, вельмі не любіў гаварыць пра жахі вайны, за час якой выцягнуў з поля бою толькі каля 400 параненых…

Хвалявалася я дарэмна. Ужо на ўваходзе ў пад’езд пачула гучнае: “ахо-ао-хо!” Так Лідзія Якаўлеўна, адчыніўшы дзверы на лесвічную пляцоўку, падавала “пазыўныя”, дапамагаючы зарыентавацца, колькі прыступак мне яшчэ трэба пераадолець.




Падарунак да стагадовага юбілею з пажаданнем здароўя і даўгалецця

У яе аднапакаёвай кватэрцы светла і ўтульна. З вокнаў відаць сад, што патанае ў зеляніне, якая распускаецца. “Ціха і спакойна тут”, — сказала Лідзія Якаўлеўна. Заўважыўшы, як я кінула позірк у акно, дадала: “Вясна запазнілася сёлета. Халаднавата цяпер”. Пакуль я даставала блакнот, дыктафон, яна ўсё стаяла побач. На маё пытанне, чаму ж не садзіцца, мая аптымістычная, як потым высветлілася, суразмоўніца адказала: “Я ўжо столькі наседзелася! Вось раней….” І Лідзія Якаўлеўна, прысаджваючыся, расказала пра тое, як яшчэ нядаўна кожны год на 9 Мая хадзіла з сяброўкамі на дэманстрацыю, заўсёды спрабавала салдацкую кашу ў парку Чалюскінцаў, ускладала да сталічных помнікаў загінулым кветкі.

А цяпер, гаворыць, пастарэлі ўсе, многіх ужо няма ў жывых. Маўляў, цяжэй выбірацца на прагулкі. Затое з’явілася нагода часцей збірацца

разам са сваякамі, адзначаць дні нараджэння, Новы год, Дзень горада і, вядома ж, Дзень Перамогі…

***— Лідзія Якаўлеўна, раскажыце пра сваю сям'ю.***

— Мая маці была з Разані, а бацька — беларус, з Брэсцкай вобласці. Яго прызвалі ў армію ў 1915 або 1916 годзе, не памятаю ўжо дакладна, у Андыжан — гэта ва Узбекістане. Маці паехала за ім. Там я і нарадзілася. А ў 1925-м мы паехалі ў Мінск. Да гэтага часу ў маці з'явіліся яшчэ чатыры дочкі. Тата ўсё сыночка хацеў, паколькі іх першынцам быў хлопчык. Але ён пражыў усяго год. Так што я старэйшая. Тата адзін працаваў. Усім дачкам бацькі далі вышэйшую адукацыю.

***— Вашы малодшыя сёстры жывыя?***

— Адна я засталася. Хто ад старасці памёр, хто на вайне загінуў.

***— А замужам вы былі?***

Увогуле, мы яго гадавалі ўтрох: я і сястра з мужам. А цяпер пляменнік — мой афіцыйны апякун.

***— А пасля вайны лёс ні з кім не звёў?***

— Дык на вайне ж шмат мужчын загінула, засталіся старыя ды дзеці. А той, хто выжыў і дадому вярнуўся, не сустрэўся мне на жыццёвым шляху. Відаць, лёс такі…

***— Колькі Вам было гадоў, калі вайна пачалася?***

— Каля 25. Я тады асвойвала прафесію інжынера-будаўніка ў політэхнічным інстытуце (цяпер — Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт — Аўт.). Потым працавала ў Інстытуце архітэктуры. Была вядучым спецыялістам. Мінск да таго часу акупавалі немцы.

***— Але ж вы былі падпольшчыцай. Раскажыце.***

— Падпольную групу арганізавала Людміла Сакалова. І мы ведалі, дзе

***Ішла вайна. Мы ваявалі з фашыстамі. Гэта быў грамадзянскі абавязак кожнага — абараняць Радзіму***

— Не склалася. Я доўгі час сябравала з хлопцам, звалі яго Андрэй. Ён працаваў у Інстытуце дакладнай механікі і оптыкі (цяпер Санкт-Пецярбургскі нацыянальны даследчы ўніверсітэт інфармацыйных тэхналогій, механікі і оптыкі — Аўт.). Калі вырашылі пажаніцца, пачалася вайна. Андрэй загінуў пад Ленінградам. Так што сваіх дзяцей у мяне няма. Але я заўсёды была прывязана да свайго пляменніка Рыгора. Калі яму споўнілася 3 гады, стала для яго другой маці. Ён часта ў мяне заставаўся, падоўгу жыў.



Лідзія Самасюк з карцінай ад мінскіх школьнікаў

знаходзяцца партызаны. Хадзілі на сустрэчу па нядзелях. У гэтыя дні працавалі рынкі, на вуліцах Мінска было шматлюдна, мы маглі згубіцца ў натоўпе. Уранку сустракаліся ў парку Чалюскінцаў і атрымлівалі заданне. Звычайна ішлі купляць ежу, абменьвалі яе на бялізну для партызана, боты, лекі... Нашы ўрачы перадавалі медыкаменты і перавязачны матэрыял, здабыты па падробленых рэцэптах з нямецкага шпіталя. А потым мы адпраўляліся ў дарогу. Рукзакоў тады не было, таму заварочвалі перадачу ў прасціны, якія хавалі пад вопраткай, і замотвалі вузлом на грудзях. І абавязкова бралі яйкі, каб задобрываць імі сустрэчных немцаў, калі тыя нас спынялі. Мы ж маладыя былі: пасмяяліся, пакакетнічалі, пачаставалі і далей пайшлі. Нас і не абшуквалі. Хадзілі, як правіла, парамі, максімум па трое, каб не наклікаць на сябе падазрэння. Шлях да партызанскага атрада — дваццаць кіламетраў туды і дваццаць назад. Ногі стамляліся моцна.

***— Страшна было?***

— Вельмі страшна, асабліва калі не разумееш, пра што немцы побач з табой гавораць. Мы ж не ведалі мовы. Толькі пару слоў вывучылі. І з іх дапамогай спрабавалі даведацца, куды гэтыя немцы ідуць, навошта… Раптам за намі шпіёняць! Часам ад страху блукалі туды-сюды, сляды заміталі.

***— Але ж дапамога партызанам — справа добраахвотная…***

— Ведаеце, колькі ў нас было “баявых сяброўак”? Больш за сто чалавек. І гэта толькі ў Мінску! А яшчэ ва ўсіх абласцях былі арганізацыі. А чаму так шмат? Ды таму што ніхто і не думаў пра тое, што можна адмовіцца. Ішла вайна. Мы ваявалі з фашыстамі. Гэта быў грамадзянскі абавязак кожнага — абараняць Радзіму.

**_Я ніколі не думала пра свой узрост і вам не раю. Трэба жыць — цяпер для гэтага ёсць усе магчымасці_**



Лідзія Самасюк (злева) на “Уроку мужнасці” ў адной з мінскіх школ

***— Пасля вайны сувязь з сяброўкамі не перапынілася?***

— Клуб “Баявыя сяброўкі” распаўся толькі некалькі гадоў назад, пасля смерці Людмілы Сакаловай, яго нязменнага кіраўніка. Да гэтага мы, стаўшы ветэранамі вайны, працягвалі рэгулярна сустракацца, адзначалі разам знамянальныя даты, вучылі моладзь таму, як трэба любіць Айчыну.

***— Відаць, вы з катэгорыі тых людзей, якім адпавядае крылатая фраза “Спакой нам толькі сніцца”. Вам было амаль дзевяноста, а вы пайшлі працаваць у Саюз беларускіх жанчын. У гэта цяжка паверыць!..***

— Так, я без справы не сядзела, і ў Саюзе прарабіла амаль пятнаццаць гадоў. Перыядычна мы з членамі арганізацыі праводзілі акцыю “Міласэрнасць”: збіралі рэчы для маламаёмных. Ой, колькі народу прыходзіла!.. Трэба было з кожным пагутарыць. Мне было важна, каб ні адна жанчына, якая звярнулася да нас па дапамогу, не засталася без увагі.

***— У чым, па-вашаму, сакрэт даўгалецця?***

— Я ніколі не думала пра свой узрост і вам не раю. Трэба жыць — цяпер для гэтага ёсць усе магчымасці. Вядома, самаадчуванне ў мяне цяпер як у стагадовай бабулі, але ў душы я па-ранейшаму маладая і поўная жаданняў.

***— І якімі жаданнямі ўзбагачалася ваша душа?***

— Вельмі я любіла оперу. Раней ніводнай прэм’еры не прапускала. Мая суседка, Надзея Васільеўна, увесь час запрашала нас у Оперны тэатр, пакуль яе сын працаваў там дырэктарам. А калі Надзя памерла, у тэатр я перастала хадзіць.

***— Што вас сёння хвалюе?***

— Тое, што робіцца цяпер у свеце, мяне моцна засмучае!.. Як можна, прайшоўшы такую вайну, зноў ваяваць?! Вы, журналісты, расказвайце людзям часцей і больш пра тое, як было раней. Не трэба паўтараць жахлівых памылак! Бо мір на зямлі — найвялікшая каштоўнасць для ўсіх народаў.

**На развітанне Лідзія Якаўлеўна праспявала радок з дзіцячай жартоўнай песні. Было міла назіраць, як яна, знаходзячыся ў такім сталым узросце, падбадзёрвае сябе вясёлай песняй, павольна падымаючыся, каб праводзіць мяне да дзвярэй.**

Аліса **Красоўская**





Кветкі і рарытэтныя аўтамабілі ваенных гадоў у Цэнтральным батанічным садзе

# Кветкі ў імя жыцця

**У гарадах і вёсках па ўсёй Беларусі 9 Мая традыцыйна ўшанавалі памяць герояў і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны. Да брацкіх магіл, помнікаў і памятных знакаў, абеліскаў, манументаў у гонар Перамогі леглі сотні тысяч ярка-чырвоных цюльпанаў, гваздзікоў і руж.**

Для таго, каб у Дзень Перамогі кветак хапіла ўсім, каб святочна было на нашых вуліцах, працуюць сотні людзей. Яшчэ мінулай восенню, напрыклад, былі закуплены ў Галандыі цыбуліны цюльпанаў. Іх высаджвалі да надыходу маразоў супрацоўнікі "Мінскзелянбуда" — і вось яны дружна распусціліся на клумбах уздоўж галоўных вуліц Мінска, нягледзячы на запазнелую вясну. Цікава, а адкуль узяліся ўсе гэтыя прыгожыя ружы, бягоніі, віёлы, петуніі, іншыя віды кветак, якія мы бачым у святочныя дні? Аказваецца, у Мінскім парнікова-цяплічным камбінаце пад іх адведзены немалыя плошчы — больш за паўтара гектара, і там кветкі растуць круглы год… Як патлумачылі нам спецыялісты камбіната, менавіта з іх — асабліва ўрачыста і святочна глядзяцца вялікія чырвоныя ружы — майстры-фларысты зрабілі да Дня Перамогі прыгожыя кампазіцыі як у выглядзе вянкоў, так і карзін. "З падобнымі заказамі ў цяплічную гаспадарку напярэдадні свята звярнуліся многія дзяржаўныя арганізацыі, — гаворыць Андрэй Гумінскі, намеснік генеральнага дырэктара камбіната па вытворчасці. — Акрамя таго, для святкавання Дня Перамогі былі зрэзаны ружы з вялікіх участкаў".

Мінчане і госці сталіцы любуюцца разнастайнымі кветкамі ўжо з першых майскіх дзён: па Мінску было высаджана больш як 300 тысяч кветак. А да сярэдзіны лета іх стане амаль два мільёны — горад будзе патанаць у кветках.

Актыўна ўдзельнічаюць ва ўпрыгожанні Мінска, краіны ў цэлым і навукоўцы Нацыянальнай акадэміі навук. Напрыклад, у Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі, што побач з мінскім праспектам Незалежнасці, кожны год тысячы людзей прыходзяць палюбавацца, як цвітуць сотні відаў бэзу. Там ёсць спецыяльны сад бэзу. А на другім участку можна ўбачыць незабыўнае відовішча: цвіценне больш як 300 гатункаў цюльпанаў. Гэтую калекцыю называюць нацыянальным здабыткам Беларусі. У некаторых мінскіх сем'яў гэта ўжо традыцыя: усім разам, ад малога да вялікага, прыходзяць палюбавацца цюльпанамі якраз 9 Мая. А яшчэ сёлета ў квітнеючым Батанічным садзе ў Дзень Перамогі — свята так і называлася: "Квітнеючы сад Перамогі" — варылі салдацкую кашу і частавалі ёю ўсіх жадаючых. Гучала музыка ваенных гадоў… І кожнаму, хто хацеў, можна было пасядзець за рулём рарытэтных ваенных аўтамабіляў і матацыклаў. Больш за ўсё радасці такі "рэтра-атракцыён" прынёс, вядома, дзецям. А фларысты вучылі дарослых ствараць букеты "з ваеннай тэматыкай" з вясновых кветак.

Аліна **Гюнгер**

**У Гродне турфірмы імкліва пераключаюцца на ўязны турызм. Не варта тлумачыць, што прычына такой актыўнасці прадпрымальнікаў хаваецца ва ўстанаўленні бязвізавага рэжыму. Турыст, што называецца, пайшоў. Па выхадных днях аўтобусы з замежнымі нумарамі сталі прывычным атрыбутам у беларускім прыгранічным горадзе.**




# Вандроўка пакідае ўражанне

Суботнім ранкам на невялікай пляцоўцы каля гродзенскай сінагогі пачынаюць паркавацца аўтобусы з літоўскімі нумарамі. У адным з іх прыехала вялікая група турыстаў з экскурсаводам Рэнатасам Якубайтэсам. Ён працуе ў рыжскім філіяле турфірмы “Інтэрмакс” і да нас прывозіць жыхароў Літвы не ў першы раз:

— Сёння група падабралася больш дарослая, таму яны з задавальненнем слухаюць мае аповеды пра гістарычныя падзеі, якія аб’ядноўваюць нашы народы, — тлумачыць Рэнатас. — Маладыя звычайна не слухаюць, таму што не ведаюць рускай мовы. Але ўсім вельмі падабаюцца вашы цэны. Купляюць трыкатаж, лекі, сувеніры, цукеркі і многае іншае. У рэстаранах і кафэ таксама цэны значна ніжэйшыя, чым, да прыкладу, у Вільнюсе.

Адна з турыстак Рыма Семашкеня прыехала з Вільнюса з дачкой Катарынай. Паездкай яна вельмі задаволена:

— Была ў Беларусі амаль 20 гадоў назад. Засталіся толькі адрывачныя ўспаміны. Даўно хацелася прыехаць, і з адменай віз такая магчымасць з’явілася. Гіды вельмі цікавыя — і беларускі, і літоўскі. Нават мытнікі вясёлыя былі, хоць нас палохалі, што будуць трэсці. Купіла пуцёўку на дваіх за 40 еўра яшчэ ўзімку. Зайшлі вось да вас у рэстаран, выпілі кавы за адзін еўра. А ў нас танней за 2 і не знойдзеш, напэўна, нідзе.

Дырэктар гродзенскай турфірмы “СонНікТур” Павел Шабейкін пачаў займацца ўязным турызмам адначасова з увядзеннем бязвізавага рэжыму. І адразу трапіў у яблычак.

— Пакуль мы лідзіруем па колькасці прывезеных турыстаў, — прызнаецца малады дырэктар. — Вельмі добра памятаю першых нашых гасцей з літоўскай Клайпеды. Гэта былі індывідуальныя турысты. З тых

часоў у нас пабывалі падарожнікі з Японіі, Кітая, Іспаніі, Латвіі, Польшчы, Нідэрландаў ды іншых краін. У адзін з уік-эндаў мы прывезлі адразу пяць аўтобусаў з літоўскімі турыстамі. Актыўна супрацоўнічаем з літоўскімі і латвійскімі тураператарамі. Абавязкова возім гасцей на Аўгустоўскі канал, каб у іх была магчымасць параўнаць убачанае з тым, што будзе адбывацца на папулярных шлюзах у летні перыяд. Потым — аглядная экскурсія па горадзе. Дарэчы, раней кармілі ўсіх арганізавана, але апошнім часам большасць аддае перавагу харчавацца самастойна. Гэта гаворыць пра тое, што літоўскія грамадзяне пачынаюць асвойвацца ў Гродне. Ведаюць, куды пайсці і дзе ім больш падабаецца. Найбольш запатрабаваны шопінг па нашых беларускіх магазінах. Што там купляюць? Звычайна абутак, бялізну, пасцельныя рэчы, шакалад, алкаголь. На завяршальным этапе мы прывозім аўтобусы ў буйнейшы гандлёвы цэнтр горада “ОлдСіці”, дзе даём дзве гадзіны на закупку прадуктаў. Незадаволеным ад нас яшчэ ніхто не ад’язджаў.

Турфірма “Зет” на чале з Сяргеем Якшэвічам упершыню пачала прывозіць замежных гасцей яшчэ ў далёкім 1991 годзе. Была адной з першых. Вазілі ўкраінцаў, расіян, палякаў. Апошнія 8-10 гадоў спецыялізаваліся ў асноўным на турыстах з Польшчы. Паводле слоў Сяргея, палякі — вельмі спецыфічныя госці ў плане арганізацыі адпачынку. Большасць хоча, каб па 6-8 гадзін у дзень для іх праводзілі экскурсіі. Іх цікавіць усё, што так ці інакш звязана з польскай гісторыяй і знакамітымі землякамі, літаратарамі, музыкантамі, грамадскімі дзеячамі, такімі як Эліза Ажэшка, Чэслаў Немэн, Тадэвуш Касцюшка. Гэта так званы “сентыментальны турызм”. Сёлета да палякаў далучыліся літоўцы.

— З пачатку бязвізавага ўезду мы прывезлі нямала турыстаў. Многае змянілася. З’явіліся назвы вуліц, паказальнікі на замежных мовах, адкрываюцца крамы з сувеніркай, — гаворыць Сяргей Якшэвіч. — На мой погляд, не хапае падзейных мерапрыемстваў у горадзе. Вось калі б кожную суботу арганізоўвалі нейкі невялікі фэст, каб гучала музыка, якая стварае настрой, было б вельмі здорава.

Уладальнік турыстычнай кампаніі запэўнівае: гаварыць пра тое, што ўсіх прыезджых літоўцаў і палякаў пагалоўна цікавіць толькі шопінг, нельга. Нядаўна, да прыкладу, была ў яго група, якую зусім не цікавіла бярозаўскае шкло, абутак “Марка” ці бялізна “Мілавіца”. Ды і школьныя групы таксама цікавяцца зусім не справамі надзённымі. Нядаўна вось у мясцовым  Музеі гісторыі рэлігіі была выстава старажытных веласіпедаў — дзеці былі ў захапленні.

Намеснік начальніка ўпраўлення спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама Таццяна Лідзяева пацвярджае, што за апошні час многае змянілася ў плане турыстычнай прывабнасці бязвізавай зоны:

— Раней турыстычным фірмам займацца ўязным турызмам было нявыгадна. Значна прасцей было адправіць кліента на выезд і зарабіць гарантаваныя грошы. Цяпер сітуацыя змянілася ў корані. Жадаючых працаваць у гэтым сегменце значна пабольшала. Тураператары сталі самі актыўна прапаноўваць наш прадукт замежным партнёрам. Яны расказваюць пра перавагі падарожжаў без візы і рэкламуюць Гродзеншчыну ў блізкім і далёкім замежжы. Яшчэ некалькі месяцаў назад там гаварылі: “Ну што ў вас там у Гродне можна рабіць цэлы дзень?” Аказалася, ёсць што.

Таццяна Лідзяева лічыць: галоўнае, што турысты хутка зразумелі і адчулі выгаду. Паездка без афармлення візы атрымліваецца зусім недарагой. Ну хто адмовіцца з’ездзіць у Гродна за 20-25 долараў? Пры гэтым паесці, пагуляць і вярнуцца дадому без усякай чаргі на мяжы. З’явіліся фірмы, якія пачалі займацца медыцынскім турызмам. Запатрабавана стаматалогія, касметалогія ды іншыя дарагія ў еўрапейскіх краінах паслугі.

Толькі за тры першыя месяцы года колькасць замежных гасцей, якія наведалі Гродна і Гродзенскі раён без візы, перавысіла за 7 тысяч. Многа гэта ці мала? Гледзячы з чым параўноўваць. Наперадзе летні сезон. Але ці стане ён паказальным? Улічваючы, што многія “наеліся” паездкамі ў Турцыю і Егіпет, на станоўчы вынік цалкам можна разлічваць. Спецыялісты гавораць: каб адчуць маштаб бязвізавых перамен, спатрэбіцца не менш як год.

Але ўжо першыя вынікі бязвізавага рэжыму гавораць, што праект аказаўся ўдалым.

Таццяна **Кандрацьева**



ВІТАЛІЙ ПІВАВАРЧЫК



Спаса-Праабражэнская царква

# Годныя сусветнага прызнання

## Беларускія помнікі архітэктуры могуць папоўніць спіс ЮНЕСКА

**Пра тое, што чатыры матэрыяльныя аб'екты Беларусі занесены ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, ведае, напэўна, любы школьнік. І не толькі ведае, але і ганарыцца гэтым. Прыемна ўсведамляць, што ты жывеш побач з помнікамі, пастаўленымі ў адзін шэраг з парыжскай Эйфелевай вежай, рымскім Пантэонам ці афінскім Акропалем. Гэта значыць, што сусветная супольнасць прызнала аўтэнтычнасць і ўнікальнасць (а гэта два асноўныя прынцыпы пападання ў прэстыжны спіс) Белавежскай пушчы, Мірскага замка, Нясвіжскага палацава-паркавага комплексу і геадэзічнай Дугі Струвэ. Не дзіўна, што пасля набыцця статусу аб'екта сусветнай спадчыны ЮНЕСКА да іх больш пацягнуліся турысты. У папярэднім Спісе сусветнай спадчыны ЮНЕСКА — яшчэ пяць намінантаў ад Беларусі. Дасье па іх плануецца падрыхтаваць і ўнесці на разгляд міжнародных экспертаў Цэнтра сусветнай спадчыны ў Парыжы да 2020 года. Але навошта чакаць, калі гэтыя аб'екты можна наведаць ужо цяпер? Бо годнымі ўвагі помнікі робіць не статус ЮНЕСКА, а іх гісторыя і непаўторнасць.**

### Куток духоўнасці

Набліжаючыся да тэрыторыі Спаса-Еўфрасіннеўскага жаночага манастыра, дзе сярод іншых храмаў знаходзіцца і Спаса-Праабражэнская царква, будзьце гатовыя, што спачатку ў вас "перамкне" дыханне — ад прыгажосці, стройнага песнапення і проста вялікай канцэнтрацыі духоўнасці. Перш чым патрапіць у Спаса-Праабражэнскую царкву, зайдзіце ў цэнтральны Крыжа-Узвіжанскі сабор. Тут сярод золата і срэбра, свечак і абразоў у багата ўпрыгожанай рацы знаходзяцца мошчы заснавальніцы манастыра святой Еўфрасінні Полацкай, якія застаюцца нятленнымі праз дзевяць стагоддзяў.

Затым можаце прайсці і ў Спаса-Праабражэнскую царкву — такую маленькую ў параўнанні з сучаснымі храмамі і такую вялікую адначасова. Дзіўна, што гэтая царква была ўзведзена яшчэ пры жыцці Еўфрасінні. Як сведчаць падручнікі — у 1161 годзе, як гавораць нядаўнія даследаванні супрацоўнікаў Эрмітажа — паміж 1127 і 1135 гадамі. Нават нягледзячы на перабудовы перыяду класіцызму, храм з'яўляецца помнікам старажытнаполацкага дойлідства, які захаваўся найлепшым чынам. Самая галоўная яго каштоўнасць — старадаўні фрэскавы роспіс, які пакрывае сцены храма. Тут і цяпер вядуцца работы па раскрыцці фрэсак, таму ўсё памяшканне храма ў рыштаваннях. Але гэта не перашкаджае разгледзець лікі святых, якія глядзяць на вас са столі, сцен, аркі... Складана паверыць, што гэта позірк з XII стагоддзя! Ёсць тут і выява святой Еўфрасінні Полацкай, цалкам магчыма, напісаная пры жыцці прападобнай: атрымліваецца, людзі лічылі яе святой яшчэ да смерці.



КАЦЯРЫНА ЧАРОЎСКАЯ

Барысаглебская царква ў Гродне як прыклад гарадзенскай архітэктурнай школы

## Сцены, якія “размаўляюць”

Нават калі вы не раз чыталі пра Каложскую царкву, разглядалі яе на фотаздымках і чулі пра яе ад знаёмых, яе трэба ўбачыць увачавідкі. У Гродне наогул ёсць што паглядзець, нездарма яго называюць Каралеўскім горадам. І Каложа — адна з галоўных яго візітовак. Такая моцная, трывалая, устойлівая і ў той жа час уразлівая — дзіўна, як гэты храм стаіць на стромкім беразе Нёмана з XII стагоддзя. У 1853 годзе ён ужо пацярпеў ад апоўзня, цалкам страціўшы паўднёвую каменную сцяну, якая была заменена на драўляную. Сёлета плануецца правесці капітальны рамонт Каложскай царквы.

Храм з’яўляецца адзіным захаваным да нашых дзён прыкладам гарадзенскай архітэктурнай школы. Сярод яго асаблівасцяў — выкарыстанне ў сценах вялізных камянёў, магчыма, са старажытнага язычніцкага капішча, на якім пабудавана царква, і паліванай керамічнай пліткі ў выглядзе крыжоў рознага колеру — аліўкава-зялёных, карычневых, вясёлкавых. Яшчэ адна адметнасць царквы — убудаваныя ўнутры сцен сасуды-галаснікі, якія адначасова ўзмацняюць акустыку ў храме і паляпшаюць канструкцыю царквы. Ды і сама кампазіцыя — круглыя слупы — рэдкая для праваслаўных храмаў.


БЕЛТА
На Аўгустоўскім канале

## Рай для байдарачнікаў

Калі хочацца адначасова палюбавацца прыродай, натхніцца архітэктурай, а яшчэ і актыўна адпачыць з сябрамі або сям’ёй, смела дадавайце гэты аб’ект у спіс абавязковых для наведвання. Аўгустоўскі канал — не проста водная артэрыя, якая злучае басейны некалькіх рэк. Гэта ўнікальны помнік інжынернай думкі і матэрыяльнай культуры, пабудаваны ў 1824-1839 гадах, а сёння яшчэ і цэлы турысцка-рэкрэацыйны парк плошчай большай за 5,5 тысячы гектараў. У свеце існуе ўсяго тры такія каналы: Каледонскі ў Вялікабрытаніі, канал Гота ў Швецыі і наш Аўгустоўскі, размешчаны на тэрыторыі Беларусі і Польшчы.

Канал хоць і будаваўся як важная транспартная артэрыя для сплаву драўніны і тавараў, з гэтай мэтай праслужыў нядоўга. Затое, пралягаючы па найпрыгажэйшых месцах, хутка ператварыўся ў своеасаблівую турыстычную Мекку: яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя тут развіваўся байдарачны турызм, працавалі яхт-клубы, праходзіла грандыёзнае “Свята мора”. Ёсць чым заняцца тут і сёння, асабліва пасля глабальнай рэстаўрацыі канала ў 2004-2006 гадах. Турыстам прапаноўваюць прагулкі на цеплаходзе і катанне на катарах, сплавы на байдарках, пешыя і веласіпедныя прагулкі. Акрамя таго, канал пралягае па тэрыторыі рэспубліканскага ландшафтнага заказніка “Гродзенская пушча” — аднаго з самых экалагічна чыстых месцаў у Беларусі.

Людміла **Мінкевіч**



### На адмысловым рахунку

- **На пападанне ў прэстыжны спіс як культавыя пабудовы абарончага тыпу прэтэндуюць Свята-Міхайлаўская царква ў вёсцы Сынковічы Зэльвенскага раёна, царква Нараджэння Прасвятой Багародзіцы ў вёсцы Мураванка Шчучынскага раёна і касцёл Святога Іаана Хрысціцеля ў вёсцы Камаі Пастаўскага раёна. Гэтыя аб’екты — жывы доказ таго, што Беларусь неаднаразова станавілася арэнай самых жорсткіх войнаў. Таму нават храмы будаваліся ў выглядзе крэпасцяў.**
- **Да 2020 года плануецца падрыхтаваць дасье “Культавае драўлянае дойлідства XVI-XIX стагоддзяў на тэрыторыі Беларусі, Украіны і Польшчы”. Разам з храмамі краін-суседак у Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА могуць патрапіць такія беларускія культавыя пабудовы, як Свята-Мікіцкая царква ў Здзітава Бярозаўскага раёна і Спаса-Праабражэнская царква ў Хмелева Жабінкаўскага раёна. Пабудаваныя з далікатнага ўразлівага матэрыялу, яны змаглі пераадолець і час, і непагадзь, і дзясяткі гістарычных падзей.**



# Людзі на балоце

## Наш карэспандэнт здзейсніў экстрэмальную вылазку на Альманскія балоты, што на поўдні Беларусі

Каму прыйдзе ў галаву правесці адпачынак… на балоце? Ёсць такія. Паход на дрыгву — турызм на аматара. Спачатку трэба выбраць добрыя боты, набыць тапаграфічную карту. Тая яшчэ рамантыка…

### З посахам па Дрыгве

У Беларусі балоты займаюць амаль 15 працэнтаў плошчы. Да гэтых багністых месцаў людзі ставяцца з павагай. У вайну дрыгва служыла хованкай ад ворагаў. Цяпер корміць журавінамі, а месцамі — марошкай. Мы адправіліся на Альманскія балоты ўпяцёх. Хадзілі тры з паловай дні.

— Дзікія месцы, аднаму туды лепш не совацца, — папярэдзіў дасведчаны “балатаходзец”. Мясцовыя жыхары запэўніваюць, што за многія гады багна нікога не засмактала. Калі ўсё рабіць разумна, НЗ малаверагоднае. Трэба падабраць сабе доўгі посах — ім правяраеш паверхню наперадзе сябе, перш чым ступіць. Ісці так вельмі цяжка. Глеба калыхаецца пад нагамі, “чмякаеш” па гразевай жыжцы. Дапамагаюць гаці — выкладзенае бярвенне. Праўда, увосень яно занадта слізкае. Аднойчы нам сустрэўся якасна вымашчаны шлях. Можа, гэта рэшткі камунікацый адной з сяліб, якія там былі да хрушчоўскіх часоў? Іншым разам на дрэвах трапляюцца борці — старажытныя вуллі. Вясковы люд дагэтуль збірае з іх мёд.

### Пачым журавіны?

Адзін з удзельнікаў паходу — турыст Дыгер — расказваў, што аднойчы ўмудрыўся паставіць па-

латку прама на балоце. Мы вырашылі начаваць на астравах. Месца шукалі з доступам да вады — яна ёсць у калодзежах, якія выкопваюць зборшчыкі журавін бліжэй да сваіх буданоў. Яны тут тыднямі жывуць, збіраючы журавіны. Ураджай складаюць у негерметычныя мяшкі і... топяць. Вада і холад дапамагаюць захаваць прадукт. Потым яго забіраюць і прадаюць скупшчыкам.

— Пачым журавіны? — пытаю ў мясцовага жыхара.

— Было амаль па тры беларускія рублі за кілаграм. У канцы сезона ўжо па 2,5 рубля, — разводзіць рукамі мужчына. Каб зарабіць, трэба сабраць пад сотню кілаграмаў, не менш.

Сезон звычайна пачынаецца ў верасні і працягваецца да снегу. Збору часам перашкаджаюць пажары. Мы бачылі сям-там, як пагуляла вогненная стыхія. Дрэўцы стаяць чорнымі палкамі. Ягад там мала.

## Святое возера

Непадалёк ад Альман выходзім да возера Вялікае Засомінае. Бераг забалочаны, але сюды з вёскі пракладзены насціл. Заходзім на невялікую аглядную вышку, ля берага — альтанка. Там добра перакусіць, палюбавацца возерам. Веруючы чалавек паклоніцца крыжам, якія стаяць ля вадаёма, — возера здаўна лічаць святым. Па адной з легенд, тут некалі ўтапілася дачка князя, якой не дазволілі выйсці замуж за каханага. Пасля трагедыі бацька загадаў асвяціць возера і ўстанавіць крыжы.

У саміх Альманах ёсць старажытная царква XIX стагоддзя — пасля вайны захаваўся храм і дом святара. Немцы спалілі ўсё ў акрузе, жыхароў сагналі ў лагеры. Толькі некаторым удалося ратавацца ў балотах.

Улетку балота — гэта сырасць, спякота, камары. Увосень — сырасць асаблівая, каварная, прахалодная, пранізлівая. Навошта ж хадзіць сюды па сваёй волі? Адказ мой просты: каб выпрабаваць сябе, мысленна прымерыць значок “За пакарэнне багны”. Хіба не крута пабываць там, дзе не ходзіць большасць? Адкрыць для сябе нязведаны свет прыроды і чалавечых магчымасцяў.

Васіль **Малашанкаў**



# Турухтаны зрабілі перадышку на Прыпяці

**Такой колькасці чырванакніжных птушак адначасова ў краіне, напэўна, яшчэ не бачылі. Адразу 120 тысяч турухтанаў (кожная дваццатая асобіна з усёй сусветнай папуляцыі!) — стройных цыбатых кулікоў — праводзяць гэтую вясну на Беларускім Палессі.**

Паводле слоў арнітолагаў, на Тураўскім лузе, які, па еўрапейскіх мерках, лічыцца асноўным транзітным пунктам для пералётных птушак, яны прабудуць каля месяца.

— Турухтаны ляцяць з Афрыкі, з месцаў зімовак, у тундры Еўразіі, — тлумачыць дырэктар Беларускага цэнтра кальцавання птушак, старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі арніталогіі НПЦ Акадэміі навук па біярэсурсах Павел Пінчук. — Як паказваюць дадзеныя кальцавання, гэтыя птушкі гняздуюцца ад Скандынавіі да Якуціі. Міграцыя для птушак — час цяжкі, таму такія прыпынкі вельмі важныя. Для таго, скажам, каб набраць вагу. Інакш птушка да месца прызначэння проста не даляціць.

Пойма Прыпяці для падобнай перадышкі падыходзіць як мага лепш. Таму вельмі важна захаваць яе ў нязменным выглядзе. Бо тут гняздуюцца і іншыя чырванакніжнікі — вялікі вераценнік, дупель, гальштучнік, кулік-сарока, марадунка, паручайнік, шылахвостка...

Дзмітрый **Умпіровіч**

### Даведка

■ **Тураўскі луг — адно з важнейшых месцаў у Еўропе для гнездавання і прыпынку падчас міграцый больш як 50 відаў водна-балотных птушак. Тураўскі луг мае статус тэрыторыі, важнай для птушак міжнароднага значэння, і з 2008 года з’яўляецца біялагічным заказнікам мясцовага значэння. Падчас міграцыі часам у адзін дзень тут можна ўбачыць больш за 120 000 турухтанаў, 150 000 свіязяў і 20 000 вялікіх вераценнікаў. У сакавіку 2014 года арнітолагі ўсталявалі на Тураўскім лузе абсалютны рэкорд улічаных птушак. На 1 квадратным кіламетры заказніка спецыялісты налічылі 200 тысяч птушак! Гэта максімальнае значэнне за ўвесь перыяд назіранняў, пачынаючы з 1994 года. Да гэтага нідзе ў Беларусі не была зафіксавана такая колькасць пералётных птушак.**









# Месцы, багатыя на гісторыю

## Пяць прычын наведаць Смаргонь

### Пабываць у Паўночных Афінах Агінскага

**1** У Смаргоні ведалі столькі вядомых гістарычных асоб, быццам гэта не сціплы райцэнтр Беларусі, а які-небудзь Парыж. У чэрвені 1655 года тут размяшчалася стаўка цара Аляксея Міхайлавіча падчас яго паходу на Вільню. У гады Паўночнай вайны спыняліся Пётр Першы і Карл XII. Узімку 1812 года ў горадзе размяшчаўся штаб Кутузава. А да гэтага суровым снежаньскім днём менавіта тут Напалеон перадаў камандаванне рэшткамі Вялікай арміі маршалу Мюрату і адбыў дадому.

Будынкі, дзе кватаравалі Пётр Першы, Кутузаў і Напалеон, не захаваліся. Затое выстаяў маёнтак Міхала Клеафаса Агінскага, аўтара знакамітага паланэза “Развітанне з радзімай”. “Залессе”, у якім ён пражыў дваццаць гадоў, госці называлі Паўночнымі Афінамі. Да 250-годдзя вялікага земляка маёнтак адрэстаўравалі, ён набыў ранейшую пышнасць.

Каб зразумець нацыянальны характар, прыязджайце ў Кушляны. У сядзібу аднаго з заснавальнікаў беларускай літаратуры Францішка Багушэвіча. У доме аўтара бессмяротнай “Дудкі беларускай” знаходзіцца літаратурна-мемарыяльны музей.

### Выведаць сакрэты мядзведжай акадэміі



АЛЯКСАНДР СТАДУБ

**2** Як на кірмашы без скамарохаў і мядзведзяў! Але хто і дзе вучыў касалапых танцаваць “Барыню”? “Мядзведжая акадэмія” з’явілася ў Смаргоні больш за тры стагоддзі назад. У пачатку XVII стагоддзя ў горадзе была нават вуліца Мядзведская. Кіраваў акадэміяй для касалапых барон літоўскіх цыган Ян Марцінкевіч.

Дрэсіравалі адначасова да дзесяці касалапых і некалькіх малп. Звярынец размяшчаўся на тэрыторыі сучаснай раённай бальніцы. Мішку заганялі ў клетку з медным дном, пад якой разводзілі агонь. Метал награваўся, звер пераступаў з нагі на нагу, настаўнік пачынаў іграць на дудцы або біць у бубен. Касалапыя “ўрокі” засвойвалі хутка…

“Акадэмія” была такая знакамітая, што мядзведзь стаў сімвалам горада і “пасяліўся” на гербе. Нядаўна з’явіўся помнік мішку, які танцуе, і скамарохам. Гэта любімае месца для сэлфі.



БЕЛТА



Смаргонская мазаіка

## Дакрануцца да сівой даўніны

**3** По дарозе ў Смаргонь міма Крэва не праедзеце. Мястэчка побач з райцэнтрам знакамітае руінамі замка часоў Вялікага Княства Літоўскага — першай каменнай крэпасцю на беларускіх землях. У скляпах Каралеўскай вежы разыграліся падзеі, упісаныя ў сусветную гісторыю: па загадзе Вялікага князя Ягайлы задушаны галоўны прэтэндэнт на княжацкі пасад — яго родны дзядзька князь Кейстут. Тут, у Крэўскім замку, Ягайла падпісаў вядомую унію па аб'яднанні ВКЛ і Польшчы ў супрацьстаянні крыжакам.

Думаеце, што Керанскі, які ўцякаў сто гадоў назад з Зімовага палаца ў жаночай сукенцы, арыгінальны? Адным з першых гэты трук выканаў сын Кейстута — будучы Вялікі князь Вітаўт. З крэўскага палону ён уцёк у сукенцы служанкі жонкі.

У Крэве ад праследаванняў Івана Грознага ратаваўся палкаводзец Андрэй Курбскі. І напісаў свае знакамітыя лісты маскоўскаму самадзержцу.

Свае прывіды таксама ёсць. Уначы раз-пораз бачаць даму з сабачкай. Няшчасная адхіліла дамаганні князя, і ён загадаў замураваць яе жывой у сцяну. Красуня нікалі не расставалася са сваім сабакам, ён зазнаў страшную долю з гаспадыняй. Некалькі дзён уся акруга слухала стогны і выццё.

## Даведацца, дзе ваявалі Зошчанка і Катаеў

**4** У Першую сусветную лінія руска-германскага фронту праходзіла праз горад. Тут немцы правялі першую газавую атаку супраць рускай арміі. Тады моцна пацярпеў штабс-капітан 16-га Мінгрэльскага грэнадзёрскага палка, "Грэнадзёр сумнага вобраза" Міхаіл Зошчанка. Да 100-годдзя Першай сусветнай на сродкі саюзнага бюджэту пабудавалі мемарыял у памяць аб героях і ахвярах вайны.

Пра Марыю Бачкарову нядаўна зняты мастацкі фільм. Жаночыя батальёны смерці, сфарміраваныя ў Расіі ў 1917-м, удзельнічалі ў баявых дзеяннях толькі аднойчы — якраз пад Крэвам. Яшчэ тут ваявалі пісьменнік Валянцін Катаеў, будучыя маршалы Барыс Шапашнікаў і Раман Маліноўскі. У ваенным шпіталі параненых даглядала дачка Льва Талстога — Аляксандра.

За тры гады баёў Смаргонь ператварылася ў пустыню з барханамі з бітай цэглы. У газетах яе называлі "мёртвым горадам". Вакол захаваліся дзясяткі бетонных дотаў і дзотаў.

## З'есці сапраўдныя абаранкі

**5** Лічыцца, што менавіта тут і з'явіліся першыя абаранкі. Ужо пазней іх сталі пасыпаць цукрам, дадаваць мёд і мак. Спачатку замешвалі крутое цеста з мукі і вады. Варылі не кругляні, а палоскі ў кіпячай вадзе, якія потым сушылі. Смаргонскія абаранкі канкурыравалі нават з маскоўскімі — іх прадавалі ў Пецярбурзе, Варшаве і нават у Парыжы.

Герман **Маскаленка**

## Дарэчы

**■ Шмат цікавага захоўвае гісторыя зямлі смаргонскай. Са Смаргоншчынай звязаны імёны такіх вядомых у Беларусі і за яе межамі людзей, як кампазітар Міхал Клеафас Агінскі, паэт Францішак Багушэвіч, музыкант Віктар Роўда.**

**■ Сёння Смаргоншчына — квітнеючы індустрыяльны рэгіён з развітой сельскай гаспадаркай, слаўнай гісторыяй, цудоўнай прыродай і ветлівымі, гасціннымі людзьмі.**

Аксана Кірылюк:

# "Жадаеце свежасці — я выкую вам вецер..."



Аксана дабудоўвае майстэрню мары з празрыстымі сценамі

УЛАДЗІМІР ШЛАПАК

## Адзіная ў Беларусі жанчына-каваль жыве ў Маладзечне



Хто сказаў, што жалеза не цвіце?

У руках Аксаны Кірылюк жалеза ператвараецца... у кветкі. Дзесяць гадоў назад яна выбрала сабе вельмі незвычайнае для дзяўчыны рамяство.

### Каваль свайго шчасця

У ачагу палае агонь. Вось толькі гаспадыня ставіць на яго не гаршчок з пачастункам, на вуголле цяжка падае кавалак металу. У майстэрні "Мядзведжы кут" не чуваць пахаў кухні, з раніцы да позняй ночы стукае молат па кавадле.

Пра што мараць дзяўчаты? Пра прынцаў, пра тое, што стануць актрысамі, будуць спяваць і танцаваць на сцэне або стануць узорнымі гаспадынямі. Аксана ў садку таксама марыла пра караблі з пунсовымі ветразямі. У школе колер ветразяў ужо перастаў мець значэнне, вырашыла стаць марскім штурманам — старанна канспектавала кнігі па караблебудаванні, строіла планы на калінінградскую мараходку. Потым захапілася замежнымі мовамі, самастойна вывучыла нямецкую і вырашыла заняцца перакладам навуковай літаратуры. Пасля доўгіх роздумаў паступіла ў Інстытут кіравання і скончыла факультэт міжнародных эканамічных адносін.

— Зноў аказалася не маё. Было вельмі сумна. Грошы ёсць, задавальнення ад работы няма, — расказала Аксана.

Заўсёды любіла танцаваць. Растанцавалася так, што стварыла ў Маладзечне сваю школу бальных танцаў пад назвай "Каскад". Яна і цяпер працуе пры Палацы культуры. Заадно і школу верхавой язды арганізавала.

— Каля двух гадоў займалася гэтым відам спорту, пачала вывучаць іпалогію. Мала хто задумваецца пра сутнасць верхавой язды. Для жывёл гэта сапраўднае мучэнне! І я беспаваротна пакінула гэты занятак. Хоць працягваю трымаць сваіх коней: Галубіку, Геральдыку, Говардзі і Гетэборга.

## Шоу за шклом

Вось тут і пачалася кавальская гісторыя. Коням патрэбна была стайня. Патрабаваліся зварачныя работы, на якія зусім не хапала грошай. Аксана не стала гараваць, пайшла і… вывучылася на заршчыка.

— На практыцы ў чыгуначным дэпо трапіла ў кузню. І зразумела: вось яно! Тут можна рэалізоўваць сябе як мастака, ствараць нешта рукамі, знаходзіцца ў пастаянным кантакце з сапраўдным — агнём, вадой, жалезам ці дрэвам.

Цяпер Аксана заканчвае будаваць сваю кузню. Сцены ў ёй будуць празрыстыя. Каб было відаць, як побач гуляюць коні.

— Мне падабаецца, калі яны топчуцца каля мяне падчас работы і заглядаюць на агеньчык, — прызналася дзяўчына.

У слова "каваль" нават варыянтаў жаночага роду няма, толькі мужчынскі. Але справа ў жаночых руках яшчэ як куецца! За дзесяць гадоў Аксана стварыла сотні ўнікальных скульптур, лесвіц, агародж, арак, люстр, кветак і прадметаў інтэр'ера.

— Работа нялёгкая — гэта факт. Але што выключна мужчынская — стэрэатып. Прафесія шкодная і для жанчын, і для мужчын. Агрэсіўнае асяроддзе і агонь сушаць скуру. З-за таго, што ты ўвесь час у прыцемку глядзіш на белае распаленае жалеза, садзіцца зрок. Ідзе нагрузка на пазваночнік: вырабы цяжкія, — тлумачыць Аксана. — Але самае важнае, што праца — у задавальненне.

## Метал павінен дыхаць

На візітоўцы ў Аксаны надпіс: "Хочаце свежасці — я выкую вам вецер".

— Вецер — мая любімая стыхія. Жалеза павінна дыхаць, — тлумачыць майстар. — Я не магу растлумачыць гэтае адчуванне, але пакуль яно не з'явіцца, я неаднаразова мяняю форму вырабу.

У планах дзяўчыны — стварыць філасофска-казачны парк каваных скульптур.

— Фігуры павінны несці сэнс, прычым розны — у залежнасці ад ракурсу. Гэта ні ў якім разе не мадэрн, а дакладныя вобразы ў стылі Льюіса Кэрала, са сваёй міфалогіяй і легендамі.

Першая калекцыя пад назвай "Сконе", прасякнутая духам старажытнай Швецыі, ужо знаходзіцца сваё ўвасабленне. Другая будзе марской.

Таццяна **Мысава**



ПАВЕЛ ЧУЙКО

## Гутэнберг у гасцях у Скарыны

**Да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання музеі краіны рыхтаваліся не адзін год**

Намеснік дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Алесь Суша на прэс-канферэнцыі агучыў навіну: на міжнародную выставу, прысвечаную гісторыі кнігадрукавання, якая адкрыецца 15 верасня ў Музеі кнігі "алмазу ведаў", павінны прывезці фрагменты Біблії Гутэнберга. Той самай, ад якой Еўропа адлічвае ўзрост друкаванай кнігі.

Падзея адбудзецца ўпершыню ў Беларусі, і Алесь Суша асцярожны ў прагнозах яе верагоднасці. У Нацыянальным гістарычным музеі працуюць над дзеючай мадэллю друкаванага станка Францыска Скарыны, падобнага да таго, што ажыццявіў калекцыянер Уладзімір Ліхадзедаў. Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры цяпер не ў самай выйгрышнай сітуацыі: усё яшчэ не можа "выйсці з рамонту". Тым не менш парадуе наведвальнікаў рэтраспектыўнай перасоўнай выставай "Жыццё ў слове" і экспазіцыяй "Скарыніяна ў беларускай літаратуры і мастацтве". Полацк — радзіма Францыска Скарыны, месца, дзе пройдзе Дзень беларускага пісьменства. Там, у Музеі беларускага кнігадрукавання, ужо цяпер праводзяць традыцыйныя Скарынаўскія ўрокі. Ёсць і задума прадставіць старонкі жыцця асветніка ў лялечным спектаклі. 25 жніўня адкрыецца пленэр "Полацк у гравюрах сучасных мастакоў".

Крэатыўна падышлі да ўрачыстай даты ў Брэсце — узнавілі букіністычны магазін XIX стагоддзя. На думку Алеся Сушы, гісторыя беларускага кнігадрукавання дае найбагацейшыя магчымасці для культурных ініцыятыў рэгіёнаў.




# Фестываль пашырае творчыя межы

**У ліпені пройдзе традыцыйны “Славянскі базар у Віцебску”. Пра навацыі XXVI песеннага форуму расказаў яго дырэктар Аляксандр Сідарэнка.**



***— Ці праўда, што на некаторыя канцэрты фестывалю білеты ўжо прададзены?***

— Цэны ў нас дэмакратычныя, нават на канцэрты зорак першай велічыні. Можа, таму білеты на некаторыя канцэрты сапраўды ўжо прададзены.

***— Кожны год вы імкняцеся прывезці зорку сусветнай велічыні, каго атрымалася прывабіць гэтым разам?***

— Хуліа Іглесіяса-малодшага. Ён упершыню прыедзе ў Віцебск і будзе выступаць на галоўнай пляцоўцы. Разглядаецца ўдзел у фестывалі мюзікла “Казанова” Кіма Брэйтбурга. У пастаноўцы заняты маладыя беларускія акцёры і студэнты. Прыйшло шмат заявак на ўдзел у вулічным фестывалі, лялечны фэст арганічна ўпісаўся ў маштабнае музычнае свята. Да нас збіраюцца прыехаць тэатры са Швецыі, Італіі, Францыі...

***— Што новага ў песенным конкурсе?***

— Будзе павялічана колькасць нацыянальных адборачных тураў у розных краінах свету. Напрыклад, мэр Акапулька звярнуўся да нас з просьбай правесці ў яго горадзе

адборачны тур. На днях еду на адборачны тур у Рыгу.

***— Два словы пра геаграфію краін-удзельніц?***

— Інтарэс да фестывалю вялікі. Мы запускаем асаблівы італьянскі праект з канцэртам і выставай, будзем шырока прадстаўляць украінскіх артыстаў. Украіна транслявала адкрыццё мінулага “Славянскага базару ў Віцебску”, і гэта была самая рэйтынгавая перадача на ўкраінскім тэлебачанні. Сёлета да нас завітаюць акадэмічны хор імя Рыгора Вяроўкі, Ірына Білык, Алег Віннік. Раней абавязкова праводзіліся асобныя канцэрты майстроў з Беларусі, Расіі і Украіны, цяпер гэтая практыка вяртаецца.

***— У сваім выступленні на расійска-беларускім тэатральным семінары ў Маскве вы згадалі аб стварэнні ў рамках базару тэатральных пляцовак...***

— Так, будзе паказана 8 спектакляў. Трэці год запар паспяхова развіваецца міжнародная лялечная праграма, вулічнае мастацтва... На тэатральным семінары ўзнята важная тэма пашырэння тэатральнага супрацоўніцтва. На базары існуе праграма “Тэатральныя сустрэчы”, і патрэбна больш планамерная падтрымка ўсіх гэтых праектаў. У Віцебск з году ў год прыязджаюць вядучыя тэатры нашых краін, аднак апошнім часам мы пайшлі ў бок антрэпрызных спектакляў, так танней. Пры наяўнасці пэўнай падтрымкі Міністэрства культуры гэты праект можна развіваць.

***— На каго з маладых канкурсантаў вы параілі б звярнуць увагу?***

— Асабіста мне спадабаліся канкурсанты з Італіі і ЗША.

***— У чым, па-вашаму, галоўнае прызначэнне фестывалю?***

— Дэвіз фестывалю “Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення”, ён прызначаны аб’ядноўваць людзей. Я ўпэўнены, што сродкі культурнага супрацоўніцтва больш эфектыўныя за палітыку. Мы даўно перасягнулі межы славянскага свету. За гэтыя гады ў фестывалі прынялі ўдзел артысты больш як з 80 краін свету, сфарміраваўся своеасаблівы касцяк нашых партнёраў. Калі раней толькі Куба праводзіла адборачныя туры, то цяпер яны пройдуць адразу ў некалькіх краінах Лацінскай Амерыкі.

Таццяна **Харашылава**

# Мудрасць у асэнсаванні духоўнай спадчыны



**Выдавецкі дом “Звязда” падрыхтаваў да выпуску новую кнігу ў серыі “Светлыя знакі: паэты Кітая”**

Ужо трэці год пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі рэалізуецца шматпланавы творчы праект па прадстаўленні кітайскай паэзіі на беларускай мове. Новая кніга — восьмая па ліку — “Мудрасць гор маўклівых” — ужо здадзена ў друкарню.

Аўтар зборніка — сярэдневяковы кітайскі паэт Мэн Хаажань (689-740). Перакладчыкі яго вершаў на беларускую мову — Валерыя Радунь, Алесь Бадак, Дар’я Нечыпарук, Юлія Алейчанка. Аўтар прадмовы да “беларускай кнігі” класіка кітайскай паэзіі — Алесь Карлюкевіч.

У гэтым праекце, які аб’яднаў самых розных паэтаў і перакладчыкаў, старшы выкладчык кафедры кітайскай філалогіі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Дар’я Нечыпарук — чалавек зусім не выпадковы. Яна не толькі пераклала на беларускую мову вялікую падборку вершаў Мэн Хаажаня, але і выканала падрадковы пераклад твораў, мастацкі пераклад якіх ажыццявілі іншыя беларускія паэты. Ілюстрацыі да кнігі зрабіў мастак Каміль Камал. Ён афармляе ўжо трэцюю кнігу з серыі “Светлыя знакі: паэты Кітая”. Раней працаваў над графічным прачытаннем вершаў Лі Цінчжаа, Ван Гачжэня.

Выданне серыі, несумненна, будзе працягвацца. У Беларусі сёння праяўляецца небывалая цікавасць да кітайскай культуры, кітайскай цывілізацыі. І радуе, што на фоне гэтай цікавасці фарміруецца сапраўдная перакладчыцкая школа кітайскай паэзіі. У апошнія некалькі гадоў да пераўвасаблення на мову Купалы і Коласа вершаў Ду Фу, Лі Бо, Ван Вэя, Ай Ціна, Ван Гачжэня, Мэн Хаажаня, Лі Хэ спрычыніліся лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Мікола Мятліцкі, Алесь Бадак, Рагнед Малахоўскі, Таццяна Сівец, Навум Гальпяровіч, Леанід Дранько-Майсюк, Алена Раманоўская. Дарэчы, варта ўспомніць, што кітайскую паэзію і раней актыўна перакладалі ў Беларусі. Хіба што не было асобных кніг кітайскіх паэтаў на беларускай мове. Але вершы паэтаў з Паднябеснай актыўна публікаваліся ў перыядычным друку — у газетах і часопісах, розных зборніках саміх паэтаў Беларусі. Нават Маа Цзэдуна перакладалі. У 1920-1980-я гг. перакладчыкамі кітайскіх майстроў мастацкага слова выступілі Уладзімір Дубоўка, Рыгор Барадулін, Максім Танк, Вольга Іпатава, Сяргей Тузай, Мікола Аўрамчык, Валянціна Коўтун, Нэлі Тулупава, Ігар Бабкоў… Народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін прысвяціў кітайскай паэзіі вялікі раздзел сваёй кнігі перакладаў “Гуканне паэзіі Усходу”. У іншых раздзелах ён прадставіў карэйскі, в’етнамскі, японскі паэтычны свет.

Кітайскае мастацкае слова захоўвае ў сабе вялікі патэнцыял філасофскага асэнсавання светабудовы. Менавіта гэта, вядома ж, і прыцягвае да сябе беларускіх перакладчыкаў розных пакаленняў.

Кірыл **Ладуцька**



ПАВЕЛ ЧУЙКО

Белыя пінжакі з вышытымі васількамі — адзін з самых вядомых сцэнічных вобразаў ансамбля "Песняры"

# Клёш ад "Песняроў"

## У Мінску прайшла выстава ўнікальных касцюмаў знакамітага калектыву



Навуковы супрацоўнік Нацыянальнага гістарычнага музея Юлія Крыўдзюк

ПАВЕЛ ЧУЙКО

### Смелыя эксперыменты

Ах, гэтыя знакамітыя штаны-клёшы, кашулі з яркімі малюнкамі і народнымі арнаментамі! Легендарныя "Песняры" былі не толькі выканаўцамі ўсенародна любімых хітоў "Белавежская пушча", "Касіў Ясь канюшыну", "Валагда", але і сапраўднымі іконамі стылю.

На выставе можна ўбачыць больш за паўсотню эскізаў мастакоў Валянціны Бартлавай і Галіны Крываблоцкай, Юрыя Піскуна і Вольгі Дзёмкінай. Яшчэ нотныя рукапісы, фатаграфіі, афішы канцэртаў. І, вядома, любімы інструмент маэстра — двухгрыфовую мулявінскую гітару.

Уладзімір Мулявін сам выбіраў эскізы да сваіх сцэнічных вобразаў. І калі хоць адна дэталь не падабалася — адпраўляў на дапрацоўку.

— На асобных малюнках можна разгледзець подпіс Мулявіна і выведзенае яго рукой "Згодны", — расказвае навуковы супрацоўнік Нацыянальнага гістарычнага музея Юлія Крыўдзюк.

Галоўныя экспанаты — арыгінальныя касцюмы. Мулявін любіў апранацца па-шляхецку. Яго вобраз з раскошнымі доўгімі вусамі падкрэсліваў унікальны, пазнавальны стыль: на доўгую світку маэстра апранаў каптан, падпяразваў яго шырокім поясам, які нагадваў традыцыйны слуцкі. Галаўны ўбор — абавязкова футравы капялюш з пёрамі. А на нагі — старадаўнія боты з жоўта-карычневай скуры.

Не ўсім музыкантам такія ўборы прыходзіліся даспадобы — горача, абутак нязручны, з высокім для мужчын абцасам ці платформай. З нязвычкі адыграць цэлы канцэрт у гэтым было няпроста. Неяк адзін з музыкантаў не вытрымаў і адпілаваў высокія абцасы. Прысуд Мулявіна быў суровы: “Прывязвай, прыклейвай, рабі што хочаш, але на сцэну выйдзеш як належыць”. На наступны дзень абцасы былі на месцы.


ПАВЕЛ ЧУЙКО

У 1994 годзе для праграмы “Голас душы” стварылі спецыяльную серыю з яркімі малюнкамі і экзатычнымі жывёламі

## У райскіх садах

Прыкметны экспанат на выставе — адзін з самых любімых убораў Мулявіна, пашыты па матывах работ яркай беларускай мастачкі Алены Кіш. На “Славянскім базары ў Віцебску” ў 1994 годзе ансамбль да свайго 25-годдзя падрыхтаваў новую праграму “Голас душы”. Выступалі там яны разам з камерным хорам і харэаграфічным ансамблем “Харошкі”. Маляўнічыя касцюмы і былі прыдуманы спецыяльна для такога выпадку. На кашулі Мулявіна — кветкі, дрэвы, мудрагелістыя ўзоры. Ну прама як на карцінах Кіш — прадстаўніцы наіўнага мастацтва, якая больш за ўсё любіла маляваць райскія сады.

А праз два гады “Песняры” прадставілі праграму “Вольнасць. Казацкая вольніца”. Маштабны тур ад Брэста да Уладзівастока — і ўсюды музыканты выходзілі да публікі ў аксамітных касцюмах, расшытых узорамі з казацкімі матывамі.



Адзін з убораў мастака Юрыя Піскуна (злева) зроблены ў шляхецкім стылі: раскошнае шыццё, багатае аздабленне, футравая шапка. Да такога ўбору толькі слуцкага пояса не хапае. У такіх касцюмах (справа) ансамбль у сярэдзіне 1970-х здзейсніў турнэ па ЗША

Для кожнай канцэртнай праграмы эскізы ўбораў зацвярджаліся на самым высокім узроўні ў Міністэрстве культуры. Па касцюмах можна сачыць за эвалюцыяй у творчасці легендарнага калектыву. Свой яркі і непаўторны след “Песняры” пакінулі не толькі ў свеце музыкі, але і ў гісторыі сцэнічнага касцюма беларускай і савецкай эстрады.

## Хэлоу, Амерыка!

У 1976 годзе “Песняры” сталі першым савецкім ансамблем, які здзейсніў трыумфальныя гастролі па Злучаных Штатах.

Для такога выпадку музыкантам пашылі ксцюмы з супермоднай тады джынсавай тканіны. Даставалі яе па спецзаказе з-за мяжы. Ансамбль адправіўся ў турнэ па ЗША разам з лаўрэатамі прэміі “Грэмі” — фолк-групай The New Christy Minstrels. Апошнія выступалі ў суперпапулярнага савецкага ансамбля... на разагрэве. Пасля канцэртаў паклоннікі беглі за кулісы: дзякавалі музыкантам, прасілі аўтограф, гаварылі пра дружбу народаў. Нездарма “Песняроў” называлі “савецкімі бітламі”.

Пасля вяртання Мулявін з усмешкай гаварыў журналістам:

— Канцэрты не адрозніваліся ад тых, што мы даём дома, у маленькіх гарадах. Савецкі глядач больш уважлівы, амерыканскі — больш эмацыйны.

Крысціна **Хілько**

*Апошнія прэм’еры — два оперныя спектаклі “Чароўная флейта” Вольфганга Амадэя Моцарта і “Сельскі гонар” П’етра Масканьі занялі годнае месца ў рэпертуары Вялікага тэатра Беларусі*

# І радуюць, і натхняюць…


СЯРГЕЙ ЛУКАШОЎ

**Было б дзіўна, калі б так не адбылося. Бо ўжо даўно склалася ў тэатры: рух ад лепшага да лепшага. Вялікі — гэта калектыў прафесіяналаў, для якога выдаць якасны прадукт — не толькі справа гонару, але і стыль жыцця. Таму любое наведванне Вялікага тэатра і для мяне — ці гэта прэс-канферэнцыя напярэдадні генеральнага прагону, прэм’ерны спектакль, ці ўжо абкатаныя ў рэпертуары з новымі запрошанымі выканаўцамі опера альбо балет — усякі раз свята. А таксама жаданне пасля падзяліцца з чытачамі сваімі ўражаннямі.**

## Чароўная флейта як голас Вечнасці…

З устойлівым меркаваннем: “Чароўная флейта” добрая для ўсіх узростаў — пасправацца цяжка. Сапраўды, ёсць у гэтай оперы і займальны сюжэт, і казачнае чараўніцтва, і супрацьстаянне дабра і ліха, і барацьба сіл святла з сіламі цемры, і каханне — усё тое, што ляжыць на паверхні і, зразумела, можа захапіць увагу прыхільнікаў опернага мастацтва. Але ёсць у ёй і глыбінны філасофскі сэнс, звязаны з ідэямі масонства і з пошукамі ўсведамленнем чалавекам самога сябе. У оперы таксама прысутнічаюць элементы, якія датычацца гісторыі масонства і цырыманіялаў масонскай ложы. Гэта знайшло адлюстраванне ў сцэнаграфіі, дзе выкарыстоўваецца камп’ютарная графіка і розныя механізмы сцэны. І асабліва выразна ідэі масонства гучаць у фінале оперы, калі на сцэне з’яўляецца хор. І, як гаворыць Ніна Ламановіч, хормайстар-пастаноўшчык, хор паспяхова спраўляецца са складанымі выканальніцкімі задачамі. А вось што сказаў мастак-пастаноўшчык Хартмут Шэргхофер, які да яго творчага праяўлення ў Беларусі тройчы ўжо працаваў над сцэнаграфіяй для “Чароўнай флейты”. “Яна такая багатая, там столькі светаў, што і для сотні пастановак творчых магчымасцяў хопіць. Асабіста для мяне гэты твор Моцарта быў наркотыкам, які запрашаў у оперу”. Што яшчэ таксама цікава: быўшы падлеткам, ён быў заняты ў оперы — “спяваў трэцяга хлопчыка”. Дырыжор-пастаноўшчык Манфрэд Майрхофер і зусім лічыць, што опера дасканалая і ў ёй няма чаго-небудзь, што можна было б зрабіць лепш, настолькі яна цэласная.

“Я люблю “Чароўную флейту”, — прызнаўся ён на сустрэчы з журналістамі, — і за тое, што яна стылістычна шматгранная. Так, Папагена — персанаж, афарбаваны нацыянальным каларытам і просты, як сама народная песня, і партыя яго вытрымана ў гэтым жа ключы. Паміна і Царыца ночы — героі высокага опернага мастацтва, прадстаўнікі сур’ёзнай оперы. Тым не менш шматлікія арыі, ансамблі і хоры разам складаюць адзінае цэлае…”



Сцэна са спектакля "Чароўная флейта"

Моцарт умоўна падзяліў свой твор на некалькі частак: на непрасветлены свет, якім кіруе Царыца ночы — свет падсвядомасці, свет Зарастра — светлы, сонечны, Боскі, свет свядомасці, свет розуму. А паміж імі — "сярэдні свет": свет прыроды, натуральны і просты, дзе жыве птушкалоў Папагена, зямны чалавек, для якога важней за ўсё ежа, пітво ды простыя чалавечыя радасці.

Якія ж ідэі мае на мэце цяперашняя "Чароўная флейта", гэты яркі і маляўнічы спектакль, дзе па задумцы спадара Шэргхофера ёсць і непраходны лес з яго прыроднай стыхіяй, і вялізны дракон — сімвал жыццёвай энергіі, і сонца як сімвал свядомасці? Сонца пануе на сцэне ў фінале, калі спяваецца пра ўрачыстасць сіл святла, узнёслае каханне, дабро і прасветленую чалавечую свядомасць. Зразумела, што кожны з нас знойдзе той сэнс, які блізкі яго светапогляду, а нехта проста атрымае задавальненне ад выдатнага вакалу беларускіх артыстаў, успрымаючы оперу як прыгожую казку. Заўважу, вядучыя партыі ў "Чароўнай флейце" выконваюць як вядомыя майстры беларускай опернай сцэны, так і маладыя выканаўцы.

На сустрэчы з журналістамі рэжысёр-пастаноўшчык Ханс-Ёахім Фрай, які ў 2013-м годзе паставіў на беларускай сцэне "Лятучага галандца" Рыхарда Вагнера, акцэнтаваў увагу на тым, што пры стварэнні канцэпцыі вядомай оперы пастановачная група адштурхоўвалася ад сучаснасці: спектакль ставіцца ў 2017 годзе, таму павінен быць зразумелы гледачу. Казачны сюжэт оперы змешчаны ў надзвычай папулярны сёння свет фэнтэзі. У ім разамкнуты часавыя межы, і ўсё, што адбываецца ў "Чароўнай флейце", магло здарыцца ў любую эпоху.

Ну і стыль папулярных кінасаг і тэлесерыялаў, такіх як "Уладар кольцаў", "Гульня прастолаў", які праглядаецца і ў касцюмах, і ў сцэнаграфіі, — своеасаблівы рэверанс у адрас маладых гледачоў, не пазбаўлены добрага густу. І як тут не ўспомніць Гётэ, які, захапляючыся глыбокай філасофіяй "Чароўнай флейты", гаварыў: "Толькі б асноўнай масе гледачоў прынесла задавальненне відавочнае, а ад пасвячоных не ўкрыецца вышэйшы сэнс".

"Чароўная флейта" ў Вялікім тэатры — сумесная работа канцэртнай залы

“Брукнерхаус” у Лінцы і Вялікага тэатра Беларусі, опера-казка, напоўненая чараўніцтвам і фантазіяй. У ёй праслаўляецца перамога святла над цемрай, дабра над злом, кахання над каварствам, сяброўства над варожасцю. Але хто жадае, той, паўтаруся, можа адкрыць для сябе і патаемны сэнс твора вялікага кампазітара.

Асабіста для мяне “Чароўная флейта” ў Вялікім тэатры, гэты шэдэўр Моцарта — опера пра таінства нараджэння новага чалавека. Што апрыёры не можа адбывацца без яго адмовы ад старых ілюзій і звычак. Тамуён і “памірае”, каб адрадзіцца для новага жыцця. Для таго, каб здабыць адзінства душы і розуму, цэласнасць, чалавек выбірае шлях ачышчэння, па якім яго вядзе каханне. Каханне і дапамагае яму здабыць гармонію і цэласнасць.

Яшчэ “Чароўная флейта” — твор пра перамогу свядомага над несвядомым, узвышанага над нізкім. І пра пошук чалавекам шляху, які вядзе да спазнання самога сябе ў лепшай праяве. А вобраз Чароўнай флейты — гэта нібы заклік самой Вечнасці пачуць сваё вышэйшае “Я”. Вялікай была мая радасць, калі рыхтуючы публікацыю, натрапіла на сугучныя маім меркаванням уражанні пра “Чароўную флейту” ў часопісе “Чалавек без межаў” (http://www.manwb.ru/), якімі і падзялюся з чытачом.

Пры беглым знаёмстве з сюжэтам узнікае жаданне падзяліць усіх герояў оперы на пары “станоўчы — адмоўны”. Напрыклад, супрацьпаставіць высакароднага і адважнага Таміна пустаслову і хлусу Папагена. Ці ўбачыць на чале варожых адзін аднаму сіл мудраца Зарастра і каварную Царыцу Ночы. Ці параўнаць сюжэтныя лініі, якія апавядаюць пра Трох Дам — прыслужніц Царыцы, падобных да злых фей з казак, і пра Трох Геніяў анёльскага выгляду, пасланцаў Храма. Але такі чорна-белы погляд заводзіць у тупік, калі патрабуецца растлумачыць некаторыя парадоксы сюжэта.

Да прыкладу, Царыца Ночы пляце змовы супраць сіл Святла, але пры гэтым яна ж аказваецца маці Паміны — прыгожай, чыстай, добрай дзяўчыны, каханай прынца Таміна. Чароўная флейта — цудоўны інструмент, які вядзе і ахоўвае Таміна ў яго выпрабаваннях, таксама, аказваецца, яе дар. Ды і адну з самых выдатных арый (арыя Царыцы Ночы) Моцарт не выпадкова ўкладвае ў вусны гэтай нібыта злой чараўніцы. Тры Дамы паводзяць сябе як гаспадыня: ратуюць галоўнага героя ад Дракона, які яго пераследуе, “лечаць” Папагена ад хлусні, дапамагаюць Тром Геніям наладзіць лёс прынца. Вярхоўны жрэц Зарастра, увасабленне вобраза ідэальнага ўладара, тым не менш, здзяйсняе жорсткую расправу над маўрам Манастатасам, не заўважаючы яго спроб апраўдаць сябе.

Здзіўляе і тое, што вартаўнікі Храма сілай, супраць яго волі, прымушаюць Папагена праходзіць выпрабаванні разам з Таміна, хоць першы і запэўнівае іх у поўнай абыякавасці да высокіх мэт ды імкненняў, уласцівых прынцу. Такіх супярэчнасцяў можна адшукаць безліч.

Але ўсе яны знікаюць, толькі варта паглядзець на дзеючых асоб “Чароўнай флейты” не як на прывычных персанажаў опернага спектакля, а як на сімвалічныя ўвасабленні розных граняў чалавечага характару, розных якасцяў чалавечай душы. Тады мы ўбачым не казачную гісторыю, што разыгрываецца на тэатральных падмостках, а персанажаў нашага ўнутранага свету, якія з дня ў дзень іграюць п’есу нашага ўнутранага жыцця. Іх галасы, якія часта заглушаюць адзін аднаго, часам гучаць як стогны і крыкі нашых прыхамацяў, капрызаў, жаданняў, а часам як пранізлівы голас доўгу, розуму, сумлення.

А ці так гэта, можна пераканацца, паслухаўшы “Чароўную флейту” яшчэ раз.

Вядучыя партыі ў спектаклі выконваюць Юрый Гарадзецкі, Віктар Мендзялеў, Аляксандр Міхнюк (Таміна), Таццяна Гаўрылава, Ірына Кучынская, Дзіяна Трыфанава (Паміна), Маргарыта Ляўчук, Алена Сіняўская, Алена Шведава (Царыца ночы), Андрэй Валенцій, Дзмітрый Капілаў, Аляксандр Кеда, Дзмітрый Трафімук (Зарастра), Андрэй Кліпо, Сяргей Лазарэвіч, Дзяніс Янцэвіч (Папагена).



СЯРГЕЙ ЛУКАШОЎ

У цэнтры — Маргарыта Леўчык (Царыца ночы) і Ірына Кучынская (Паміна)



ПАВЕЛ БАС

У ролі Сантуцы — Ніна Шарубіна (“Сельскі гонар”)

## Гісторыя кахання, здрадніцтва і ахвяры

Опера “Сельскі гонар”, на думку знаўцаў, даўно ўжо ўвайшла ў залаты оперны рэпертуар. Больш за сто гадоў яна з поспехам ідзе ва ўсіх тэатрах свету, што і не дзіўна, бо страсці чалавечыя, такія як каханне, здрада і вернасць — не старэюць.

А вось як пра гэты шэдэўр опернага мастацтва выказваюцца прадстаўнікі таленавітай пастановачнай групы (http://bolshoibelarus.by/):

**Міхаіл Панджавідзэ, рэжысёр-пастаноўшчык:**

*“Сельскі гонар” — выдатны ўзор верызму як у літаратурнай першакрыніцы, так і ў музычным яе ўвасабленні: цудоўная музыка, якая на працягу многіх гадоў традыцыйна выклікае захапленне і трапятанне ў гледачоў.*

*Наш спектакль — гэта разважанне пра ўладу натоўпу і грамадскай думкі, якая рэдка ўлічвае ісціну, якая сфарміравана не столькі нават на патрэбу грамадству і імкнецца зацвердзіць выгаду большасці, а на патрэбу пэўнай групе людзей. Падзеі, што адбываюцца на Сіцыліі ў XIX стагоддзі, мы пераносім у 20-я гады XX стагоддзя. Гэта гісторыя, якая расказвае пра ўзаемаадносіны чалавека і грамадства, пра тое, як уся векавая мяшчанская мудрасць у пэўныя перыяды гісторыі пачынае здабывацца і ператварацца ў нейкія дэвізы.*

*Мне падаецца, што гэта найглыбейшы сюжэт, велікодная гісторыя пра каханне, здрадніцтва і ахвяру, у цэнтры якой чалавек. Ён пратэстуе, бачачы хлусню і двайную мараль людзей, якія спачатку моляцца, а потым грашаць. Але каб змагацца з двайнымі стандартамі, трэба самому іх не дапускаць. Аднак галоўны герой Турыду, як і ўсе астатнія персанажы, паводзіць сябе небездакорна: абыходзіцца непрыгожа, не па-мужчынску і з Сантуцы, якая, імкнучыся ўтрымаць каханага, таксама дзейнічае подла і здраджвае яму.*

*Сама італьянская назва Cavalleria Rusticana даслоўна перакладаецца як “Вясковае рыцарства” — гэта аксюмаран, яна ўжо нясе ў сабе парадокс, канфлікт, намякаючы на адносіны аўтара да грамадскай думкі, двайную мараль і стандарты гэтага грамадства.*

**Аляксандр Касцючэнка, мастак-пастаноўшчык:**

*Спрычыняючыся да знакамітых оперных партытур і працуючы на тыя задачы, якія ставяцца рэжысёрам, сцэнограф мае цікавую магчымасць праявіць сябе ў пошуку мастацкіх прыёмаў, выразных сродкаў і стылістычных адценняў, каб пагрузіць гледача ў гісторыю, што прапануецца на сцэне.*

*Больш за сто гадоў назад П'етра Масканьі, кампазітар-верыст, стварыў вострадраматычны твор, які ўразіў яго сучаснікаў. Сёння аўтары тэатральных пастановак ва ўсім свеце таксама імкнуцца знайсці цікавыя, запамінальныя, часта кінематаграфічныя прыёмы, якія б уздзейнічалі на ўспрыманне гледачоў. Асноўная наша задача — зрабіць спектакль вострым, відовішчным, дастукацца да сэрцаў сучасных гледачоў.*

*Падзеі оперы “Сельскі гонар” разгортваюцца на Сіцыліі, падчас святкавання Вялікадня. У спектаклі будзе шмат святла: магчымасці нашай сцэны дазваляюць перадаць прыгажосць і чысціню святочнай раніцы. І адначасова з дапамогай сродкаў сцэнаграфіі мы пастараемся падкрэсліць усю ступень трагізму ўзаемаадносін герояў і падзей, што адбываюцца па сюжэце.*

*Мастакі-сцэнографы, якія ажыццяўляюць пастаноўкі спектакляў на грандыёзнай прасторы опернай сцэны, маюць выдатную магчымасць з дапамогай сінтэзу музычнага і візуальнага складнікаў увасобіць на сцэне цікавыя мастацкія рашэнні, тым самым спрыяючы глыбокаму ўспрыманню гледачамі музычнага твора.*

Міхаліна **Чаркашына**

# Анатоль Кузняцоў: Не хачу быць модным, хачу быць самім сабой

**Больш за шэсцьдзясят жывапісных твораў, створаных на працягу апошніх двух дзесяцігоддзяў, было прадстаўлена ў юбілейным выставачным праекце “Аб зямлі і небе” вядомага беларускага мастака і таленавітага педагога Анатоля Кузняцова. На ўрачыстым адкрыцці выставы ў Нацыянальным мастацкім музеі прайшла і прэзентацыя аднайменнага альбома жывапісу, падрыхтаванага да 70-годдзя з дня нараджэння мастака і 40-годдзя яго творчай дзейнасці.**



*Анатоль Кузняцоў. Мастак. Нарадзіўся ў 1947 годзе ва Усць-Камчацку (Расія). Вучыўся ў народнай ізастудыі Бранска ў вядомага педагога В. Вараб’ёва, скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. З 1986 г. — удзельнік творчага аб’яднання “Няміга-17”. З 1994 г. займаецца беспрадметным (абстрактным) жывапісам. Асноўныя серыі работ: “Каларыстычныя прасторы”, “Белая сюіта”, “Вібрацыі святла”, “Вяртанне ў Егіпет”, “Метафара забытых ісцін”, “Шлях”.*

"Працы Анатоля Кузняцова сцвярджаюць невытлумачальнасць і неартыкуляванасць як асноўны прынцып жывапісу. Толькі крэатару адкрываецца ўтоеная гармонія ўсіх рэчаў, толькі ён здольны распазнаць, улавіць і даць магчымасць наблізіцца да нерэальнай матэрыі ўсяго існага", — так глыбакадумна і недзе вельмі спецыфічна тлумачыць сутнасць творчасці мастака мінскі мастацтвазнаўца Вольга Рыбчынская. А вось сам Анатоль Кузняцоў тлумачыць усё некалькі інакш. Мастак лічыць, што проста ўвасабляе на палатне ўражанні, асацыяцыі, настроі. Усё гэта ўзнікае ў яго ў працэсе сузірання навакольнага свету. І гэты знешні свет, асвоены ў яго душы, нараджаецца на свет зноў у выглядзе твора мастацтва.

Зрэшты, Анатоль Кузняцоў не проста адлюстроўвае ўражанні, атрыманыя ад знешняга быцця — ён творыць свой новы свет, нябачаны дагэтуль.

Яго творчасць абсалютна інтуітыўная. "Калі падыходжу да чыстага палатна, яшчэ не ведаю, што на ім будзе. Вобразы нараджаюцца ў працэсе імправізацыі", — гаворыць ён сам. У карцінах Анатоля Кузняцова толькі зрэдку праглядаецца намёк на якія-небудзь прадметы. Контуры формаў растушаваныя, раствораныя ў прасторы. Мастак вызваліўся ад прадметных уяўленняў, яго погляд засяроджаны на душэўных перажываннях, думках і пачуццях.

Каб зразумець душу мастака, мы сустрэліся з ім у майстэрні. Там — яго самае блізкае асяроддзе: карціны.

***— Я так разумею, што ўсё ваша свядомае жыццё звязана з мастацтвам жывапісу. Як прыйшлі да гэтага?***

— Падчас службы ў арміі рабіў выбар, куды паступаць: у Піцер, у Маскву... Але выбар зрабіў на карысць Мінска. Палічыў, што ён менш кансерватыўны. Гэта ні на чым не засноўвалася, але тым не менш. Прыехаў, паступіў, стаў вучыцца. І інтуітыўныя мае ўяўленні пра свабоду ў творчасці неўзабаве пацвердзіліся. Тут падчас вучобы давалі магчымасць самавыяўляцца. Хоць педагогі ў асноўным былі з маскоўскай і піцерскай школай. Але агульная атмасфера была іншая.



***— Што адрознівала беларускую мастацкую школу ў тыя часы?***

— Па тым часе у нас проста былі добрыя педагогі: з добрай вывучкай, па прыродзе — жывапісцы. Эмацыйныя, яны не толькі свае якасці ў педагогіцы праяўлялі, але і давалі магчымасць студэнтам праявіць сябе. Яны гэта рабілі ад душы. Вучоба, між іншым, праходзіла ў строгіх акадэмічных рамках. І разам з тым я мог смела імправізаваць. Гэта была ўдача.

***— Што заахвочвала вас імкнуцца да творчай свабоды?***

— Я люблю колер. І цяпер, уласна, люблю. Для мяне непасрэднае пачуццё — хваляванне перад колерам. Часам гэта было на шкоду малюнку, што тая ж піцерская школа катэгарычна адмаўляла. Малюнак вышэйшы за ўсё! Але заўсёды было, што калі ты каларыст ад прыроды, то абавязкова будзеш не такі якасны ў малюнку. Гэта ісціна вядомая. Калі ты пішаш шырокім пэндзлем, шырокім мазком, абавязкова саб'еш малюнак. Хоць не скажу, што я дрэнна маляваў — як усе. Заўсёды добрыя адзнакі былі. Я ж правяраў сябе на ўзроўні піцерскай школы. Мой педагог Пётр Крохалеў адпускаў мяне ў Піцер, і я на тыдзень знікаў: пісаў у горадзе на Няве.

***— Але чаму педагогі павінны былі вас разумець? Бо той жа Пётр Крохалеў, вядомы беларускі мастак, маляваў па-іншаму.***



"Пратуберанцы VIII" (2016)



"Пратуберанцы V" (2016)



— Не, Крохалеў таксама быў каляровік. Ён разумеў колер, ён быў такі мазісты…

***— Магчыма, што Крохалеў ды іншыя былі каларыстамі, але яны былі і рэалістамі.***

— Я таксама тады рэалістам быў. Калі персік аксамітны, то ён у мяне аксамітны, а калі перац, то каравы — я гэта ўсё рабіў.

***— Сёння многія, хто цікавіцца жывапісам, вяртаюцца да больш ранніх работ беларускіх мастакоў. Яны бачаць у тым часе, у 60-х гадах, напрыклад, больш прафесійную школу. Бачаць узровень майстэрства, на які раяць арыентавацца і маладым мастакам. Як вы можаце параўнаць сённяшні дзень у жывапісе, у выяўленчым мастацтве ў цэлым з тым часам, калі вы вучыліся? Наколькі моцная эвалюцыя адбылася?***

— Тут нельга параўноўваць. Па той прычыне, што быў іншы час.

***— Вы сёння працуеце ў сферы беспрадметнага жывапісу. Для сябе яго напэўна ўяўляеце больш зразумелым, больш сэнсавым. Як самі маглі б растлумачыць сутнасць гэтага жывапісу?***

— Я даўно рыхтаваўся да гэтага. Працуючы ў фігуратыўным напрамку, я ўсё роўна вызваляўся ад фігуратыўнасці — ад дыктату фігуратыўнасці, так дакладней. Я імкнуўся фігуратыўнасць прыбраць у структуру жывапіснага стану. Натуральна, рана ці позна, я прыйшоў бы да абстракцыі. Дакладней, нават не да абстракцыі, а да непрадметнага жывапісу. Што гэта значыць для мяне? Гэта значыць, што я пазбавіўся ад дыктату навязвання тэмы. Я навучыўся думаць падсвядома. Развіў пачуццё падсвядомасці, адчування вібрацый, сувязяў праз мноства ўсякіх прычын. Праз гук, праз смакавыя адчуванні. У мяне вуха таксама бачыць. Я не адмаўляюся ад колеру, я, наадварот, яго ўключаю. Цяпер для мяне колер прыйшоў у свабоднае плаванне, ён у мяне размаўляе: і пра смутак, і пра радасць, пра пачуцці і пра нюансы пачуццяў.

***— Калі пішаце работу, уяўляеце яе будучага гледача? Хацелі б, каб яму было зразумела тое, што вы спрабуеце выказаць? Ці ж вы ідзяце шляхам суб'ектыўным: што вам зразумелае, то вы і пішаце?***

— Скажу сумленна, я імкнуся чуць сябе. Чаму? Калі я адгукаюся, значыць я перадаю свае эмоцыі. І нейкаму чалавеку гэта абавязкова будзе блізкае. Усім — немагчыма. Але аднаму, двум, дзесяці гэта будзе блізкае. У мяне з'явілася шмат знаёмых, якія жадаюць размаўляць на гэтыя тэмы. І вось калі адбываюцца зносіны, я раскрываю, якім шляхам хачу дайсці да гледача. Вось такім чынам ён і набываецца — свой глядач. Гэта адбываецца на персанальных выставах: калі ты працуеш з выставай, знаходзішся там пастаянна, прызначаеш сустрэчы, "круглыя сталы"… Я гэта раблю практычна заўсёды. І такім чынам, тым людзям, якія жадаюць мяне зразумець, становіцца ўсё зразумела. Тыя ж людзі, якія не хочуць зразумець, яны проста не прыходзяць.

***— Вам, як прадстаўніку "свайго" жывапісу, сёння, напэўна, складаней, чым іншым мастакам, якія працуюць, скажам, у фігуратыўным жывапісе?***

— Вядома, у кожнага мастака ёсць свой глядач. Людзі, якія лічаць за лепшае бачыць рэалістычныя рэчы, яны іх глядзяць. Людзі, якія хочуць бачыць актуальнае мастацтва, яны бачаць яго ў вялікай колькасці. Але… На жаль, сёння сапраўднага непрадметнага жывапісу практычна няма. Калі нейкая выпустошанасць: адсутнічае рытм, няма работы колеру. Дарэчы, у Еўропе такія праблемы ўжо даўно адбываюцца. Мастаку патрэбныя вялікія веды, якія ён павінен акумуляваць у сабе. Ён павінен вызначыцца з прыярытэтамі свайго ўнутранага стану. Я свае прыярытэты выдатна ведаю. Гэта — колер, колер і колер! Так, ён складваецца ў рытмы, яны завязваюцца ў сістэмы, у цэлыя напрамкі. Але гэта ўжо іншае пытанне. Гэта пытанне развіцця. Каб не застаяцца на месцы, трэба ўвесь час працаваць. У мяне перыяды мяняюцца, трансфармуюцца, але я імкнуся гэта рабіць арганічна, не кідаюся з боку ў бок.

***— Калі параўноўваць беларускую жывапісную школу і выяўленчае мастацтва сучаснай Еўропы, то відавочна, што менавіта там у большай ступені мастакі пайшлі шляхам беспрадметнага жывапісу…***

— Пра што я і гавару. Здавалася б, чалавек жадае быць свабодным, гэта зразумела. Але свабода дорага даецца. Свабоду трэба зацугляць. Гэта для сябе трэба. У нас у Беларусі шмат добрых таленавітых мастакоў. Некаторыя з іх ужо доўгі час жывуць у Францыі, у Галандыі, у Бельгіі. Пра іх ведаюць, яны выдатна працуюць у розных напрамках. Таму што ўзровень граматы прысутнічае. Гэта традыцыя. Школа ў нас была класная. Уменне стварыць твор па законах акадэміч-

нага мастацтва зусім ашаламляльнае. І людзі па-ранейшаму адкрываюць у гэтым сябе. Гэта — нашы, беларускія мастакі.

***— Вы гаворыце пра школу, у якой нават звычайныя вучні змаглі стаць прафесіяналамі? Або гаворка ідзе толькі пра яркіх асоб? Наколькі школа і асоба мастака ўзаемазвязаны ў беларускім жывапісе?***

— Вядома, гэта характэрна для ўсяго нашага выяўленчага мастацтва. Але асоб няшмат. Асоба для мяне Зоя Літвінава — яна ўжо сталы мастак. Яна не проста піша, яна піша пра стан душы. Гэта многага варта. Сутнасць у тым, пра што яна размаўляе. Не кожны сёння гэта робіць, далёка не кожны. Многім не стае глыбінь унутраных адчуванняў.

***— Многія калекцыянеры цікавяцца жывапісам больш ранняга перыяду ў творчасці беларускіх мастакоў. Таго часу, калі практычна не было авангарднага беспрадметнага жывапісу. Чаму такая цікавасць?***

— Ды ўсё проста. Таго перыяду больш ніколі не будзе. Вось і ўвесь адказ. Англійскі музей даўно зрабілі музеем таталітарнага мастацтва. Класныя работы там сабраныя. У нас пакуль няма такога музея. А гэта ж было. Чаму па гэты дзень калекцыянуюць 18-е стагоддзе, галандцаў… Проста такога больш не можа быць.

***— Гэта гаворыць аб тым, што ўсяму — свой час. Што абавязкова будуць калекцыянаваць і сённяшніх мастакоў.***

— І калекцыянуюць. Сёння вельмі складаны час у арыенцірах мастацтва. Што добра, што дрэнна — цяжка разабрацца звычайнаму чалавеку. Патрэбна падрыхтоўка, патрэбна граматнасць у разуменні тэндэнцый. Калі няма падрыхтоўкі, многія на інтуіцыі гэта робяць.

***— Калі вы вучыліся ў мастацкім інстытуце, у вас жа не было яркага праяўлення таго стылю, які сёння ўласцівы мастаку Анатолю Кузняцову?***

— Вядома, стыль робіць час. І праца.

***— Вашы педагогі разумелі вас?***

— Так.

***— А былі тыя, хто не разумеў?***

— Я не быў дысідэнтам. Нармальна працаваў, вучыўся, імкнуўся. Не лічу сябе чыстым авангардыстам: для мяне гэта не трэба. З ног на галаву не станулюся, толькі адчуваю, што ў гэтым магу раскрыцца, сказаць нешта сваё.

***— Як вы ставіцеся да правядзення выстаў? Для вас гэта падзея? Ці вы да гэтага абыякавыя?***

— Не, не абыякавы. Раней я рабіў шмат выстаў. Імкнуўся гэта рабіць. Потым выставачныя залы апусцелі. Цяпер іх зноў, можна сказаць, прывялі ў парадак. Лічу, што мастаку выстава патрэбна. Яна неабходная, каб праверыць сябе: які ты, як ты выглядаеш збоку. Карціна адным жыццём жыве з табой у майстэрні. А там, на выставе, яна жыве іншым жыццём. І ты павінен разабрацца, што трэба рабіць далей, як ісці наперад, каб усё было больш пераканаўчым, больш актыўным.

***— Мастак прадастаўлены ў майстэрні шмат гадзін самому сабе. Якія думкі прыходзяць звычайна вам у працэсе творчасці?***

— Думак шмат. Кінуць бы ўсё *(гаворыць з усмешкай)*... Таму што заўсёды работа даецца цяжка. Заўсёды трэба перамагаць. Кожнае палатно — як быццам усё зноў пачынаецца. Карціна павінна адбыцца. Для гэтага трэба прыкласці шмат намаганняў: і фізічных, і маральных. Нярэдка бываюць цяжкія перыяды: не ўдаецца колер, не складваецца вобраз. Вось і думаеш, а можа, кінуць усё? Але заўтра прыходзіш у майстэрню і зноў працуеш.

***— Што значаць у вашых карцінах назвы?***

— У мяне неяк цыкламі ўсё. “Белая сюіта” — цыкл, які праходзіць па ўсім жыцці. Пачынаўся яшчэ з фігуратыў-



“Пратуберанцы XIII” (2016)



“Пратуберанцы IV” (2016)





ных работ. Потым пайшлі “Каларыстычныя прасторы”, “Вібрацыі святла”. Цалкам нечаканы цыкл “Даліна фараонаў” — ніколі не думаў, што я ў сувязі з Егіптам магу зрабіць нешта.

***— Тады што значаць назвы гэтых цыклаў?***

— “Белая сюіта” — гэта белыя палотны і іх нюанснасць. Калі ты пішаш праз белае — гэта тонкія адносіны душы. Тыя эмоцыі, якія словамі растлумачыць немагчыма. Чаму цыкл у мяне ідзе на працягу ўсяго жыцця? Таму што ёсць перыяды, калі ты гатовы ўзяцца за пэўную тэму. А потым гэтага ўжо не напішаш. Праходзіць нейкі час, і ты зноў вяртаешся да таго ж цыкла. Таму што ты зноў гатовы. Кожны, напэўна, назіраў за сабою: сёння адзін настрой, заўтра кардынальна іншы. Вось так і тут адбываецца.

***— Калі чалавек працуе ў рэалістычнай манеры, то ён сюжэтам адлюстроўвае нейкую падзею. Там усё больш-менш зразумела. Вы ж усяго толькі колерам або яшчэ нейкімі элементамі хочаце адлюстраваць разнастайнасць рэальнасці. Ці не мала сродкаў?***

— У мяне прысутнічае пластычны сюжэт, дзе адбываецца рух рытмаў. Яны могуць напружвацца па паверхні, расслабляюцца, пераходзяць з аднаго стану ў іншы. Гэта цэлая рэжысура. У паверхні ж ёсць паняцце прасторы. Вось і працуеш з ёю: што гэта такое, як яна фарміруецца? Гэта не проста кропкі, не проста плямы. Яны рухаюцца, размаўляюць. Яны дапамагаюць чалавеку — на інтуітыўным узроўні кантакт адбываецца. Прастора бывае і глыбінная, філасофская. Некалькі прастор ствараюць адну агульную — як тэму. Я пісаў цыкл карцін, звязаных з філасофіяй кітайскага філосафа 3 стагоддзя да н.э. Ла Цзы. У яго ёсць работа “Шлях і дасканаласць”. Гэта размова пра дасканаласць чалавечай душы. Мне зразумелыя гэтыя тэксты, зразумела, як ісці да сябе, я пра гэта таксама думаю. Мой цыкл называецца “Метафара забытых ісцін”.

***— А калі ў вас было б дастаткова часу, што хацелі б зрабіць перш за ўсё?***

— Я шмат пішу эмацыйных рэчаў. Часта бываю на азёрах, прыроду адчуваю. Для мяне гэта так блізка стала. Я ніколі не думаў, што патраплю ў кропку, прыехаўшы ў Беларусь (Анатоль Кузняцоў нарадзіўся і правёў дзіцячыя гады ў Расіі — Заўв. аўт.) Гэта мае месца. Да прыкладу, як я напісаў карціну “Памяці Курасавы”. Я тут гэта ўбачыў. Сядзеў на возеры ў сакавіку. Быў відаць стары трыснёг, ішоў снег вялікімі камякамі. Ён не падаў, а вісеў. І я адчуванні чамусьці з Курасавам звязаў. Хоць Курасава — неарэаліст, але ён працаваў на кантрасце. Беларусь — мае месца, дзе я вельмі эмацыйна ўспрымаю вібрацыю, звязаную не толькі з колерам, але і са слыхам, і з нюхам.

***— У іншым месцы вы такой падпіткі не атрымалі б?***

— Тут каларыстыка асаблівая. Я выхаваўся гэтай каларыстыкай.

***— Я мяркую, што большасць вашых прац зыходзіць ад уяўнага, знутры. Толькі нейкая частка — знешняя крыніца, якая заахвочвае вас адлюстраваць нешта ў працы. У вас, як у мастака беспрадметнага жывапісу, што першаснае?***

— Калі нервовыя заканчэнні звязаны, яны ў адным вузле знаходзяцца. І адназначна сказаць, чаму адбылося так, а няйначай, немагчыма. Нешта праз органы зроку прыйшло, нешта цяжка растлумачыць: адкуль гэта ўзялося? Напэўна таму, што я жыву, хвалююся. За дзень адбываецца вельмі шмат перажыванняў. Яны і з’яўляюцца нейкай матэрыялізаванай часткай для пасылу. Я сябе так выхаваў, мне гэта блізкае. Хоць я свабодна магу маляваць дрэвы, дамы, адбітак у вадзе. Я малюю з натуры, але імкнуся бачыць тое, чаго не бачаць іншыя. Я павінен убачыць тое, што звычайны чалавек наогул не бачыць.

***— Вы мастак-аптыміст?***

— Не думаю, што аптыміст, хоць і пазітыўны па натуры.

***— Вы сябе папраўляеце ў работах?***

— Безумоўна, абавязкова. Бо адразу не атрымліваецца. А я вельмі капрызны да колеру. Калі я не склаў двое адносін, я ніколі не пакіну палатно, мне трэба абавязкова іх скласці, каб яны пачалі працаваць. Пачынаеш спантанна, ідзе цяжкі працэс, калі ты павінен уключыць свядомасць. Без пэндзля сядзіш гадзіну і думаеш, глядзіш. Вельмі карысная праца. Бо мастак — гэта не прафесія, гэта стан. Ты павінен да сябе ісці. Не трэба імкнуцца быць навідавоку. Гэта памылка. Я не хачу быць модным, я хачу быць самім сабой. Моладзі тое ж самае гавару: ідзіце шляхам, куды сэрца кліча. Мне яшчэ мой першы педагог Віктар Васільевіч Вараб’ёў, калі я вучыўся ў бранскай народнай ізастудыі, сказаў: “Жывапіс — гэта такая жанчына, якая ніколі не прабачае здрад”. Неяк у мяне быў крызіс. Я нават стаў акадэмічна дрэнна працаваць. Тры гады мучыўся. Усё знішчыў, што было зроблена. Вымушаны быў прыехаць да настаўніка: “Віктар Васільевіч, што рабіць, не ведаю. Я прапаў”. Ён сказаў простыя словы: “Залезь на гарышча і пакапайся, з чаго пачынаў”. Гэта быў 1979 год. Я прыехаў у Мінск і пачаў працаваць. Я адчуў, куды мне ісці, па якім шляху…

Веніямін **Міхееў**



Анатоль Кузняцоў. “Пратуберанцы XII”, 2016